А. М. Змушко

# Літаратурнае чытанне

# 9





Зямля Беларусі! Бары і дубровы,
жытнёвае поле, шаўковы мурог,
у промнях рабіны заход вечаровы,
што клёкат буслоў – ручаёў перамовы
і ў шумных прысадах істужкі дарог.
Зямля Беларусі! Вачамі азёраў
глядзіш ты ў празрыстыя высі нябёс,
начамі, што яблыкі, падаюць зоры,
знікаюць па водах, па чорных разорах,
па травах, абсыпаных кроплямі рос.
...Зямля Беларусі! Табой мы сагрэты,
ніколі не сходзіш ты з нашых вачэй.
О, як ты прыгожа над Нёманам, лета!
Чаборам, рамонкам, мядункавым цветам
і водарам ясных купальскіх начэй.

*(Пятрусь Броўка)*

А. М. Змушко

# ЛІТАРАТУРНАЕ ЧЫТАННЕ

**Вучэбны дапаможнік для 9 класа
першага аддзялення дапаможнай школы
з рускай мовай навучання**

*Дапушчана Міністэрствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь*

Мінск
Выдавецкі цэнтр БДУ
2018

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

УДК 811.161.3(075)
ББК 81.411.3я7
З-69

Рэцэнзенты:
кафедра гісторыі журналістыкі і менеджменту сродкаў масавай інфармацыі
Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(дацэнт кафедры, кандыдат філалагічных навук, дацэнт *І. Д. Воюш*);
настаўнік беларускай мовы вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
дзяржаўнай установы адукацыі
«Дапаможная школа-інтэрнат № 5 г. Гомеля» *Л. І. Данільчанка*

## Умоўныя абазначэнні

?! — пытанні і заданні

 — вучыцеся весці размову

 — пераклад і тлумачэнне слоў

* — заданні павышанай складанасці

‖ — гэта трэба ведаць

**Змушко, А. М.**
З-69 Літаратурнае чытанне : вучэб. дапам. для 9-га кл. 1-га аддз-ня дапам. шк. з рус. мовай навучання / А. М. Змушко. — Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2018. — 139 с. : іл.
ISBN 978-985-553-522-6.

**УДК 811.161.3(075)**
**ББК 81.411.3я7**

*Папярэдняе выданне выйшла ў выдавецтве «Народная асвета» ў 2006 годзе.*

**ISBN 978-985-553-522-6**

© Змушко А. М., 2006
© Змушко А. М., 2018, са змяненнямі
© Афармленне. РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ», 2018

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# МАЯ РОДНАЯ БЕЛАРУСЬ



## Ля карты Радзімы

Азёры, рэкі і лясы,
і гарады,
і вёскі —
усё змясцілася на ёй,
на карце той,
                    шматвёрстцы.
Прасторы з кветак і вясны,
і з сонца,
і з блакіту.
Сады паўсюль.
Як акіян,
тут каласуе жыта.
Тут нафта Рэчыцы цячэ,
пласты зямлі свідруе.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Шахцёрскі горад
                    Салігорск
тут дзень і ноч працуе.
Чыгункі грукат,
                    гул шашы,
птушыны спеў чароўны…
Усё змясцілася на ёй,
на карце нашай роднай.
І нават вёсачка мая,
пушчанская,
                    малая,
сваёю назваю на ёй —
прыслухайся —
спявае!

*(Паводле Казіміра Камейшы)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Шматвёрстка** — геаграфічная карта пэўнага маштабу.

1. Якія пачуцці выказвае паэт у вершы?
2. Ці ганарыцеся вы сваёй Радзімай?
3. Якія мясціны нашай краіны называе аўтар у вершы?
4. Што яшчэ вы можаце дадаць, што будзе характарызаваць Беларусь?

Складзіце дыялог з прапанаваных рэплік. Працуйце ў парах: адзін задае пытанні, другі адказвае.

— У якой краіне ты жывеш?
— Ці вялікая гэта краіна?
— Ці шмат жыхароў у вашай краіне?
— Якія асаблівасці прыроды вашай Радзімы?
— Як ты ставішся да сваёй Радзімы і яе народа?

— Я жыву ў Рэспубліцы Беларусь.
— Наша краіна не вельмі вялікая.
— У нашай краіне пражывае каля дзесяці мільёнаў чалавек.
— У Беларусі шмат лясоў, рэк, азёр, няма гор, мора.
— Я люблю і паважаю сваю Радзіму і яе народ.

## Слаўная рачулка

Талька — слаўная рачулка,
грунт яе пясчаны,
бераг мяккі і не мулкі,
дзірваном засланы.

Луг квяцісты па ўзбярэжжы,
а трава як лава.
Па грудах дубы, як вежы, —
паглядзець цікава.





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Сіваваронка

А буслоў тых і не злічыш —
цэлыя брыгады!
І такія іх абліччы,
бы вядуць нарады.

Тут і чаплі, гусі, качкі,
і сіваваронкі.
Колькі шуму і гарачкі,
спеву і гамонкі!..

*(Паводле Якуба Коласа)*

**Му́лкі** — цвёрды, нязручны, які націрае скуру, робіць балюча.
**Дзірва́н** — верхні слой глебы, густа зарослы травой; пласт, выразаны з гэтага слоя.
**Ла́ва** — *тут*: вялікі абшар, аднастайны масіў чаго-небудзь.
**Груд** — невялікая горка, узгорак.
**Ве́жа** — высокае і вузкае архітэктурнае збудаванне.
**Нара́да** — пасяджэнне для сумеснага абмеркавання чаго-небудзь.
**Сіваваро́нка** — пералётная птушка з яркім зеленавата-блакітным апярэннем; сіваграк.

?!

**1.** Аб якой Радзіме расказваецца ў вершы: усёй нашай краіне ці так званай малой радзіме — тым куточку, дзе чалавек нарадзіўся і вырас?
**2.** Ці ёсць у вас такая мясціна, якая вам вельмі падабаецца, дзе вы адпачываеце і любуецеся прыгажосцю прыроды роднага краю?
**3.** Раскажыце аб сваёй малой радзіме.
**4.** Якія параўнанні выкарыстоўвае аўтар у вершы? З чым ён параўноўвае траву, дубы, буслоў?

***Параўна́нне*** — супастаўленне аднаго прадмета, з’явы, паняцця з падобнымі іншымі. Напрыклад, *дубы, як вежы*. Тут параўноўваюцца высокія дубы і высокія вежы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Зямля з блакітнымі вачамі

Зямля з блакітнымі вачамі —
раздолле рэчак і лугоў!
Тут называюць Васількамі
на Беларусі хлапчукоў,

Звіняць крыніцы, як цымбалы,
сцяжынкі свецяць у лясах.
Палі, узгоркі, перавалы —
прасторны шлях, далёкі шлях!

Краіна славы партызанскай,
краіна міру і даброт!
Ты — наша гордасць,
наша казка,
як сонца, шчодры твой народ.

Твае сыны,
твае ўнукі,
мы любім гул тваіх бароў.
І рэкі цягнуцца, як рукі,
да цёплых, верных рук сяброў.

*(Эдзі Агняцвет)*

?!

**1.** У гэтым вершы расказваецца пра ўсю нашу краіну ці малую радзіму? Пацвердзіце сваю думку словамі з верша.
**2.** Чым ганарыцца паэтэса ў гэтым вершы?
**3.** Якія параўнанні ёсць у вершы? Да чаго, на думку аўтара, падобны крыніцы, рэкі, народ Беларусі?
**4.** Чаму аўтар называе Беларусь зямлёй з блакітнымі вачамі?
**5.** Якія эпітэты выкарыстоўвае паэтэса ў вершы, каб ахарактарызаваць народ, рукі сяброў?
**6.** Вывучыце верш на памяць.

***Эпі́тэт*** — паэтычнае азначэнне, якое дае вобразную характарыстыку прадмета, з'явы. Напрыклад, *шчодры народ, цёплыя, верныя рукі сяброў*.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## «Чорнае золата» Беларусі

Шмат багаццяў у нетрах зямлі. А які з зямных скарбаў найбольш дарагі? Адны скажуць — золата, другія — алмазы, трэція — жалезная руда. І — памыляцца. Таму што сёння ніводнаму з карысных выкапняў не надаецца столькі ўвагі, як цёмнай маслістай вадкасці — нафце.

Людзі цяпер без яе абысціся не могуць. Калі б знікла нафта, спыніліся б аўтамабілі і цеплавозы, не змаглі б працаваць электрастанцыі, фабрыкі, заводы. З нафты здабываюць бензін, робяць каўчук, пластмасу, пральныя парашкі, фарбы, тканіны, лякарствы, парфуму і шмат чаго іншага. Вучоныя абяцаюць зрабіць з нафты нават пірожныя!

Нафта звычайна знаходзіцца на вялікай глыбіні, куды дабрацца няпроста. Зазірнуць у нетры памагае буравая шчыліна — круглая дзірка ў зямлі, прасвідраваная спецыяльным буравым станком.

Шукаць нафту ў Беларусі пачалі яшчэ да вайны. Свідравіны рабілі каля вёскі Давыдаўкі на Гомельшчыне. Нафты тады не знайшлі, затое адкрылі вялікія запасы спажыўнай солі.

Пасля вайны, у 1953 годзе, знайшлі-такі нафту на Палессі — каля горада Ельска. З глыбокіх нетраў ударыў фантан вышынёю з васьміпавярховы дом. Але нафты каля Ельска было ўсё ж замала, каб будаваць завод і перапрацоўваць яе.

Пошукі працягваліся.

Нарэшце ў 1964 годзе прамысловая нафта была знойдзена каля горада Рэчыцы, на глыбіні ад двух да трох кіламетраў. Адкрыцці на Палессі на гэтым не скончыліся. Нафту знайшлі таксама каля горада Светлагорска, каля гарадскіх пасёлкаў Васілевічы, Капаткевічы і ў іншых месцах. Знайшлі нафту і каля той самай Давыдаўкі, адкуль калісьці пачыналі шукаць.

Як утварылася нафта на Палессі?

Мільёны гадоў таму назад Палессе было дном неглыбокага мора, багатага на малюсенькіх, мікраскапічных жывёлінак



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

і расліны. Яны вельмі хутка размнажаліся, але і век мелі караткі. Паміраючы, яны пакрывалі дно мора. Іх заносіла глеем. І так пласт за пластом на працягу мільёнаў гадоў. Паступова мора месцамі ператварылася ў сушу, месцамі — у балота. А ў нетрах праходзіла дзіўнае пераўтварэнне. Ціск зверху зямных парод, унутранае цяпло Зямлі, адсутнасць кіслароду і работа своеасаблівых падземных мікробаў. Усё гэта за многія мільёны гадоў ператварыла пахаваных на марскім дне маленечкіх істот у маслістыя кропелькі і гаручы газ.

Аднак для таго, каб узнікла нафта, гэтага мала. Трэба, каб мільёны мільёнаў рассеяных кропелек сабраліся на невялікай плошчы. Нафта ўтвараецца далёка не ўсюды. Часцей за ўсё яна збіраецца ў зямных пластах, падобных па форме на перакуленую талерку ці клін. У іх нафта замкнута з усіх бакоў: зверху — пласты гліны ці солі, унізе — вада. Шукаючы «чорнае золата», геолагі стараюцца натрапіць на такую мясціну.

Цяпер нетры Беларусі штогод аддаюць людзям восем мільёнаў тон «чорнага золата». А геолагі шукаюць новыя і новыя зямныя багацці. *(Паводле Эрнста Ляўкова)*

**Кары́сныя вы́капні** — розныя руды, вугаль, нафта, солі, якія здабываюцца з зямлі.
**Свідраві́на** — глыбокая і вузкая адтуліна ў глебе ці ў горнай пародзе, зробленая буравым інструментам.
**Глей** — адклады на дне вадаёмаў, у склад якіх уваходзяць найдрабнейшыя часцінкі мінеральных і арганічных рэчываў.

**1.** Вылучыце ў тэксце частку, дзе апісваецца працэс утварэння нафты. Колькі гадоў яна ўтвараецца?
**2.** Пералічыце месцы, дзе ў Беларусі знайшлі нафту. Ці ўсе яны названы ў тэксце?
**3.** Назавіце іншыя месцы, дзе ў апошнія гады была знойдзена нафта. Пакажыце іх на карце Беларусі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**4.** Ці ведаеце вы, дзе нафта перапрацоўваецца? Дзе знаходзяцца ў Беларусі нафтаперапрацоўчыя заводы?

**5.** Якімі яшчэ карыснымі выкапнямі багатая Беларусь?

**6*.** Зрабіце сціслы пераказ тэксту.

## Як запалка нарадзілася

Маленькая, тоненькая, а як яна патрэбна людзям! Ці дома, ці на рабоце, ці ў паходзе — чалавек без яе як без рук…

Яшчэ не так даўно, паўтара стагоддзя назад, у нашых вёсках высякалі іскру пры дапамозе крэсіва. На крэмень клалі сухую гу́бу — нарост з бярозы — і ўдаралі па крэмені кавалачкам сталі. Іскра трапляла ў гу́бу, яе раздзьмухвалі і запальвалі ў печах. А то захоўвалі гарачае вуголле ў пячурках. Запалкі ў той час ужо былі, але надта дарагія.

У наш час тоненькая запалка-саломінка ўмомант дае людзям агонь. Чалавек навучыўся рабіць розныя запалкі. Ёсць «ветравыя». Устойлівы маленькі агеньчык трымціць, трымціць на ветры, але не гасне, пакуль не згарыць уся запалка. Такія запалкі вельмі патрэбны тым, каму прыходзіцца працаваць у любое надвор’е. Ёсць яшчэ запалкі «паляўнічыя». Яны не баяцца вільгаці. Нават у дождж не намакаюць. Гараць сабе і ў снег і ў слоту.

Запалка — добрая памочніца і служка чалавека. Колькі іх вырабляецца ў нашай краіне! У Беларусі ёсць тры запалкавыя фабрыкі: у Барысаве, Гомелі і Пінску.

Зойдзем з вамі на барысаўскую фабрыку, паглядзім, як жа робяцца запалкі. У тры змены працуюць тут людзі. Дзень і ноч кіпіць работа. Колькі вымагае працы ад чалавека гэта маленькая запалка-саломінка! Якія складаныя машыны-аўтаматы прыдумалі інжынеры, каб як мага больш даць краіне надзейных і танных запалак!

І вось мы на фабрычным двары, дзе пад паветкаю ляжаць штабелі асінавых бярвёнаў. Навошта яны тут? Спынімся на хвілінку, паглядзім, што робяць з бервяном.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Вось рабочы падкаціў бервяно пад электрычную пілу. Тут яго ўвачавідкі распілавалі на невялічкія кавалачкі і адправілі на акорку. Станок лёгка і хутка ачысціў яго ад шурпатай кары.

Чысценькая беленькая асінавая цурка трапляе да другой машыны. Рабочы ўключыў рубільнік. Матор завішчаў, заскрыгатаў, мы бачым, як з-пад вострага разца папаўзла доўгая беласнежная стужка. Яе падхоплівае работніца, выроўнівае і кладзе на транспарцёр.

Нарэшце стужка апынулася ў саломкалушчыльным цэху, дзе яе чакае нешта падобнае на сячкарню — рубільны станок. Вось тут нараджаецца запалка, якой мы карыстаемся. Рубільны станок рэжа драўляную стужку на тонкую саломку. Робіць ён гэта лёгка, хутка, бясшумна, быццам рэжа не драўніну, а тугое цеста на локшыну.

Транспарцёр, які ўвесь час рухаецца, дастаўляе саломку ў насычальны бак.

Навошта? Ты, напэўна, заўважыў, як адразу гасне запалка, калі злёгку дзьмухнуць на яе. Вось тут, у вялізным баку, запалку намочаць у хімічным растворы, каб яна, згаснуўшы, не тлела. Адсюль саломка трапіць у сушыльную шафу.

Высахне саломка ў шафе — і зноў у дарогу. Прыхарошыцца, пашліфуецца, каб не застрэмліваць пальцаў людзям, і накіруецца ў прыёмны бункер. Тут можна бачыць, як саломка ператворыцца ў запалку.

Павольна круцяцца валы велізарнага аўтамата. Нібы вожыкавы іголкі, паўтыканы на іх дзясяткі тысяч саломінак. Працуе аўтамат важна, не спяшаючыся. Вось ён абмакнуў канцы белых «іголак» у карычневую сумесь. Затым асцярожна ачысціў іх ад лішняй запальнай масы, каб галоўкі былі гладзенькія…

На сушыльным барабане запалка некалькі хвілін пасушыцца — і тады зусім гатова.

Наша запалка прайшла свой шлях ад бервяна да сушыльнага барабана. А ў суседнім цэху машыны рыхтавалі для яе адзенне — карабкі. Набівачная машына збярэ запалкі сем’ямі,



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

па шэсцьдзясят штук у карабок. Тады перадасць далей, каб наклеілі фабрычныя этыкеткі. Затым ва ўпаковачным цэху ўкладуць іх у фанерныя скрынкі па тысячы карабкоў і адашлюць на базу.

Шэсць мільёнаў карабкоў запалак выпускае за суткі толькі адна барысаўская фабрыка. Калі пакласці карабкі адзін за адным на зямлю, дык будзе ланцужок даўжынёй трыста кіламетраў.

Убачыш у лесе асіну, стройную, зялёную, з трапяткім лісцем — успомні з падзякай яе сяброўку. Тую, што дала людзям сотні тысяч агеньчыкаў. *(Паводле Тамары Цулукідзэ)*

**Крэ́сіва** — кавалак сталі для высякання агню з крэменю.
**Крэ́мень** — надта цвёрды камень, з якога раней высякалі агонь.
**Увачаві́дкі** — хутка, на вачах.
**Ако́рка** — працэс ачысткі бервяна ад кары.
**Цу́рка** — кароткі кавалак дрэва.
**Застрэ́мліваць** — увагнаць стрэмку — вострую, тонкую трэску, востры асколак шкла, металу, які залез пад скуру.

**1.** Якія віды запалак названы ў апавяданні? З якімі з іх вы знаёмы?
**2.** Дзе ў Беларусі вырабляюць запалкі?
**3.** Раскажыце, які шлях праходзіць запалка, перш чым даць людзям агонь.
**4.** Адгадайце загадку.

**Маленькая палачка ўсяму свету свеціць.**

**5.** Знайдзіце ў тэксце эпітэты.

***

Белая Русь ты мая!
Чыстая ты мая!
Родная ты мая!



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Белыя гоні бульбы,
белыя косы дзяўчат.
Воблакаў белых над лугам
вечны парад.

Белых грыбоў кашолкі,
белыя плечы бяроз,
белыя россыпы золкіх
чыстых світальных рос.

Белых туманаў плыні,
белыя вершы буслоў.
Ціхая завадзь Бялыніч,
рык белавежскіх зуброў.

Вейкі рамонкаў белых,
белыя грывы завей.
Чыстыя душы смелых,
простых тваіх людзей.

*(Паводле Уладзіміра Скарынкіна)*

?!

**1.** Якія вобразы ў вершы пацвярджаюць назву *Белая Русь*? Што белае ў Беларусі?

**2.** Паслухайце песню на словы гэтага верша.

**3.** Растлумачце, чаму наша краіна называецца Белай Руссю. Успомніце з вывучанага раней, якія пісьменнікі і як тлумачылі паходжанне гэтай назвы.

**4.** Працягніце пачаты ў вершы шэраг назваў са словам *белы*. Што яшчэ бывае белым?

## Пытанні і заданні да раздзела

1. Якой тэмай аб'яднаны творы гэтага раздзела? Якія характарыстыкі нашай Радзімы даюцца ў творах?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**2.** У якіх творах апісваецца прырода Беларусі?

**3.** Якія творы расказваюць пра прыродныя багацці нашай краіны?

**4.** Якіх пісьменнікаў, што пісалі аб нашай Радзіме, вы запомнілі?

**5.** З якіх твораў узяты наступныя радкі?

*Высахне саломка ў шафе — і зноў у дарогу. Прыхарошыцца, пашліфуецца, каб не застрэмліваць пальцаў людзям, і накіруецца ў прыёмны бункер.*

*Зямля з блакітнымі вачамі —*
*раздолле рэчак і лугоў!*
*Тут называюць Васількамі*
*на Беларусі хлапчукоў.*

*Белых туманаў плыні,*
*белыя вершы буслоў.*
*Ціхая завадзь Бялыніч,*
*рык белавежскіх зуброў.*

**6.** Растлумачце значэнне наступных выказванняў.

**У сваім краі, як у раі.**

**Дзе прайшло маленства, там пачынаецца Радзіма.**
*(Кузьма Чорны)*

**7*.** Растлумачце значэнне літаратурных паняццяў *параўнанне, эпітэт*. Прывядзіце прыклады параўнанняў і эпітэтаў, якія сустракаліся ў творах гэтага раздзела.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ХТО ПРАЦУЕ, ТОЙ РАДЗІМУ МАЦУЕ



## Усё для ўсіх

Муляр гмахі муруе,
а кравец шые ўбранне.
Але дзе б працаваў ён,
каб не меў памяшкання?

Ды і муляр не мог бы
на работу з'явіцца,
каб фартух не пашыў хто,
не пашыў нагавіцы.

Каб мець пекару боты —
да шаўца яму трэба.
А калі б не той пекар,
дык шаўцу быць без хлеба.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Для супольнай карысці,
не шкадуючы сілы,
трэба ўсім і заўсёды
працаваць, дружа мілы.

*(Юліян Тувім)*

**Гмах** — вялікі і высокі будынак.
**Нагаві́цы** — штаны.
**Супо́льны** — сумесны, агульны.

**1.** Аб чым гэты верш? Якая яго асноўная думка? У якіх словах яна выказваецца?
**2.** Якія прафесіі ўпамінаюцца ў вершы? Без якіх яшчэ прафесій немагчыма наша паўсядзённае жыццё?
**3.** Растлумачце значэнне прыказак.

**Справа майстра баіцца.**
**У добрага пільшчыка піла вострая.**

Якая з іх найбольш адпавядае вершу?
**4.** Вывучыце верш на памяць.

## Васька Жукаў

Васька Жукаў, чатырнаццацігадовы хлопчык, аддадзены тры месяцы назад у рамеснае абутковае вучылішча, вярнуўся з работы. Сеў у куток і пачаў пісаць.

«Мілы дзядуля Іван Сцяпанавіч! — пісаў ён. — Я пішу табе пісьмо. Вітаю цябе з надыходзячым святам Кастрычніка і жадаю табе ўсяго добрага. Няма ў мяне ні таткі, ні мамкі, толькі ты ў мяне адзін застаўся».

Васька зірнуў у акно, дзе калыхалася дрэва з рэшткамі пажоўклага лісця. Як жывога, уявіў свайго дзеда Івана Сцяпанавіча. Высокі, з шырокімі плячыма і вялікай белай барадой, ён, здаецца, ніколі не злаваў, не крычаў, а толькі жартаваў. Ён



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

быў калгасным вартаўніком, і ўсе ставіліся да яго з павагай, як да гаспадара. Удзень ён спаў ці поркаўся каля сваёй хаты. Ноччу хадзіў па «сваіх уладаннях» ад «элеватара», як ён называў свіран са збожжам, да «ўнівермага» — сельскай крамы. Калі пачуе якую трывогу ў кароўніку, дык пабудзіць цётку Палагу. Часам зойдзе на агеньчык у праўленне, дзе зацягнулася на ноч пасяджэнне. Тады прыме ўдзел у абмеркаванні калгасных спраў.

Васька ўздыхнуў, памачыў пяро і стаў пісаць далей:

«А ўчора ў нас была самадзейнасць. Я на сцэне танцаваў „Крыжачок“. Але я хачу перайсці ў аркестр. Нашы хлопцы вельмі добра іграюць на розных інструментах. Мне хочацца навучыцца іграць на баяне. А ёсць такія, што добра малююць, і ім даюць паперу і фарбы. І яшчэ хочацца мне ўдзельнічаць у тэатральным гуртку. Учора ў нас ставілі п’есу. Мілы дзядуля, прыязджай. Я не ведаю, што мне рабіць, — хочацца і туды, і туды.

Сплю я ў спальні, і ў мяне ёсць асобны чысты ложак. Даюць мне і чай, і катлеты, і манную кашу. Хаджу я ў сіняй форме, штаны навыпуск, а на спражцы літары — „РУ“. Адзін дзень мы вучымся ў класах, а другі — у майстэрні. На другі год мы будзем працаваць на фабрыцы. А наш майстар мяне хваліць, кажа, што добра працую. Раней, у школе, у мяне не было вялікай ахвоты вучыцца, а цяпер у класе атрымліваю толькі добрыя адзнакі».

Васька спыніўся, задумаўся, а потым зноў стаў пісаць:

«А Мінск — горад вялікі, ды толькі зруйнаваны. Гэта фашысты яго так знішчылі. Але ўсюды ідзе будоўля. Дамы будуюцца вялікія, прыгожыя. Я часта бачу на будоўлях такіх самых хлапцоў, як я. Яны і цэглу кладуць, і атынкоўку робяць, і майструюць, як дарослыя. Ад іхняй работы ёсць вялікі знак. Але і мая праца мне таксама падабаецца, асабліва на машынах. А хлопцы з мяне смяюцца, што я хачу вывучыць усе навукі і ўсе майстэрствы. А чым жа я вінаваты, што ўсё мне цікава?»

Васька пакрывіў рот і пацёр кулаком вочы.

«Прыязджай, мілы дзядуля, паглядзі сам і скажы, што мне рабіць. А яшчэ фізкультурнікам вельмі весела: яны выступаюць на



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

спаборніцтвах і парадах. А каб ты ведаў, якая цікавая гульня — шахматы! Адзін з нашых хлопцаў, Сёма Шугай, абыграў студэнта ўніверсітэта, і яго ўсе хвалілі. Заўсёды ў нас весела і цікава, але часу не хапае на ўсё... Прыязджай паглядзець на наша жыццё і скажы, што мне рабіць. Застаюся твой унук Васіль Жукаў».

Васька палажыў ліст у канверт і напісаў адрас: «БССР, Бабруйская вобласць, Асіповіцкі раён, калгас „Перамога“, Івану Сцяпанавічу Жукаву».

Ноччу яму снілася, як дзед у акулярах сядзіць за сталом, чытае яго пісьмо і весела смяецца. Каля яго сядзіць сабачка Уюн і круціць хвастом.

Праз некаторы час Васька атрымаў ліст. Старэчай дзедавай рукой было накрэмзана:

«Дарагі ўнучак Васілёк! Твой ліст я атрымаў і прачытаў з вялікай ахвотай. І смешна, і радасна мне зрабілася, як ты там пакутуеш. Трымайся, браток, цярпі, пакуль я прыеду. А прыеду я да цябе на Новы год, як той Дзед Мароз. А што табе рабіць, я і цяпер магу сказаць — трымайся свайго рамяства. З ім ты можаш ісці куды хочаш, і ўсюды табе будзе месца і павага. З ім ты можаш скакаць і спяваць колькі ўлезе. З ім ты можаш вучыцца і далей, хоць на прафесара. А што ты цяпер лепей вучышся, як у школе, то я разумею так. Чалавеку патрэбна перамена — і рукамі папрацаваць, і галавой. А хто думае працаваць толькі адной галавой, то з яго выйдзе, як з таго Петрыка Сухаверхага. Рамяству вучыцца не захацеў, а на вучонага здольнасцей не хапіла. Круціўся-круціўся, а цяпер квіткі піша і думае, што ён вялікі пан.

Чытаючы твой ліст, я ўспомніў, як калісьці сам пісаў свайму дзеду Канстанціну Макарычу. Пазней я даведаўся, што мой ліст перахапіў адзін пісьменнік, Чэхаў называецца, і надрукаваў у газеце. Шкада, што ён памёр, а то я паказаў бы яму і твой ліст. Глядзі, як піша мой унучак! Калі хочаш, можаш таксама надрукаваць. Твой дзед Іван Сцяпанавіч Жукаў». *(Паводле Янкі Маўра)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Раме́снае вучы́лішча** — навучальная ўстанова, якая рыхтавала кадры кваліфікаваных рабочых (у 1940—1958 гадах).
**Ад і́хняй рабо́ты ёсць вялі́кі знак** — вынікі іх працы вельмі адметныя, іх добра відаць.

**1.** У які час адбываецца дзеянне апавядання? Чаму вы так вырашылі?
**2.** Ці ведаеце вы, што літары на спражцы рамяня «РУ» азначаюць «рамеснае вучылішча», па-руску «ремесленное училище»?
**3.** Якіх з'яў, што апісваюцца ў апавяданні, зараз ужо няма? Паспаборнічайце, хто больш знойдзе такіх незнаёмых вам з'яў у тэксце.
**4.** Ахарактарызуйце героя апавядання — Ваську Жукава. Якімі рысамі характару ён надзелены? Ці апісваецца ў апавяданні знешнасць хлопца?
**5.** Ці спадабаўся вам хлопец? Чаму? Ён старэйшы ці малодшы за вас?

## Першы заработак

Бацька і маці выхоўвалі сына.
Сын быў уцехай, надзеяй адзінай.

Толькі, на жаль, у падобных выпадках
часам бывае не вельмі ўсё гладка.

Бацька гаворыць, што хлопцу да працы
трэба памалу хадзіць прывучацца.

Матчына думка зусім не такая:
«Тая работа яшчэ пачакае.

Можа здарыцца якое няшчасце.
Можа з няшчасця сыночак прапасці...»

Час не чакае. Хлапчына — даросля.
Стаў паглядаць на дзявочыя косы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Бацька гаворыць:
— Гультайства даволі!
Так працаваць не пачнеш ты ніколі!

Заўтра выходзь, мой сынок, на работу. —
Сын і пайшоў, але ўсё ж без ахвоты.

Ды не паспеў ён прайсці і два крокі —
хлопца гукаюць сябры-абібокі.

З тымі сябрамі гуляў ён у карты,
з тымі сябрамі ўсялякія жарты...

Вечарам трэба вяртацца дахаты.
«Што зарабіў ты?» — спытаецца тата.

Матка чакае сыночка ля брамы:
— На табе, сынку, рубель серабраны.

Бацька спытаецца пра заработкі,
вось і адказ яму будзе кароткі...

Бацька на сына зірнуў толькі вокам,
скеміў, што сын быў ад працы далёка.

Але пытае:
— Ну як, галубочак,
папрацаваў ты свой першы дзянёчак?

Сын падае той рубель серабраны.
Бацька ўзяў, на рубель і не глянуў.

Зразу рубель у агонь ён укінуў.
— Не зарабляў ты яго, — кажа сыну.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Матка зірнула на сына маўкліва:
«Як ён пазнаў? Гэта нейкае дзіва!»

Раніцай зноў, толькі выйшаўшы з дому,
ён напаткаў учарашніх знаёмых.

Зноў абышоў ён работу далёка.
Так дачакаўся і шэрага змроку.

Вечарам трэба вяртацца дахаты.
«Што зарабіў ты?» — спытаецца тата.

Матка спаткала сыночка ля брамы:
— На табе, сынку, рубель серабраны!

Бацька спытаецца пра заработкі,
вось і адказ яму будзе кароткі...

Бацька дахаты вярнуўся не рана.
Сын падае той рубель серабраны.

Бацька зірнуў і — у агонь зноў з размаху!
Сын да сцяны прытуліўся са страху.

— Не працаваў ты ізноў! — кажа сыну.
«Як пазнае ён?» — здзівіўся хлапчына.

Досвіткам сын зноў падняўся на ногі,
сэрца смылела ў яго ад трывогі.

Сорамна бацьку ўжо глянуць у вочы:
ён спрабаваў ашукаць яго двойчы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Зразу пайшоў на работу хлапчына.
Ён працаваў, як сапраўдны мужчына.

Дзень ён цалюткі варочаў каменне,
муляр з камення выводзіў скляпенне.

Тут ён не бачыў сваіх абібокаў,
тут працавалі ўсе людзі навокал.

Вечарам, толькі заходзіла сонца,
майстар прыйшоў і падзякаваў хлопцу.

— На табе, — кажа, — рубель серабраны,
шчыраю працай тваёй зараблены…

Сын патрымаў той рубель на далоні:
— Тата здаволіцца, пэўна, сягоння!

Матка спаткала сыночка ля брамы:
— На табе, сынку, рубель серабраны!

Сын адказаў ёй:
— Пакінь, мама, клопат!
Маю рубель я сягоння з работы.

Думаю, ім задаволіцца тата. —
З добрым настроем ідзе ён у хату.

Бацька сядзіць ля стала і чакае:
— Дзе ж ты так позна, сыночак, гуляеш?

Сын падае свой рубель серабраны,
шчыраю працай што быў зараблены.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Бацька ўзяў і ў агонь яго кінуў.
Як падхапіўся адразу хлапчына!

Выграб з агню яго голай рукою:
— Што ты тут робіш, татуля, такое?

Гэта не жарты! Ад золку да змроку
я працаваў, і было мне нялёгка.

Бацька смяецца, бо сынам здаволен:
— Веру табе я, сыночак, сягоння!

Веру, што ты зарабляў яго шчыра, —
голай рукою з агню нават выграб!

Будзе ляжаць ён асобна, бо першы —
ён і цяжэйшы,
але і мілейшы.

*(Уладзімір Дубоўка)*

**Абібóк** — гультай, лежабок, лайдак.
**Скéміць** — здагадацца.
**Смылéць** — *тут*: мучыць, непакоіць.
**Скляпéнне** — дугападобнае перакрыццё, якое злучае сцены, апоры пэўнага памяшкання; падвальнае памяшканне.
**Зóлак** — пачатак світання.

**1.** Якая асноўная думка гэтага вершаванага апавядання?
**2.** Ці спадабаліся вам паводзіны хлопца ў пачатку апавядання? Чаму? Якімі словамі яго можна ахарактарызаваць?
**3.** Што дапамагло хлопцу выправіцца?
**4.** Хто яго лепш выхоўваў: маці ці бацька?
**5.** Як вы адносіцеся да працы?
**6.** Ці прывучаюць вас да працы вашы бацькі? Як яны гэта робяць? Раскажыце.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**7.** Прачытайце вершаванае апавяданне па асобах, інтанацыяй перадаючы адносіны герояў да працы.

## Настаўнік

Мінулае чалавек вывучае не дзеля таго, каб вярнуцца на яго дарогі. Мінулае трэба ведаць, каб не заблудзіць у сваім руху наперад.

Прафесія настаўніка, як і прафесія каваля, вельмі старая і вельмі патрэбная.

Прафесія каваля з развіццём тэхнікі як бы адышла на задні план. Прафесія настаўніка з развіццём культуры і тэхнікі зрабілася яшчэ больш патрэбнай. Паспрабуйце ўявіць сабе сёння грамадства без настаўніка. Нельга, як нельга ўявіць сабе тэхнічны прагрэс чалавецтва на першапачатковай яго стадыі без звычайнага каваля.

На жаль, часта даводзіцца чуць: «Падумаеш, велічыня: настаўнік». Скажам прама: не горш за доктара, за інжынера, за юрыста, эканаміста і іншых дыпламаваных спецыялістаў. Я аддаю перавагу хіба толькі талентам. Ды хто не схіліць галавы перад талентам, у якой бы сферы ён ні праявіўся?

Праўда, прафесія настаўніка не з лёгкіх. Вобразна гаворачы, трэба ўсё жыццё ўзыходзіць на гару. Паглыбляць і паглыбляць веданне прадмета, які ты выкладаеш. Трэба любіць свой прадмет. Ганарыцца ім і абараняць ад любых наскокаў. Калі ты філолаг — літаратура, літаратура і літаратура. Часопісы, літаратурныя газеты, слоўнікі. Мора кніг. Ведаеш, што іх ніколі не перачытаць за адно жыццё аднаму чалавеку, але імкнешся прачытаць як мага больш. Бо яны цябе падымаюць усё вышэй і вышэй. І кругагляд твой з кожнай прачытанай кніжкай, як з гары, на якую ты ўзыходзіш, робіцца шырэйшы і шырэйшы.

А майстэрства выкладання? Малады настаўнік вельмі многа гаворыць. У яго рабоце шмат непатрэбнай мітусні. Прыкра, калі нехта пачынае хваліць такога выкладчыка. Маўляў, стараецца.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Стараннасць без умельства — нішто. Майстэрства выкладчыка прыходзіць з гадамі. Цераз глыбокае веданне псіхалогіі таго, каму выкладаеш. Кантакт з класам і з кожным паасобку, хто сядзіць у класе. *(Паводле Якуба Ермаловіча)*

**Тлум** — шум, гоман, сумятня; шумлівы натоўп людзей.
**Філóлаг** — спецыяліст у галіне філалогіі — сукупнасці навук, якія вывучаюць літаратуру і мову.

**1.** З якой прафесіяй параўноўвае аўтар прафесію настаўніка ў пачатку тэксту?
**2.** Што неабходна ўвесь час рабіць, каб быць добрым настаўнікам?
**3.** У чым, на думку аўтара, заключаецца майстэрства настаўніка?
**4.** Ці падабаецца вам прафесія настаўніка? Растлумачце, чаму падабаецца або не падабаецца.
**5.** Раскажыце аб сваіх настаўніках. На якіх уроках вам цікава?

## Размова аб прафесіях

Раз сышліся на двары
юныя рамеснікі
і пачалі гаварыць
аб сваіх прафесіях:
што каштоўней, што важней
для краіны і людзей.

— Я шліфую, я тачу
рэчы далікатныя,
справу токара лічу
самаю выдатнаю.
Нават трактар без мяне
кола з месца не скране.





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Муляр з цэглы дом кладзе,
сценка ў сценку роўныя.
Вы не знойдзеце нідзе
працы больш шаноўнае.
Дзе ні вуліца, ні пляц,
як паглядзіш — мой палац.



— Што ты нам ні гавары —
вушы не развешу я.
Я за слесара, сябры,
вось дзе дык прафесія.
Ні замок, ні нож, ні крук
без маіх не зробіш рук.



— За станкамі я стаю,
тку адменнай пражаю,
я прафесію сваю
лічу самай важнаю.
Апранаю я народ
у бастон і каверкот.



— Ты залішняе ўзяла,
пасмяшыла жартамі.
А сякера, а піла
нікуды не вартыя?
Без сякеры, без пілы
не зрабіць і чапялы.



— А вось справа швейная
самая надзейная:
абыходзіць голка свет,
кожны голкаю адзет.





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— А шавец? Ты толькі ўваж!
Чым жа не выдатны я?
Вы без ботаў, без гамаш
ні на што не здатныя.
А ў абутку — любата,
ці мароз, ці хлюпата.



— Дайце слова, мне пара,
марна вокал ходзіце.
Лепшай, чым у друкара,
працы вы не знойдзеце.
А без кніжак ды газет
не абходзіцца ўвесь свет.



Слаўны наш радзімы край,
моладзі жыць весела.
Ты любую выбірай
сам сабе прафесію:
навучайся і працуй,
толькі сілы не шкадуй.

*(Паводле Анатоля Астрэйкі)*

**Раме́снік** — чалавек, які займаецца, валодае прафесійным рамяством.
**Даліка́тны** — складаны па выкананні.
**Пляц** — *тут*: плошча; прызначаная для забудовы тэрыторыя ў горадзе ці вёсцы.
**Бастóн, каверкóт** — віды тканіны.
**Чапяла́** — спецыяльна загнутая на канцы лапатачка з ручкай для захоплівання гарачай скаварады.
**Гама́шы** — мужчынскія чаравікі, туфлі.

?!

**1.** Аб чым спрачаліся хлопцы і дзяўчаты?
**2.** Знайдзіце ў тэксце і зачытайце, што гаварылі аб сваіх прафесіях токар, муляр, слесар, ткачыха, швачка, шавец, друкар.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**3.** Разгледзьце малюнкі ў кнізе і скажыце, людзі якіх прафесій намаляваны, чым яны займаюцца. Прадоўжыце па ўзоры: *токар шліфуе, муляр ..., слесар ..., ткачыха ..., швачка ..., шавец ..., друкар ... .*
**4.** Скажыце, якой з гэтых прафесій вы можаце авалодаць. Чаму яна вам падабаецца? Дзе ў вашай мясцовасці можна працягнуць навучанне ёй?
**5.** Як вы лічыце, якая прафесія лепшая? Чаму?
**6.** З якім наказам звяртаецца паэт да вас?
**7.** Раскажыце, якім прафесіям навучаюцца дзеці ў вашай школе.

## Пытанні і заданні да раздзела

1. Што ўслаўляюць творы, змешчаныя ў гэтым раздзеле? Растлумачце, як вы разумееце назву раздзела.

2. Які з твораў вам спадабаўся найбольш? Абгрунтуйце сваю думку.

3. З якіх твораў узяты наступныя радкі?

*Дзе ні вуліца, ні пляц,*
*як паглядзіш — мой палац.*

*Гэта не жарты! Ад золку да змроку*
*я працаваў, і было мне нялёгка.*

*Для супольнай карысці,*
*не шкадуючы сілы,*
*трэба ўсім і заўсёды*
*працаваць, дружа мілы.*

4. Прачытайце прыказкі. На якую яны ўсе тэму? Патлумачце гэтыя прыказкі.

**Не капаў студні — вады не нап’ешся.**

**Не выбірай дзеўку ў карагодзе, а выбірай у агародзе.**

**Добра поле ўзарэш — хлеба больш збярэш.**



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# СЛУХАЙ РОДНУЮ ПРЫРОДУ



**Канец лета**

Яблыкі даспелі…
У ярах глыбокіх
дацвітае лета
цветам журавін.

Адспявалі жнеі
на палях шырокіх.
Заспяваюць скора
ў небе журавы.

Заўтра нам у школу…
Развітацца трэба
з тымі, з кім гулялі
летняю парой:



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

з нашым шумным лесам,
з нашым сінім небам,
з нашаю блакітнай,
быстраю ракой.

Мы ідзём на поле…
Тонкім павуціннем
і расой халоднай
крыецца прастор.

Мы ідзём у пушчу…
Быццам у кручыне,
галаву схіляе
старадаўні бор.

Мы ідзём да рэчкі…
З намі па дарозе —
з поўначы сцюдзёны
подых вецярка.

І пад ім на воды
ліст раняюць лозы,
і шуміць маркотна
нашая рака.

Чуе, скора лёдам
будзе ўся адзета,
на палях закружаць
белыя снягі…

Да спаткання ж, рэчка!
Да другога лета,
дарагія пушчы,
нівы і лугі!



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Заўтра нам у школу…
За сталы, за парты
сядзем мы па класах,
будзем працаваць,

будзем весяліцца
і вучыцца ўпарта,
будзем вечарамі
лета ўспамінаць.

*(Паводле Пятра Глебкі)*

**1.** З якімі пачуццямі паэт ад імя школьнікаў развітваецца з летам?
**2.** Якія змены назіраюцца ў прыродзе ў канцы лета? Адкажыце словамі з верша.
**3.** Якія змены хутка адбудуцца?
**4.** Якія змены ў прыродзе вы назіраеце зараз? Паглядзіце ў акно і раскажыце.
**5.** Складзіце дыялог на тэму асенніх змен у прыродзе. Працуйце ў парах: адзін задае пытанні, другі адказвае.

***

Вось і лета сышло,
адспявалі калоссі,
цяжка нам заўважаць,
як з'яўляецца восень.

Непрыкметна зусім
праплыве павуцінкай,
гляне жоўтым лістком
з-пад зялёнай хусцінкі.

Усплыве туманом
над рачулкаю соннай,
устрывожыць дымком
з пахам бульбы пячонай.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Зачаруе агнём
маладзенькай рабіны,
на адлёце крылом
памахае буслiным.

А пасля,
а пасля
ліст апошні сарвецца…
Ды не знаю, чаму
ты мне, восень, па сэрцы!

*(Паводле Петруся Броўкі)*

**1.** Якія прыметы надыходу восені апісвае паэт?
**2.** Якія прыметы позняй восені ёсць у вершы?
**3.** Якія эмоцыі і пачуцці прыносіць восень? Ці падабаецца гэта пара года паэту? А вам?
**4.** Раскажыце, чым вам восень падабаецца, а чым — не.
**5*.** Вывучыце верш на памяць.

## Апошняя восень

Гэты ранак помніцца мне пахам смажанай бульбы. Ён ідзе з кухні. Маці гатуе абед у поле. Сёння мы капаем бульбу.

Я прачынаюся ад яркага сонца: акно спальні выходзіць на ўсход. Праз шкло б'е асляпляльны паток святла. Напалову яшчэ летні, напалову ўжо восеньскі. У ім няма летняга цяпла, у восеньскім святле адчуваюцца стомленасць і меланхолія.

На вуліцы грыміць воз, коратка ржэ конь. Гэта прыехаў бацька. Зараз мы з ім паедзем на поле. Я буду баязліва вадзіць каня па баразне, а бацька — падорваць бульбу. І абавязкова ён будзе спыняцца пасярэдзіне поля і глядзець, якая бульба. А трава будзе росная, і над намі будзе вісець бяздоннае блакітнае неба, ужо крыху пажоўклае.

Потым з Гомеля пад'едуць бацькавы браты і сястра, з імі маці. Да гэтага моманту мы паспеем узараць палову поля. Можна пачынаць…



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Сонца ўжо высока. І налева, і направа — сагнутыя спіны, шэрыя ланцужкі мяхоў, дзе-нідзе паляць бульбоўнік. Здаецца, чуеш характэрнае патрэскванне. Дзень без ветру, і слупы белага дыму цягнуцца ўверх строга вертыкальна.

Наш участак ляжыць ля чыйгосьці саду, відаць, закінутага: верасень, а яблыкі ніхто не здымаў. Пад яблыняй мы снедаем. І да нас падыходзіць цялушка з чорным мокрым носам і дурнымі бліскучымі вачамі. Есці ёй не хочацца, а проста цікава.

І абавязкова побач праходзіць ці праязджае які-небудзь знаёмы дзядзька, які кажа:

— Здароў былі! Ну, як бульба?

— Дзякуй Богу.

Дзядзька замаўкае, нетаропка скручвае цыгарку, бо фабрычны тытунь ён не прызнае. І сам ён, спакойны, нейкі хатні, і яго гаворка, па-мясцоваму круглая, крыху расцягнутая, як бы з лянотай, вельмі стасуецца з гэтым днём — мяккім, ціхім, напоўненым асэнсаванай працай.

Заканчваем мы, калі сонца ўжо вісіць над гарызонтам, а ўсход моцна наліваецца сінім колерам. Паступова сінеча пераходзіць у фіялетава-зеленаваты халодны колер. Запальваюцца матавыя кропкі рэдкіх зорак.

Усе ідуць дадому пехатою, а мы з бацькам на возе вязём бульбу. Шлях няблізкі, ехаць на гары мяхоў страшнавата.

Удалечыні прыцемкі праразае промень святла: ідзе паўднёвы хуткі цягнік. Пад коламі асцярожна грукае брук, часам мы з'язджаем у мяккі, яшчэ цёплы пыл. Сады абапал дарогі навісаюць цёмна і таямніча. Ад іх пахне маладым віном і сухой травой. Пабрэхваюць сабакі, сыта, сонна мыкае карова, ясна грыміць калодзежны ланцуг.

Ах, як многа я даў бы, каб зноў вярнуць тую восень, яшчэ раз перажыць той добры, заспакоены восеньскі вечар, калі дрэвы былі вялікія, а я — шчаслівы. Толькі не здагадваўся тады пра гэта. Усё прайшло. Нічога не вернеш. У адну ваду не ступіш двойчы...



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Апошняя восень стагоддзя таксама цёплая, ціхая і сонечная. Як быццам нам даюць магчымасць перавесці дух, задумацца, нагадаць самае важнае. Хвіліна, год, стагоддзе — гэта ўсё адносна. Людзі самі прыдумалі час... Кожны ўспамін — гэта заўсёды перажытае і пражытае. Тое, што не вернецца, як бы ні хацеў... (*Паводле Сяргея Шаўцова*)

**Меланхóлія** — сумны настрой, маркота.
**Падóрваць** — узворваць дадаткова.
**Пажóўклы** — які зрабіўся жоўтым, набыў жоўтае адценне, звычайна ад часу, пры звяданні.

**1.** Які настрой гэтага апавядання: вясёлы, бесклапотны ці сумны, меланхалічны, настальгічны?
**2.** Чаму апавяданне мае такую назву? Колькі гадоў прайшло з апошняй восені мінулага стагоддзя?
**3.** Ці былі ў вашым жыцці моманты, якія вельмі хочацца вярнуць, паўтарыць? Раскажыце аб іх.

## Ліпка

Іх прывезлі з далёкага лесу. Сваё ўбранне дрэўцы пакінулі там, дзе нарадзіліся, і цяпер без лісця ляжалі перад нашым домам.

Вечарам людзі прыйшлі з работы і адзін перад адным пачалі выбіраць лепшыя: большыя, раўнейшыя, купчастыя. Кожнаму хацелася пасадзіць перад сваім акном прыгажэйшае дрэўца.

Засталася адна танклявая ліпка з трошкі выгнутым ствалом, і ніхто не хацеў яе браць. Што сказала б яна, каб магла гаварыць?

«Тут было шмат маіх аднагодак, іх забралі ўжо. А мяне, крывенькую, колькі разоў падымалі, разглядалі з усіх бакоў і зноў клалі на зямлю. А хіба ж я вінавата, што вырасла такая?»

Ліпцы сапраўды не пашчасціла. Калі яна была яшчэ маленькая, бура паблізу вывернула тоўстую елку. Ліпка расла і хутка ўперлася вяршалінкай у вываранць. Яна схіліла свой



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

стан, хацела зірнуць, ці тоўстая елка, ды так і не ўбачыла. А як дацягнулася даверху, выпрастацца ўжо не змагла.

Потым прыйшлі маладыя хлопцы спілоўваць выварацень, і адзін з іх нават пашкадаваў дрэўца.

— Глядзі, як пакалечыла елка бедную ліпку, — казаў ён свайму сябру.

— Нічога, сонца выпрастае,— адказаў той. — Трэба толькі асцярожна спілаваць выварацень, каб не зламаць яе, кволенькую.

І людзі з добрым сэрцам не загубілі маладзенькае дрэўца.

Цяпер ліпцы было прасторна, і яна расла, дужэла.

Потым зноў прыйшлі людзі. На гэты раз з песнямі, з гоманам. Гэта былі школьнікі. Ліпка ніколі не здагадалася б, чаго яны прыйшлі, каб адзін з вучняў не сказаў:

— Выкапаем і гэтую. Няхай едзе ў горад.

— Крываватая трошкі, — пакруціў галавою другі. — Там знаеш як упрыгожваюць вуліцы!

— А чым яна вінавата? Хіба там людзі не ведаюць, што не ўвесь лес роўны? Выкапаем.

І першы хлапчук усадзіў рыдлёўку ў зямлю.

Ліпка злёгку зашапацела апошнімі пажоўклымі лісточкамі. Гэта яна шапнула школьніку: «Дзякуй за спагаду!» Але той, заняты працай, не пачуў шэпту.

І вось ліпка ў горадзе. Яе суседак людзі разабралі і пасадзілі, а яна — адна-адзінюткая — ляжыць на зямлі.

Туга апанавала дрэўца: «Няўжо людзям цяжка выкапаць ямку і пасадзіць мяне ў зямлю? Абы-дзе, калі лепшыя месцы аддалі лепшым».

Вярнуўся Віця са школы, убачыў пакінутую ліпку, падняў, пакруціў у руках, уздыхнуў і сказаў:

— Далі ганьбу табе, не хочуць у рад з роўнымі дрэўцамі садзіць. Я знайду табе месца.

Ён выкапаў ямку далей ад дома, дзе ўвесь дзень не бывае ценю. Пасадзіў дрэўца ўвагнутым бокам да сонца, каб лепей заплывала крывізна, і пажадаў:



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Расці купчастая ды вялікая!

І ўвесну ліпка першая зазелянела і першая напомніла людзям аб прыгожай пары года — вясне. *(Паводле Алеся Пальчэўскага)*

?!

**1.** Чаму ліпка вырасла крываватая? Якім быў яе лёс?

**2.** Як адносіліся да ліпкі розныя людзі?

**3.** Якая асноўная думка гэтага тэксту?

**4.** Як вы думаеце, якія рысы характару характэрныя для Віці?

**5.** Падзяліце тэкст на часткі па наступным плане.

1. Дрэўцы ў горадзе.
2. Лёс ліпкі.
3. Сустрэчы з людзьмі.
4. Дапамога Віці.
5. Удзячнасць ліпкі.

**6*.** Перакажыце тэкст па складзеным плане.

## Уладар пушчы

У той халодны лістападаўскі дзень сям'я зуброў не прыйшла на падкормку. Гэта вельмі ўстрывожыла даглядчыкаў.

— Што магло здарыцца? Чаму зубры аб'явілі галадоўку? — дзівіліся яны.

Нарэшце вырашылі паклікаць зуброў. І праз хвіліну далёка ў лесе пачуўся моцны голас старшага даглядчыка Сяргея Фёдаравіча.

— Оп, оп, оп!.. — клікаў ён і моцна стукаў у парожняе вядро.

Звычайна пасля такога запрашэння на абед у лесе адразу ж чуліся тупат, трэск, шум. Да кармушак з усяе сілы беглі зубры.

Але на гэты раз лес глуха маўчаў. Толькі часамі ў ельніку чуваць было, як выстукваў дзяцел ды ці220нькалі сініцы.

Мінула больш за гадзіну напружанага чакання, а зуброў усё не было.

Раптам пачуўся цяжкі тупат. На палянку выйшла чарада зуброў. Толькі чамусьці іх было мала. Наперадзе — важак Пум. У яго была высокая гарбатая спіна і дужы шырокі карак.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Зубры падышлі да кармушак, ухапілі трохі корму і заспяшаліся назад у лес.

Сяргей Фёдаравіч непрыкметна, пераходзячы ад аднаго куста да другога, назіркам пайшоў за зубрамі. Ён ведаў, што падыходзіць у лесе да зуброў небяспечна — могуць падняць на рогі. Ён зірнуў у той бок, дзе рэчка рабіла круты паварот і гублялася ў глухіх зарасніках. І застыў ад здзіўлення. На невялічкай палянцы, у кустах цесным колам стаялі зубры. Яны цягнуліся сваімі пысамі да маленькага зубраняці, з ноздраў іх валіла пара. Нованароджаны быў мышастай масці, пушысты, у завітках. Ён нясмела стаяў на тонкіх ножках. Зубры дыхалі на малога, баючыся, каб ён не змёрз.

Пум стаяў побач з зубранём, трос кудлатай галавой, адганяў тых, хто хацеў дакрануцца да малога.

Назаўтра раніцай зубры зноў спазніліся на падкормку. Сяргей Фёдаравіч заклапочана глядзеў у лес. Марозік пакусваў твар. «Як там зубраня?» — думаў ён.

У гэты час паказалася чарада лясных волатаў. Уперадзе ішоў Пум, за ім — маленькае зубраня. Маці асцярожна і ласкава падштурхоўвала яго. За малышом ішлі астатнія зубры.

— Вядуць, вядуць! — зарадаваўся Сяргей Фёдаравіч.

Прагаладаўшыся, чарада дружна накінулася на корм. Зубраня ўвесь час чаплялася да маці, штурхала сваім лобікам пад бок і перашкаджала есці.

Настаў студзень.

Снег сыпаў і сыпаў, даверху пазасыпаў кусты, замёў дарогі і сцежкі. Лес прыбраўся ў бель.

За гэты час зубраня падрасло, падужэла. Малыш змяніў мышастую поўсць на гладка-бурую, на спіне з’явілася гарбінка, на лбе прарэзаліся рожкі — надзейная і грозная зброя зуброў.

Пум пачаў вучыць малога гнуць дрэвы і здабываць сабе ежу. Стары зубр наваліцца ўсім целам на граб або рабіну, прыгне дрэва да зямлі. Трымае яго пад сабою, а зубраня ад’ядае галіны.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Зубраня было вельмі вясёлае, жвавае і любіла забаўляцца з Пумам. Стары зубр стаіць, як бурая скала, прыгнуўшы магутную шырокую шыю. А малы ўпіраецца ў яго шырокі лоб сваім вузенькім лобікам. Доўга яны дужаюцца. Калі малы заўзята пачынае наступаць, Пум адыходзіць, нібы паддаецца, і нарэшце кідаецца наўцёкі. Тады зубраня радасна бяжыць за ім, каб дагнаць.

Надышоў люты. Пабольшаў дзень. Палымнела на захадзе пурпуровая зара.

У зуброўніку рыхтаваліся да вячэры. Даглядчыкі накладалі ў кармушкі сена і вецце.

Цяпер зубры не пазніліся. Яны спяшаліся да кармушак. Малы чамусьці не хацеў падыходзіць да корму. Ён стаяў каля агароджы, фыркаў, у вачах было нешта затоенае і дзікае. Сяргей Фёдаравіч выйшаў з зуброўніка. Малы адразу наляцеў на яго і стукнуў ілбом так, што даглядчык распластаўся на снезе. Здавалася, зубраня адчула сябе пераможцам. Яно шалела ад радасці, бегала вакол кармушак. Сяргей Фёдаравіч паспрабаваў устаць. Зубраня зноў падбегла да яго і нагнула галаву для





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

новага ўдару. Тады Сяргей Фёдаравіч схапіў яго левай рукою за правую нагу крыху вышэй капыта. Правай рукой ухапіў за рожкі і зваліў на снег. Зубраня не чакала гэтага. Яно ўмомант усхапілася на пругкія ногі і здзіўлена пазірала на даглядчыка. Малое, відаць, адчула сілу і спрыт чалавека.

*(Паводле Язэпа Зазекі)*

**Ка́рак** — задняя (у жывёл — верхняя) частка шыі, якая пераходзіць у спіну.

**1.** Чаму зубры аднойчы спазніліся да кармушак?
**2.** Як дарослыя зубры клапаціліся аб нованароджаным зубраняці?
**3.** Як мяняліся паводзіны зуброў і зубраняці месяц за месяцам?
**4.** Падзяліце тэкст на часткі. Дайце назву кожнай з іх.
**5.** Прачытайце тэкст па частках і перакажыце спачатку кожную частку, а пасля ўвесь тэкст цалкам.

## Лістапад

Пэўна, сонца знемаглося,
адпачыць пайшло за хмары,
і паўзе павольна восень
праз іржышчы і папары.

І ад холаду рабіна
чырванее, нізка гнецца.
Паляцелі гусі клінам,
каб у выраі пагрэцца.

Сыплюць лісцікі бярозы,
стала ветрана і суха —
недалёка ўжо маразы,
люты вецер, завіруха.

*(Паводле Станіслава Шушкевіча)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Папа́р** — поле, пакінутае на адно лета незасеяным, каб палепшыць глебу пад пасеў азімых.

**1.** Знайдзіце словы і выразы, якія ў вершы ўжыты ў пераносным значэнні.
**2.** Які настрой гэтага верша?
**3.** Вывучыце верш на памяць.

## Снежань

Закружылі ў танцы сняжынкі
пад мелодыі сумных вятроў
паміж ціхіх і шэрых будынкаў,
па-над сонным спакоем двароў.
Упрыгожвае ўсё наваколле
зноў мяцеліца дзіўным святлом,
ды ёй хочацца болей раздолля —
ёй свабодней было б за сялом.
Але вішні яе не пускаюць
са свайго ў двары карагода.
І лятаюць сняжынкі, лятаюць
белапеннаю казкай прыроды.
Вось слупы апранулі вушанкі,
завязала хусцінку вярба.
А сняжок не спыняе гулянку,
не зважае, што ў ліпы журба:
на галінках яе раніцою
гасцявала вавёрка ў цішы.
— Заставайся, — прасіла, — са мною…
Ды кудысьці рыжуха спяшыць.
Стала крыўдна той ліпе і млосна,
што яе пакідаюць адну:
без сяброў такім чынам можна
у сумоце сустрэць і вясну.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Ды нядоўга яна бедавала
ў чаканні чарговых сяброў —
неўзабаве ад снегу хавала
ў дупле сваім трох снегіроў.
...А сняжынкі ўсё кружаць і кружаць,
у мяцеліцы стомы няма.
Закаваўшы ўчарашнія лужы,
правіць баль чараўніца-зіма.

*(Віктар Сабалеўскі)*

?! **1.** Якую з’яву прыроды апісвае паэт? Якія пачуцці выклікае першы снег, мяцеліца?

**2.** Чым гэты верш падобны да казкі? Хто ці што ў ім надзяляецца чалавечымі рысамі?

**3.** Чаму зіму называюць чараўніцай? Якія цуды яна здольная стварыць?

**4.** Раскажыце аб сваіх уражаннях ад надыходу зімы. Ці падабаецца вам, калі ідзе першы снег? Чаму?

## Першы снег

Апоўдні мароз памякчэў, а вечарам зусім пацяплела. Шэрае неба апусцілася да самых стрэх, імгла ахутала голыя кроны клёнаў. У прыцемках вецер на нейкую хвіліну затрымлівае дыханне. І з шэрай вышыні раптам пачынаюць падаць першыя сняжынкі. Здаецца, яны ўзнікаюць зусім невысока — рукой дастаць!..



Неўзабаве ўжо тысячы мяккіх пушынак ляцяць уніз. Снег апускаецца ціха, мякка, засцілае беллю лес, поле, будынкі фермаў і ўвесь свет.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Раптам падзьмуў моцны вецер, падхапіў, закружыў сняжынкі ў белы віхар, і за мігатліваю заслонаю ўжо не адрозніш — дзе зямля, дзе неба.

Мяцеліца... *(Юлій Ванаг)*

?!

**1.** Раскажыце, калі выпаў першы снег у гэтым годзе.

**2.** Якія ўражанні ў вас былі ад гэтай з'явы?

**3.** Разгледзьце малюнак. Раскажыце, як на ім адлюстраваны першы снег.

**4.** Узгадайце і назавіце чатыры прычыны, чаму прыемна, калі ідзе снег, і чатыры прычыны, чаму гэта непрыемна.

## Зіма

Гай маўчыць — лістоў няма,
даль азябла сіняя.
Зноў да нас прыйшла зіма
рупнай гаспадыняю.

Вымела без памяла
поле з першапуткамі.
Хустку з галавы зняла,
рунь малую ўхутала.

Суняла дачок-завей,
каб дарма не бегалі,
а вязалі, ды хутчэй,
рукавічкі белыя

для ялінак-немаўлят,
для хваінак тоненькіх.
У зімы работы шмат:
ходзіць, ходзіць гонямі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Рассцілае абрусы,
дорыць шапкі цёплыя...
Спяць азёры, спяць лясы,
спяць стагі на поплаве.

Спорыцца ўсё ў яе.
Неба распагодзіла.
Дзе парадку не стае,
дык ідзе ў абходзіны.

*(Паводле Рыгора Барадуліна)*

**Абхóдзіны, абхóд** — пэўны ўчастак лесу, які даглядаецца, абходзіцца адным леснікам. Тут ужыта ў пераносным сэнсе.

?!

**1.** Ці рады паэт зіме? Па чым гэта можна зразумець?
**2.** Знайдзіце словы і выразы, якія ў вершы ўжыты ў пераносным значэнні.
**3.** Чаму паэт называе зіму рупнай гаспадыняю? Які парадак наводзіць зіма?
**4.** Раскажыце, як мяняецца прырода зімой. Выкарыстайце словы з верша.
**5*.** Вывучыце верш на памяць.

## Ручай і ялінка

— Ялінка-ялінка,
пра што ты шапочаш?
Аб чым ты сумуеш,
сказаць нешта хочаш?

Дзень сёння пагожы,
снег выпаў так рана,
стаіш ты прыгожа
і светла прыбрана.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Я ўспомніла лета:
пад хвояй імглістай
на сонцы іскрыўся
ручай серабрысты.

Ён быў, як званочак,
адзіны ў лесе,
і днём і ўночы
спяваў сваю песню.

Ды песня замоўкла,
як сцюжа настала,
і ў лесе самотна
і холадна стала.

*(Вера Вярба)*

?! **1.** Які настрой гэтага верша? Аб чым успамінае і марыць ялінка?
**2.** Ці заўважылі вы, што гэты верш пабудаваны ў форме дыялогу?
**3.** Прачытайце верш па асобах. Перадайце з дапамогай інтанацыі пачуцці, якія выказвае ялінка.

## Галоўны дворнік

Завіруха,
завіруха!
Замяло дарогі пухам.
Цэлых дзве гадзіны
чысцяць снег машыны.
Я рыдлёўку ўзяў таксама
і працую разам з мамай.
Толькі нас не хоча слухаць
злая цётка-завіруха:
носіцца, і скача,
і сіпіць, і плача,



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

і калючкі снегу
кідае з разбегу.
І растуць сівыя горы,
не спраўляюцца шафёры.
Цэлых тры гадзіны
чысцяць снег машыны.
Вось на вуліцу раптоўна
выйшаў дворнік наш галоўны.
Расчасаў ён на хаду
агнявую бараду,
і надзеў фартух свой новы,
сшыты з воблакаў вясновых,
і пайшоў — снягам на страх —
па дарогах, па дварах.
Завіруха — цётка злая —
па задворках уцякае.
Я крычу:
— Працуй бясконца,
наш галоўны дворнік — сонца!

*(Эдзі Агняцвет)*

?! **1.** Каго называе хлопчык галоўным дворнікам? Паразважайце, чаму.

**2.** Ці любіце вы час, калі на двары мяце завіруха? Чаму?

**3*.** Апішыце надвор'е ў час завірухі.

## Пытанні і заданні да раздзела

1. Якія поры года апісваюцца ў гэтым раздзеле?
2. Якія творы гэтага раздзела апісваюць прыроду восенню?
3. Якія творы апісваюць прыроду зімой?
4. З якімі прыроднымі з'явамі вы пазнаёміліся дзякуючы творам гэтага раздзела?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**5.** Растлумачце значэнне народных выказванняў.

**Увосень — за стол просім.**

**Зімовы дзянёк што камароў насок.**

**6.** З якіх твораў наступныя радкі? Хто аўтары гэтых твораў?

*Заўтра нам у школу...*
*Развітацца трэба*
*з тымі, з кім гулялі*
*летняю парой...*

*Закружылі ў танцы сняжынкі*
*пад мелодыі сумных вятроў*
*паміж ціхіх і шэрых будынкаў,*
*па-над сонным спакоем двароў.*

*І ад холаду рабіна*
*чырванее, нізка гнецца.*
*Паляцелі гусі клінам,*
*каб у выраі пагрэцца.*

**7.** Адгадайце народныя загадкі пра з'явы, характэрныя для восені і зімы.

**Нітак многа, а ў клубок не зматаеш.**

**Усе паны паскідалі жупаны, толькі трое ў жупанах стаяць.**

*(Павуцінне; сасна, елка, піхта зімой)*

**8*.** Складзіце вусны малюнак — апісанне лістападу або снегападу, мяцеліцы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ПОДЗВІГ НАРОДА БЕССМЯРОТНЫ



## А хіба ёсць, што забываюць?

Ляжыць салдат ля пераправы,
каля маленькае ракі.
Ляжыць салдат
вялікай славы,
крывёй здабытай на вякі.

Шуміць над ім гушчар
зялёны,
плывуць аблокаў караблі.
Ён паў,
пазбавіўшы палону
вось гэты кут сваёй зямлі:

і лес ва ўзорах журавінных,
і луг з расянаю травой,
і тыя светлыя хаціны,
што сталі дружна над вадой.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

І сад, шумлівы напрадвесні,
і піянерскія кастры...

Ляжыць салдат
і чуе песні,
што не сціхаюць да зары.

Ляжыць і сніць ён аб народзе,
якому шчасце —
вольна жыць!
І рады ён, калі прыходзяць
хоць зрэдку з ім пагаварыць,
калі сцяжыначка малая
не зарастае да яго...

А хіба ёсць, што забываюць
выратавальніка свайго?

*(Пятрусь Броўка)*

?! **1.** Якая тэма гэтага верша? Што заключаецца ў назве верша: яго тэма ці асноўная думка?
**2.** Ці ёсць побач з вашай школай помнік воіну ці воінам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны? Ці даглядаеце вы яго?
**3.** Чаму, на вашу думку, нельга забыць пра тых, хто загінуў дзеля перамогі?
**4.** Як бы вы адказалі на пытанне, якое ёсць у вершы?

## Стары млын

— ...Хто табе сказаў, што з такой вышыні не відзён Слуцак?.. Я ж добра ведаю, што відзён. Нават калі ўзлезці вунь на той ганачак, адкуль ланцуг спускаецца, можна ўбачыць мураваныя дамы. А калі праехацца на крыле — не толькі Слуцак убачыш, а мо і Бабруйск. Петрык колькі разоў лятаў...

— Чаму ж ты не спытаў у Петрыка?..



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Дзеці сабраліся ля старога млына. Гэта было самае любімае месца іх гулянак. Вакол зялёны мурог, а крыху далей з усіх бакоў жыта, густое і высокае. Амаль у два разы вышэйшае нават за Антося, хоць ён у сваім гурце самы большы.

Тут добра гуляць у хованкі. Пад млынам можна схавацца за стаяк, прытуліцца дзе-небудзь за штандарамі. А то можна крокаў на пяць ад краю прылегчы і ў жыце.

Антось не вельмі любіць гуляць у хованкі, бо яго хутка знаходзілі. Дзе ён ні схаваецца, дык усё ногі тырчаць. Таму яго і завуць даўганогім. Затое калі дзеці пачнуць бегаць кругом млына навыперадкі, то ніхто Антося не апярэдзіць.

Побач з ім, але ўсё ж крыху паводдаль можна паставіць маленькага віхрастага Міколку. Гэты як схаваецца, гуляючы ў хованкі, дык ніхто яго не можа знайсці, пакуль сам не абзавецца. Ды і тады не адразу ўбачыш, дзе ён схаваўся.

Любяць дзеці сядзець пад млынам у час навальніцы. На млын налятае сярдзіты вецер, упіраецца ў крылы, свішча праз шчыліны і запарушвае пылам вочы. І скрыпяць, і жудасна стогнуць тады шмыгі, стаян проста аж ходырам ходзіць. Здаецца, што млын не вытрымае такога націску, узмахне крыламі, як чалавек рукамі, і бразнецца аб зямлю патыліцай. Тады робіцца крыху страшнавата пад млынам, але ж і цікава. Можна сабе ўявіць, што ты ляціш на самалёце над тайгой, над высокімі снежнымі гарамі. А можа, плывеш на караблі ў час шторму.

Потым дождж як зашуміць, як шугане на крыллі... Пыл адразу ападае, становіцца так прыемна і лёгка дыхаць...

А як толькі зноў выблісне сонца, хочацца тады пабегаць па мокрай траве ды па лужынах. Вада ў іх цёплая-цёплая, як у печы нагрэтая.

Каля млына магілка Петрыка. Пасля дажджу яна неяк прыгожа свяжэе. Ад мяты, што густым вяночкам расце на магілцы, ідзе прыемны пах.

Петрык — сын калгаснага млынара — быў блізкім прыяцелем Антося і Міколкі. Пры немцах ён часта хадзіў да свайго



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

бацькі ў партызанскі атрад — быў сувязным. Міколка і Антось сталі самымі лепшымі яго памочнікамі. Яны былі самымі лепшымі, а наогул Петрыку дапамагалі і другія. У яго быў свой сапраўдны атрад. І Петрык ведаў, хто на што больш здольны і што каму можна было даручыць. Антось шпарчэй за ўсіх бегае. То яму даваліся найбольш спешныя заданні: што-небудзь хутка перадаць у атрад, каго-небудзь папярэдзіць. А Міколка лепш за ўсіх умее хавацца. Таму на яго абавязку ляжала што-небудзь падглядзець, падслухаць, высачыць.

Пад млынам быў іх штаб. Тады яны збіраліся ля млына таксама нібы для гулянак. Гулялі ў хованкі, бегалі навыперадкі, але ўсё гэта рабілася больш для адводу вачэй. У кожнага з іх была важная справа: мімаходзь, як бы неўзаметку, яны атрымоўвалі ад Петрыка заданні. Дакладвалі, што паспелі зрабіць за мінулы дзень.

Аднаго разу Петрыку трэба было прасачыць, калі будзе ісці карны атрад у іх вёску са Слуцка. Петрык пільнаваў з самага ранку. На гэтую справу быў сабраны ўвесь яго атрад. А пад вечар, калі ўсе думалі, што немцы ў той дзень, можа, і зусім не паявяцца, прыбег з засады Міколка. І паведаміў, што за ўзгоркам паказаўся вораг.

Петрык хутка ўскочыў на ганак млына, але адтуль нічога не ўбачыў. Падняўся па ланцугу на самы верхні ганак, куды мяшкі цягаюць, — і адтуль не відно было. Тады ён узабраўся на страху. Стаў на ўвесь рост, прылажыў далонь да вачэй і пачаў глядзець у бок Слуцка. Туды, за ўзгорак, дзе Міколка заўважыў немцаў. Так Петрык прастаяў, можа, з хвіліну. Потым яго далонь раптам неяк здрыганулася, рыўком апусцілася да грудзей — хлопчык хістануўся і паляцеў дадолу...

У тую хвіліну, калі Антось і Міколка падбеглі да Петрыка, ён ледзь-ледзь дыхаў. Твар яго пасінеў, а з правага боку грудзей тонкім раўчуком цякла кроў. Спачатку ён ляжаў зусім нерухома, потым раптоўна здрыгануўся, замахаў рукамі. Мабыць, хацеў штосьці сказаць, ды не мог выдыхнуць. Тады, сабраўшы ўсе намаганні, ён прыпадняўся на левы локаць. Крануў Антося за руку і паказаў яму на лес.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Антось пабег што меў сілы...

Ноччу таго ж дня Петрык памёр. Стаяла тады ціхая летняя пагода, толькі слабы ветрык ледзь чутна пасвістваў у самым канцы верхняга крыла. З таго часу стары млын стаў падобны на велізарны помнік на магілцы Петрыка. Зялёны мурог ля млына стаў самым запаветным і дарагім месцам для дзяцей усёй вёскі.

Хлопцы прынеслі сюды вянкі з прыгожых палявых кветак і аблажылі імі ўсю магілку.

— Не пытаў жа ты ў Петрыка, — усё пярэчыў Міколка, — мо ён і не бачыў Слуцка.

— А вось я сам, — сказаў Антось і палез на млын.

Спачатку ён, як і некалі Петрык, узлез на нізшы ганак. Потым па ланцугу ўзабраўся на верхні, а адтуль — на страху млына. З вышыні Петрыкава магілка здалася Антосю маленькай, як птушынае гняздзечка. А далёка-далёка, аж там, адкуль узыходзіць сонца, і сапраўды быў відзён Слуцак.

*(Паводле Аляксея Кулакоўскага)*

**Стая́к (стая́н)** — вертыкальны брус, слуп і падобнае ў якім-небудзь збудаванні, прыстасаванні, што служыць для апоры або злучэння чаго-небудзь.

**Штандáра** — укапаная ў зямлю вялікая дубовая калода, на якую кладуцца ніжнія бярвёны драўлянага збудавання.

**Кáрны** — які мае сваёй мэтай караць каго-небудзь, прызначаны для пакарання.

**Запавéтны** — які асабліва цэніцца, старанна аберагаецца.

?!

**1.** У якія гульні гулялі хлопцы каля старога млына? Якія яшчэ гульні вы ведаеце?

**2.** Чым яны займаліся каля старога млына ў час вайны?

**3.** Раскажыце аб подзвігу Петрыка і яго сяброў у гады вайны.

**4.** Чаму стары млын стаў запаветным месцам для вясковых дзяцей?

**5.** Падзяліце тэкст на часткі па плане.

1. Гульні дзяцей каля млына.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

2. Каля млына ў час навальніцы.
3. Петрык і яго атрад.
4. Гібель Петрыка.
5. Запаветнае месца.

**6.** Перакажыце тэкст па частках.

## Голас вечнага хлопчыка

Я — з грознай былі,
я — з гнеўнай песні.
Я — хлопчык вечны,
я — ваш равеснік.
Мяне таксама
бацькі любілі,
але чужынцы
мяне забілі.
Ляцелі ў дыме,
ляцелі ў гуле
наперагонкі
са мною кулі.
Хоць бег я хутка —
аж дых займала,
усё-ткі куля
мяне дагнала...
Вам пакідаю
і ўзлёт, і песні
я, вечны хлопчык,
я, ваш равеснік.

*(Пятрусь Макаль)*

?!
**1.** Чаму верш мае такую назву?
**2.** Якія справы не паспеў зрабіць хлопчык?
**3.** Растлумачце значэнне апошніх чатырох радкоў верша.
**4.** Ці можна сказаць, што вечным хлопчыкам стаў і Петрык з апавядання «Стары млын»?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Буслы

Ідучы з лесу, Андрэйка з мамай адпачывалі ля сцірты саломы. Жмурачыся ад сонца, Андрэйка глядзеў у неба. Яму здавалася, што пад канец лета яно зрабілася незвычайна высокім. Усё адно як паднялося і стала шырэйшае і большае.

— Мама! — усклікнуў раптам хлопчык. — Глянь: журавы лётаюць! Вунь, над фермай.

Мама сумна сказала:

— Гэта не журавы, сынок, гэта буслы з суседніх вёсак. Кожны год, збіраючыся ў вырай, яны над нашай Клёнаўкай кружаць. А ў нас не жывуць...

— Чаму? — спытаў хлопчык. — Ім бы добра ў нас жылося.

— Некалі жылі, — сказала мама, — а цяпер не хочуць.

— А чаму?





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Пакрыўдзіліся. Яшчэ тады, калі я была такая, як ты цяпер.

У першы месяц вайны прыкацілі ў нашу вёску фашысты... Памятаю, як кароўку нашу забіралі, за курамі па двары ганяліся. Пазней гэтыя вылюдкі ўсё спалілі: і хаты, і сады, і дрэвы...

У нашым двары рос вялізны разгалісты дуб. На ім, колькі вёска стаяла, буслы сабе жытло рабілі. Дык вось. Вайна ідзе, а ў буслоў свой клопат: дзяцей гадаваць, каб да восені іхнія крылы дужымі сталі. І не заміналі ж нікому, а адзін фашыст прыцэліўся ды па буслу з аўтамата часануў... І забіў. Ляжыць бедны птах, дзюба ў пыле. Немцы сабраліся ля яго, гергечуць, смяюцца. Бусліха магла б уцячы, але як жа было ёй сваіх дзетак кінуць? Кружылася над гняздом, пакуль той самы ірад і па ёй не бабахнуў...

Забітая бусліха ляціць на зямлю акурат на немцаў з іх машынамі. І — ці паверыш? — спужаліся яны. Сыпанулі з дарогі да агароджы, прыціхлі нават. Ну а калі яны паехалі, мы, малыя, збегліся, паплакалі і пахавалі буслоў. А дзед твой злазіў на дрэва і дастаў з гнязда асірацелых буслянят. Мы іх да восені жабамі кармілі. Восенню яны паляцелі ад нас. Пэўна, расказалі ўсім буслам, што тут адбылося. І з таго часу не селяцца яны ў нашай вёсцы.

Мама ўздыхнула і паднялася з саломы:

— Ну, пойдзем, сынок.

Ішлі моўчкі. Андрэйка ўсё глядзеў у неба і думаў. Няўцям яму было, як гэта людзі маглі забіць такую прыгожую птушку... А буслы кружыліся, кружыліся...

І раптам усхвалявана і з радаснай надзеяй хлопчык спытаў:

— Мама, а мо, калі восень пройдзе і снег, і калі я падрасту і ў садзік не буду хадзіць... мо яны прыляцяць да нас? Я іх таксама карміць буду. Я жаб не баюся...

— Мо і прыляцяць, — уздыхнула мама.

— Няхай бы прыляцелі!

Неба з буслямі здавалася хлопчыку вельмі прыгожым, ласкавым і спакойным. *(Аляксей Дудараў)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Сці́рта** — вялікі стог сена, саломы, снапоў збожжа, прызначаны для захавання пад адкрытым небам.
**І́рад** — *тут*: мучыцель, кат.
**Няўця́м** — незразумела; не прыйшло ў галаву.

**1.** Чаму ў роднай вёсцы Андрэйкі не селяцца буслы?
**2.** Аб чым марыць Андрэйка?
**3.** Як вы думаеце, ці прыляцяць буслы калі-небудзь у вёску?
**4*.** Падрабязна перакажыце расказ маці аб тым, як загінулі буслы.

## Мяшок белага наліву

...Мяшок быў поўны — як завязаць. Вася зайшоў у зямлянку, знайшоў іголку, суравую нітку і зашыў яго. Такі ход прыдумаў ён сам, каб болей нікому не раздаваць яблыкаў. Ахвотнікі знойдуцца. Хай толькі дачуюцца...

Назаўтра была нядзеля. Сухарукі Кузьма Ахрэмчык, леспрамгасаўскі шафёр, разам з вясковымі кабетамі, якія везлі тое-сёе на рынак, пасадзіў у кузаў Васеву маці і яго самога.

— Што Іван піша? — спытаў ён пра бацьку.

— Ваюе, два тыдні пісьма няма. Можа, дзе галаву злажыў, — маці заплакала.

— У Польшчы бацька, — сказаў Вася. — У артылерыі.

Кабет шафёр высадзіў на местачковым рынку, а маці параіў там не злазіць — яблыкаў хапала. Паехалі на станцыю. Там таксама стаялі драўляныя рады, на іх бітоны з малаком, кучы салёных агуркоў, нейкія піражкі.

Яблыкі, каб доўга не стаяць, маці наважылася прадаць танна — два на рубель. Паспелі прадаць толькі адну невялікую кучку. На станцыі, якраз насупраць драўляных радоў, раптам спыніўся эшалон. І ў тую ж хвіліну з зялёных пасажырскіх вагонаў з завешанымі вокнамі пачалі выскокваць салдаты.

Усе, хто вылазіў з вагонаў, былі параненыя. Хто нёс руку на марлевай перавязі, у каго забінтавана галава. У некаторых салдат бінты праглядвалі з расхлістаных каўняроў гімнасцёрак.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Почём яблочки, мамаша? — спытаў малады чарнявы салдацік, у якога на галаве, паверх бінтоў, праступалі рудыя, крывавыя плямы.

Маці маўчала... Між тым збіралася чарга. Падбягалі новыя параненыя.

— А ў вас жа і такія ёсць, што хадзіць не могуць? — раптам спытала маці.

— Есть, мамаша. Есть всякие — сидячие, лежачие и даже висящие...

Матчын твар прасвятлеў.

— То бярыце на здароўе. І тым, што ў вагоне, занясіце...

Салдаты ўсё зразумелі. Смех, жарты раптам спыніліся. Бралі па два-тры яблыкі і маўкліва адыходзілі... Салдат было многа. Мяшок хутка апусцеў...

Ужо на станцыі трэці раз прагучаў званок, як з вагона выскачыў першы, чарнявы салдат з забінтаванай галавой.

— Ты в какой класс ходишь? — спытаў ён Васю.

— У пяты.

Вася сказаў амаль праўду. Да вайны ён скончыў толькі два класы, а цяпер пайшоў адразу ў чацвёрты. І хоць вучыўся мала, толькі два месяцы, настаўніца абяцала перавесці ў пяты клас...

— Так вот тебе наш подарок. Извини, брат, что бедный...

Салдат даў хлопцу ў рукі тоўсты, з цвёрдай вокладкай сшытак...

Вася зірнуў на маці, яе вочы неяк незвычайна свяціліся. Ён і сам быў рады, што не прадавалі гэтых яблыкаў.

*(Паводле Івана Навуменкі)*

**Суравáя** — грубая, нябеленая (пра тканіну).
**Кабéта** — замужняя жанчына.

**1.** Чаму Вася зашыў мяшок з яблыкамі?
**2.** Чаму маці аддала яблыкі салдатам? Хіба ёй не былі патрэбны грошы?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**3.** Што б вы зрабілі ў падобнай сітуацыі?
**4.** Ці здольны вы аддаць бескарысліва тое, што ў вас ёсць, камунебудзь іншаму? Ці былі ў вашым жыцці такія выпадкі? Раскажыце пра іх.
**5.** Падзяліце тэкст на часткі. Запішыце план.
**6.** Перакажыце тэкст па складзеным плане.

## Плошча Перамогі




І ў будны дзень, і ў радаснае свята
сюды, да плошчы, шмат дарог вядзе.
Тым, што загінулі ў баях, салдатам
народ вянкі да помніка кладзе…

Стаяць на варце каля абеліска
ялінкі, што сюды з лясоў прыйшлі…
Завецца плошчай Перамогі ў Мінску
мясціна дарагая на зямлі!

*(Анатоль Астрэйка)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! **1.** Што вы ведаеце пра плошчу Перамогі ў Мінску?
**2.** Ці ёсць у вашым горадзе ці вёсцы месца, куды нясуць кветкі і вянкі салдатам?
**3.** Вывучыце верш на памяць.

## Пытанні і заданні да раздзела

1. Якім падзеям прысвечаны творы гэтага раздзела?
2. Колькі гадоў прайшло, як скончылася Вялікая Айчынная вайна?
3. Чаму памяць аб ёй не праходзіць? Паразважайце.
4. Які твор з гэтага раздзела вас найбольш уразіў? Чаму?
5. Патлумачце значэнне прыказкі:

**Той герой, хто за Радзіму гарой.**

Каго з дзеючых асоб прачытаных твораў можна назваць героямі?

6. З якіх твораў наступныя радкі? Хто аўтары гэтых твораў?

*Усе, хто вылазіў з вагонаў, былі параненыя. Хто нёс руку на марлевай перавязі, у каго забінтавана галава. У некаторых салдат бінты праглядвалі з расхлістаных каўняроў гімнасцёрак.*

*Каля млына магілка Петрыка. Пасля дажджу яна неяк прыгожа свяжэе. Ад мяты, што густым вяночкам расце на магілцы, ідзе прыемны пах.*

*Шуміць над ім гушчар*
*зялёны,*
*плывуць аблокаў караблі.*
*Ён паў,*
*пазбавіўшы палону*
*вось гэты кут сваёй зямлі...*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# СЛАЎСЯ ДОБРЫМІ СПРАВАМІ



## Хлеб

Было гэта даўно. Адразу ж пасля вайны.

Маці прынесла аднекуль акрайчык хлеба. Доўга-доўга любавалася ім, паварочвала і так і гэтак, нюхала, разглядала. Нібыта не верыла вачам сваім, што на далоні ў яе ляжыць хлеб. Сапраўдны жытні хлеб. Спечаны з чыстай, без ніякае домесі, мукі, на подзе печы, на свежым дубовым лісці, прожылкі якога так прыгожа адбіліся на скарынцы. Потым яна нейк, як мне падалося, аж надта борзда і неахайна разламала акрайчык напалам. Адзін кавалак падала мне, а другі палажыла на стол, пад абрус.

— Гэта Толіку... Вернецца з лесу — то павячэрае...

Сама ж, узяўшы ў камешніку капаніцу, пайшла на гарод акопваць бульбу.

Я вельмі хацеў есці. І той кавалачак хлеба, што дала мне маці, з'еў, праглынуў мігам. І, вядома, ані не наеўся, толькі растравіў яшчэ больш голад. Хвілін колькі я не мог нідзе знайсці



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

месца. Чамусьці лазіў на печ, пад ложак, выбягаў на двор і зноў — каторы раз! — вяртаўся назад у хату. Потым усё ж не вытрымаў. Падсеў да стала, адгарнуў абрус. Узяў у сваю руку той кавалачак хлеба, што пакінула была маці Толіку, майму старэйшаму брату. Не есці ўзяў. Проста паглядзець. Палюбавацца хлебам, як любавалася раней маці. І тады раптам мне здалося, што маці мяне абдзяліла. Брату пакінула хлеба намнога больш, чым дала мне. Ад братавага кавалачка я адшчыпнуў крошачку. Толькі крошачку. Адну маленечкую, малюпасенькую крошачку. Укінуў яе ў рот. Пачаў жаваць. Калі пракаўтнуў жованае, не заўважыў, як пальцы мае самі адшчыпнулі яшчэ крошачку. Зноў маленечкую, малюпасенькую крошачку…

…Схамянуўся я тады, калі на маёй далоні асталася абшчыпаная з усіх бакоў скарыначка. Што я нарабіў? Што скажуць маці, брат, калі вернуцца дахаты?..

Хуценька-хуценька я палажыў скарыначку на стол, накрыў яе абрусам. Але спакуса з'есці хлеб увесь, каб і духу яго не было ў хаце, каб ім і не пахла нават, была вялікая. Такая неадольная, што я не выцерпеў — зноў падсеў да стала, узяў скарыначку ў рукі і ўкінуў яе ў рот…

Брат вярнуўся з лесу, як заўсёды, позна, на змярканні. Ён цэлы дзень абсякаў на леспрамгасаўскай дзялянцы сучча. Зарабляў грошы, каб было за што нашай сям'і жыць. Дома есці ў нас не было нічога, хоць вазьмі ды хату запалі. І спаць брат лёг у той вечар галодны. Ён доўга варочаўся на пасцелі, не засынаў. Няйнакш яму мроіўся той кавалачак хлеба, які пакідала яму маці і які з'еў я…

Ніхто — ні маці, ні Толік — ні ў чым мяне не папракнулі. Ні ў той вечар, ні пасля. Яны былі старэйшыя, я меншы, і яны мяне вельмі любілі, шкадавалі…

Але калі я цяпер успамінаю той вечар, калі брат лёг праз мяне спаць галодны, мне робіцца не па сабе. Здаецца, аддаў бы ўсё, каб толькі не было ў мяне такога ўспаміну. Каб як-небудзь пазбыцца, выкінуць яго са сваёй галавы. Лепей бы я быў тады



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

галодны, лепей бы я лёг спаць не еўшы! Хай бы не я, а брат з'еў мой хлеб!..

Ды не! Таго, што было, не вернеш, не пераробіш. І з памяці сваёй, як бы ні хацеў, не выкінеш. Не, не выкінеш!..

*(Паводле Барыса Сачанкі)*

?!

**1.** Ацаніце ўчынак хлопчыка.
**2.** Чаму ён з'еў братаў кавалачак хлеба?
**3.** Як вы думаеце, ці ела маці хоць частку гэтага кавалачка хлеба?
**4.** Ці дакаралі малога старэйшы брат і маці? Чаму?
**5.** Аб чым пісьменнік думае, шкадуе ўсё жыццё?
**6.** Ці былі ў вашым жыцці ўчынкі, за якія цяпер сорамна?
**7.** У якіх словах заключаецца асноўная думка гэтага апавядання?

***Апавяда́нне*** — невялікі твор, у якім расказваецца зазвычай пра нейкі адзін вызначальны выпадак (сітуацыю, падзею) з жыцця чалавека.

## Елачкі

Яшчэ зусім нядаўна не было нічога каля гэтай дарогі. Алесь добра памятае... Не было...

І раптам: што за яны? — кволыя, тоненькія, як варсінкі, дрэўцы густа-густа абсыпалі пульхную глебу прыдарожнага ўзгорачка. Адкуль яны?

— А вунь за балотцам яліны высокія бачыш? — пытае маці. — Гэта яны зерне сюды кінулі. Зерне і ўзышло...

— А нашто столькі?

— А каб ты ўзяў ды і рассадзіў сеянцы елачак усцяж дарогі. І паўз сцежкі дадому таксама. От будзе любата! Усе дзякуй скажуць.

Узрадаваўся Алесь такому занятку. Пабег дадому, узяў жалязняк. Накапаў паўз дарогі ямачак, а тады ўзяўся выкопваць сеянцы. Асцярожна падварушыць елачку з усіх бакоў, возьме разам з зямлёю на жалязняк і перанясе ў гатовую ямачку.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Роўненька потым абгорне елачку зямлёю, каб засыпаліся ўсе карэньчыкі. Каб лёгка было елачцы прыняцца на новым месцы.

Дужа стаміўся Алесь за сваім клопатам. Расчырванеўся, потам абліваецца, але працы не кідаў, пакуль да канца не дайшоў. Калі ж пасадзіў апошнюю елачку і азірнуўся — аж душа ад радасці зайшлася. Не пазнаць роднай дарогі і сцежкі. Быццам зялёны, з карункамі, паясочак працягнуўся ад лесу да самае іхняе хаты.

— А ці тое яшчэ будзе, як падрастуць, як вырастуць елачкі! — сказала мама.— Не налюбуешся!

— А мае елачкі таксама кінуць зерне на дарогу?

— Кінуць, кінуць, сынок. І чым вышэйшыя вырастуць елачкі, тым далей і зерне іхняе паляціць. Тым далей і краса па зямлі пойдзе.

Даслухаў Алесь маці і пабег дадому па вядро: хутчэй паліць елачкі. Каб вышэйшыя раслі! *(Кастусь Кірэенка)*

**Жалязня́к** — рыдлёўка, лапата.

?!

**1.** Якую добрую справу зрабіў хлопчык?
**2.** Ад якіх спраў, добрых ці дрэнных, ідзе краса па зямлі? А што на зямлі ад дрэнных спраў?
**3.** Перакажыце апавяданне.

## Ты хоць дрэва пасадзіў?..

Дзе дваццаць год таму назад
ляжаў дзірван акамянелы, —
расцвіў прыгожы, буйны сад,
паплыў удаль, як ветразь белы…

Нямала тут вясновых дзён
папрацавалі слаўна людзі,
каб кожнай яблыняю ён
усхваляваў нам сёння грудзі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Ён так святло сваё разліў,
глядзіш, нацешыцца няможна…
— А ты хоць дрэва пасадзіў? —
няхай сябе спытае кожны.

*(Пятрусь Броўка)*

?! **1.** Як вы адкажаце на пытанне, якое змешчана ў назве верша?
**2.** Дзе і калі вы садзілі дрэвы? Ці вялікія яны цяпер?
**3.** Навошта садзіць дрэвы? Патлумачце.
**4.** Вывучыце верш на памяць.

## Ягады

Ніна і Зіна — неразлучныя сяброўкі: куды адна, туды і другая. Яны аднагодкі. І ростам дзяўчынкі амаль аднолькавыя, хіба толькі Зіна крыху таўсцейшая. Апранаюцца яны таксама аднолькава. Напрыклад, Ніна пакажацца на вуліцы ў сіняй з гарошынкамі сукенцы. А неўзабаве і Зіна выбягае са свайго дома ў такім жа ўбранні. Нават коскі сяброўкі заплятаюць аднолькава. У Ніны яны светлыя, як шаўкавісты лён, а ў Зіны — чорныя.

Толькі вось характары ў дзяўчынак розныя. Памяркуйце самі.

Вёска Сасноўка, дзе жывуць Ніна і Зіна, знаходзіцца каля самага лесу. І неяк улетку сяброўкі дамовіліся схадзіць у суніцы. Узялі вядзерцы і падаліся на знаёмую палянку.

Спачатку дзяўчынкі рвалі ягады ў рот, а потым, калі наласаваліся ўволю, пачалі збіраць у вядзерцы.

Ніна хутка назбірала поўнае вядзерца ягад і кажа:

— Пара ўжо дадому ісці.

А Зіна адказвае:

— Як жа мне ісці дадому, калі ў мяне яшчэ і паўвядзерца няма?

— Давай я табе дапамагу, — прапанавала Ніна і пачала збіраць суніцы ў Зініна вядзерца.

Прайшло некалькі хвілін, Зіна і гаворыць Ніне:

— У мяне нешта галава забалела.

— І моцна?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Моцна. Мабыць, ад гарачыні…

Ніна глянула на Зіну і занепакоілася: твар у сяброўкі быў стомлены, сумны.

— Ну дык ідзі пасядзі крыху ў цяньку вунь пад той бярозкай, а я адна буду збіраць.

Неўзабаве вядзерца Зіны таксама было поўнае спелых сакавітых ягад, і дзяўчынкі разам пайшлі дадому.

Па дарозе Зіна адставала і ўсё скардзілася, што яна вельмі стамілася і што дужка вядзерца балюча рэжа ёй руку.

— Давай я паднясу і тваё, — сказала Ніна і ўзяла ў абедзве рукі па вядзерцы.

Ішлі дзяўчынкі не спяшаючыся. Недалёка ад вёскі Ніна спатыкнулася аб тоўсты корань і рассыпала ўсе ягады са свайго вядзерца.

— Дапамажы сабраць, — папрасіла яна сяброўку.

— Ты сама рассыпала, сама і збірай, — бойка адказала Зіна. Яна схапіла сваё вядзерца, поўнае спелых суніц, і хуценька пабегла дадому. *(Паводле Нічыпара Парукава)*





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?!
**1.** Якая з сяброваак вам спадабалася? Чаму?
**2.** Падрыхтуйце слоўны партрэт Зіны: апішыце яе знешнасць і характар.
**3.** А як выглядае Ніна ў параўнанні з Зінай?
**4.** Ацаніце ўчынкі абедзвюх дзяўчынак, апісаныя ў апавяданні. Хто з іх сапраўдная сяброўка?
**5.** Раскажыце, як дзяўчынкі збіралі ягады.
**6.** Якую назву можна даць той частцы апавядання, што паказана на малюнку?
**7.** Перакажыце гэтую частку апавядання.
**8.** Прачытайце апавяданне па асобах, інтанацыяй перадаючы характар дзяўчынак.

## Мама

Лёнькаў тата прывёў новую маму — прыгожую, з бліскучымі завушніцамі жанчыну.

— Гэта твая новая мама, — сказаў ён Лёньку. — Так і клікаць яе заўсёды будзеш.

Ды вось бяда — ніяк не можа Лёнька назваць яе «мамай»: не забыўся ён родную маці, якая год назад памерла. Нават, здаецца, помніць, як прыемна пахнуць яе густыя мяккія валасы.

— Хачу есці, — просіць Лёнька. І мачыха ставіць на стол талеркі.

— Задача нешта не выходзіць, — гаворыць Лёнька.

Новая маці перапыняе сваю працу, садзіцца каля хлопчыка і цярпліва вучыць яго, як лепей рашыць задачу.

Нічога не скажаш: добрая новая маці ў Лёнькі. Але мамай чамусьці ён назваць яе не можа.

Аднойчы пайшоў Лёнька з мачыхай у лес па грыбы. Зусім мала пахадзілі, а ўжо ў Лёнькавым кошыку і баравікі, і падасінавікі, і грузды паявіліся. Зверху хлопчык прыкрыў іх лісцем папараці, галінку з буйны́мі чырвонымі ягадамі рабіны паклаў. Азірнуўся, а мачыхі нідзе няма.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Гэй! — спалохана закрычаў Лёнька.

— Эй! — данеслася ў адказ.

Гэта рэха так адгукнулася — нібы знарок насміхалася з хлопчыка.

— Ого-го! — зноў падаў голас Лёнька.

— Го-го-о-о! — даляцела здалёк.

Заблішчалі слёзы на вачах у хлопчыка. Страшна падалося яму ў лесе: усюды гушчар, мясціны нейкія незнаёмыя.

— Мама! — у роспачы закрычаў Лёнька што было сілы.

— Чаго ты, маленькі? — пачулася праз момант у адказ. — Я тут. Не бойся.

З-за кустоў выйшла новая Лёнькава маці і моцна прытуліла да сябе бялявую галоўку сына. *(Міхась Даніленка)*

?!

**1.** Якая трагедыя адбылася ў жыцці Лёнькі год таму?
**2.** Чаму ён не мог назваць мамай мачыху?
**3.** Ці добра жанчына адносіцца да Лёнькі? Дакажыце прыкладамі з апавядання.
**4.** Якое здарэнне дапамагло Лёньку назваць мачыху мамай?
**5.** Як вы думаеце, ці добрыя адносіны будуць далей у Лёнькі і яго новай маці? Чаму?

## Упарты Стась

Кепскі нораў — горш прастуды…
Знаравіўся раптам Стась.
Клічуць есці — ён:
— Не буду!..
— Дык хоць з грушы долу злазь.
— Не жадаю долу лезці! —
І… уверх сукоў на пяць.
— Дык скажы: няўжо ж і есці
аж на грушу падаваць? —
ушчувае сына маці.
Просіць злезці меншы брацік.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Стась і вокам не міргне —
а мармыча «не» і «не».
Дзе ж такому хто ўнаровіць!
Дый навошта наравіць?
Лепш яго на ўласным слове
нам адразу падлавіць.
— Не адхопіш новай двойкі?
Не пачнеш у школе бойкі?
Не ўцячэш з урока спеваў?
Не палезеш больш на дрэва?
Не напішаш на сцяне?
Ён на ўсё адказваў «не!».
Дзіва стала з чалавекам —
не пазнаць былога «неку».
Ані двоек,
ані боек,
шыбы цэлыя ў акне,
сцены чысценькія…
Во як
памагло адмоўе «не».

*(Алесь Бачыла)*

?! **1.** Які характар меў Стась? Што значыць *наравісты*?
**2.** Як яго перавыхавалі? На чым падлавілі?
**3.** Прачытайце верш выразна па асобах.

## Пытанні і заданні да раздзела

**1.** Пра якія добрыя справы расказваецца ў гэтым раздзеле? Узгадайце творы і аўтараў.

**2.** У якіх творах расказваецца пра дрэнныя ўчынкі? Назавіце аўтараў гэтых твораў.

**3.** З якіх твораў наступныя радкі?

*Вёска Сасноўка, дзе жывуць Ніна і Зіна, знаходзіцца каля самага лесу. І неяк улетку сяброўкі дамовіліся схадзіць у суніцы.*

*Кепскі нораў — горш прастуды...*

*Брат вярнуўся з лесу, як заўсёды, позна, на змярканні. Ён цэлы дзень абсякаў на леспрамгасаўскай дзялянцы сучча. Зарабляў грошы, каб было за што нашай сям'і жыць.*

**4.** Растлумачце наступныя народныя выказванні.

**Пры сонейку цёпла, а пры мамцы добра.**

**Сам добры — людзі добрыя.**



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# СЛАВУТЫЯ ІМЁНЫ ЗЯМЛІ БЕЛАРУСКАЙ




**Беларусь**

*(урывак з паэмы)*

Зямля Беларусі, зялёныя долы!
З крыніц тваіх чыстых пад шумнай вярбой
зачэрпнулі думы Купала і Колас,
на кожнай сцяжынцы іх песня і голас
з тваёю журбою і ўцехай тваёй.

Пад гоманы бору, куванне зязюлі
злажыў Багдановіч тут яркі вянок…
І поле, і пушчы, і рэкі тут чулі,
як Цётка спявала, як марыў Бядуля,
як слёзы рассыпаў Мацей Бурачок.

*(Пятрусь Броўка)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! **1.** Якія славутыя людзі беларускай зямлі згадваюцца ў гэтым вершы?
**2.** Што вы ведаеце пра кожнага з іх?
**3.** Хто карыстаўся псеўданімам Мацей Бурачок?

***

**Францішак Багушэвіч (1840—1900) — беларускі грамадскі дзеяч, празаік, перакладчык, адзін з пачынальнікаў беларускай літаратуры. Карыстаўся псеўданімамі Мацей Бурачок, Сымон Рэўка з-пад Барысава. Найбольш вядомы зборнік яго твораў — «Дудка беларуская».**



***Псеўдані́м*** — несапраўднае, выдуманае прозвішча, якім аўтар падпісвае літаратурны твор.

## Тры яркія зоркі

Кожны, хто хоць калі-небудзь глядзеў на бязвоблачнае неба, упрыгожанае ў месячную ноч незлічонай колькасцю зорак, не мог не заўважыць, што некаторыя з іх свецяць ярчэй. Яны першымі загараюцца ад полымя вячэрняй заранкі, яны даўжэй мігцяць, аж пакуль не прачнецца сонца на світанку. З імі найчасцей размову вядзе чалавек у час душэўнага неспакою.

Так і ў жыцці. Так атрымалася і ў літаратуры, калі ў пачатку дваццатага стагоддзя з'явіліся ў друку імёны трох новых паэтаў, непаўторныя словы якіх загучалі мацней, праўдзівей, ярчэй. Гэта былі Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч.

Рознымі былі іх жыццёвыя шляхі.

Напрыклад, Максім Багдановіч нарадзіўся ў сям'і вучонага-этнографа ў горадзе Мінску, а жыў далёка за яго межамі. Але, знаёмячыся з беларускім фальклорам па запісах бацькі, ён многа



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

даведаўся аб жыцці, характары, мове землякоў. Максім настойліва вучыўся, быў сярод таварышаў лепшым знаўцам літаратуры, замежных моў. І паставіў перад сабою мэту авалодаць роднай мовай і ўзняць беларускую літаратуру да сусветнага ўзроўню.

Рэдка хто так любіў сваю старонку, спачуваў яе народу і верыў у яго вызваленне, як гэты юнак. «Беларусь, твой народ дачакаецца залацістага, яснага дня», — такімі былі прарочыя словы паэта пра вызваленне роднага краю. Хоць самому яму з-за цяжкай хваробы дажыць да гэтага імгнення не давялося. Імёны Купалы, Коласа, Багдановіча, быццам тры яркія зоркі, і сёння зіхацяць на літаратурным небасхіле Беларусі. *(Паводле Васіля Віткі)*

?! **1.** З чым параўноўвае творчасць знакамітых беларускіх паэтаў аўтар тэксту?
**2.** Успомніце творы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, з якімі вы знаёміліся раней.

## На доўгія вякі

Усе, хто блізка ведаў Купалу, ведаюць асаблівасці яго як чалавека і паэта.

Творчай лабараторыяй Купалы былі невычэрпныя скарбы песеннага слова народа, бязмежныя багацці народнай творчасці. Вось чаму творы паэта такія даступныя, даходлівыя для чытача, вось чаму іх так любіць народ. Вось чаму некаторыя з гэтых твораў непрыкметна для нас пераходзяць у скарбы народнай творчасці. І вяртаюцца да нас ужо ў выглядзе народных песень.



Творчасць Янкі Купалы — гэта алмазная грань беларускай паэзіі. Якімі раднымі, светлымі пачуццямі поўняцца шматлікія творы паэта, прысвечаныя



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

працоўным людзям, іх жыццю. Іх святам і будням, іх працы і змаганню, іх подзвігам, іх каханню.

Імя паэта неадлучна ад цэлай эпохі ў гісторыі народа, яно належыць стагоддзям. Янка Купала — адна з цудоўных вяршынь паэзіі і культуры беларускага народа. *(Паводле Міхася Лынькова)*

?!
**1.** Адкуль чэрпаў сваё натхненне Янка Купала, на думку аўтара тэксту?
**2.** Чаму творы Янкі Купалы любіць беларускі народ?
**3.** Якія творы Янкі Купалы вы вывучалі раней? Назавіце іх ці ўспомніце радкі з вершаў.

***

На шырокім, на далёкім
буйным полі
вырастаюць згодна кветкі
і гуголле.

Людзі рвуць і топчуць кветкі
без патолі,
а гуголь расце, не дбае,
у поўнай волі.

Ой, ці ж вам не ўцяміць, людзі,
ужо ніколі,
што не кветкі трэба рваці,
а гуголле?!

*(Янка Купала)*

**Гуго́лле** — пустазелле.
**Без пато́лі** — без супынку, не стамляючыся.
**Не дбаць** — не звяртаць увагі.
**Уця́міць** — зразумець, усвядоміць.

?!
**1.** Якая асноўная думка гэтага верша?
**2.** У прамым ці пераносным сэнсе тут гаворыцца пра кветкі і пустазелле? Што разумее паэт пад гуголлем?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Мароз

Іду я, сняжысты, усясільны,
па сцежках-пуцінах пустых,
і ночкай і днём безупынна
пільную абшараў сваіх.

Бязмежна, уладарна паную
пад сховаю пушчавых вех,
каронаю бор мне зялёны,
а тронам-пасадам бел-снег.

Палац мой — лес бу́йны, вячысты —
ірдзіцца брыльянтамі скрозь,
мне воўк і мядзведзь у паслугах,
мне служаць вавёрка і лось.

Як пухам, сняжком пасыпаю
і хвою, і елку, і клён;
хто ў госці ка мне забярэцца,
тулю тых, галублю іх сон.

І казкі шапчу ім аб шчасці,
і цемру зганяю з вачэй…
Хадзіце, хадзіце к Марозу!
Хадзіце ў госці хутчэй!

*(Паводле Янкі Купалы)*

?! **1.** Ці добра будзе, калі завітаеш да Мароза ў госці? Што стане з чалавекам?
**2.** Што значыць выраз *бел-снег*?
**3.** Ці падобны гэты верш да казкі? Абгрунтуйце сваё меркаванне.
**4.** Вывучыце першыя тры слупкі верша на памяць.
**5.** Назавіце сапраўднае імя і прозвішча Янкі Купалы. Калі не памятаеце, знайдзіце адказ у бібліятэцы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## У грыбах

*З дзяцінства Якуба Коласа*

### I



Раніцай, чуць толькі паказалася сонца, хлопцы пашыбавалі ў лес. Ішлі яны ўтрох — Алесь, Уладзік і Кастусь — паперадзе, пакінуўшы ззаду бацьку з дзядзькам Антосем. Тыя былі яшчэ далёка і на хаду абмяркоўвалі нейкія справы. Звярнуўшы з дарогі на лясную сцяжынку, хлопцы рассыпаліся па лесе, пачалі крычаць. Уладзік свіснуў у два пальцы, аж рэха адазвалася недзе ў гушчары.

— Вы што галёкаеце? — крыкнуў на іх бацька. Ён працаваў лесніком. Бацька не проста ішоў па грыбы, а адчуваў сябе на службе — рабіў абход лесу. У яго была такая прывычка: як увойдзе ў лес — пастаіць, пільна паслухае. Можа, дзе глуха стукае сякера, звініць піла або грукаціць воз? Нічога падазронага не чуваць. Толькі недзе раз-поразу дзяўбе дзяцел.

Прайшоўшы крыху глухой сцяжынкай, звярнулі направа, на пакрыты мохам і мяккім верасам грудок. Хлопцы першыя шуснулі ў гушчар. Там пад старымі елкамі быў паўзмрок і чуўся духмяны лясны водар, настоены на разагрэтай смале і прэлых іглiцах.

— Баравік! — весела крыкнуў Косцік, убачыўшы карычневую шапку, што прытаілася пад галінай елкі.

### II

У Кастуся ў лесе былі свае ўлюбёныя мясціны, куды ён часта бегаў адзін. Бывае, усхопіцца на досвітку, адрэжа скібку хлеба, кошык у рукі і — толькі яго бачылі! Садзяцца дзеці за стол снедаць, а Косціка няма.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Дзе ж Кастусь? Ідзі, Міхалінка, пакліч, — кажа маці старэйшай дачцэ.

Дзядзька Антось толькі ўсміхаецца ў вус:

— Ды ён ужо колькі гадзін як па лесе гойсае... Зараз зноў поўны кошык баравікоў прынясе...

А Косцік лёгкі на ўспамін. Калі не повен кошык, дык амаль даверху напоўнены. Усё адны баравікі і падасінавікі.

Неяк раз пайшоў ён раненька і прапаў. Сям'я ўся паснедала ўжо. Маці ўправілася каля печы. Сонца высока ўзнялося. Уладзік каровы прыгнаў з поля, а Косціка няма і няма.

— Можа, заблудзіўся дзе хлопец у лесе? — пачала непакоіцца маці.

А Косцік у той дзень натрапіў на вельмі грыбное месца. Куды ні ступі — баравікі! Ды якія! Адзін у адзін! Нагнешся адзін падымаць, а пад кустом цэлая сямейка. Чык, чык!.. Толькі шастае ножыкам. Вось яшчэ два, а вунь трэці! За якую гадзіну назбіраў поўны кошык, а грыбоў на гэтай мясцінцы было яшчэ многа. Прыйшлося вывернуць кошык, выкінуць старыя баравікі, паабразаць ножкі і пакінуць толькі шапкі. Праз хвілін дваццаць — зноў поўна ў кошыку! Патупаў Косцік дамоў. Ідзе нацянькі, хоча заглянуць яшчэ ў адну мясціну. На тым тыдні ён пакінуў там падрастаць некалькі маленькіх баравічкоў...

Хлопец разгарнуў кошыкам калючыя лапкі, зірнуў і за галаву схапіўся. Бацюхны! Уся зямля грыбамі ўкрыта, хоць касою касі! Што рабіць? Другі раз прыйсці? Не!

Косцік скінуў сарочку, завязаў каля каўняра — атрымалася торба. Давай укладваць... Вось было дома гаворкі і здзіўлення, калі ён прынёс столькі грыбоў! *(Паводле Сцяпана Александровіча)*

**Скі́бка, скі́ба** — луста хлеба.
**Го́йсаць** — мітусліва хадзіць, бегаць, раз'язджаць у розных напрамках (звычайна з пэўнай мэтай).
**Нацянькі́** — напрасткі, самай кароткай дарогай.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! **1.** Ці ведаеце вы, што Якуб Колас — гэта псеўданім, прыдуманае паэтам імя? А якое сапраўднае імя было ў Якуба Коласа?
**2.** Што вы даведаліся з апавядання пра дзяцінства Якуба Коласа?
**3.** Што яшчэ вы ведаеце пра гэтага славутага беларускага паэта?

## Мой родны кут...

Шмат цікавых кніжак стварыў Якуб Колас для дарослых і дзяцей.

А дзе ж той кут, які ўсім сэрцам любіў пясняр?

Шмат разоў праязджаў я праз Стоўбцы — горад на Брэсцкай шашы. Даўно ведаў пра Мікалаеўшчыну. Пра хутар Смольня, дзе «пазнаў прыгоствы, суладнасць і чары прыроды» наш славуты Якуб Колас. Ды вось аднойчы і завітаў у жаданую мясціну.

Перад асфальтаванай стужкай расступіўся малады хвойнік. У вокны машыны замахалі калматыя іглістыя галінкі. Вось яна, былая сядзіба Міцкевічаў. Дзве забудовы. У адной — музей, а другая — тая, дзе жыла дружная сям'я. Высокія разложыстыя ліпы. Іх пасадзіў Колас. Яны ў роздуме пакалыхваюць лісцем, нібы вітаюць гасцей словамі паэта: «Прывет вам, племя маладое!»

Музейная сядзіба — у вянку прывабнай зеляніны. А воддаль — задумлівы Нёман. У пазалоце пяску яго берагі.

У хаце Міцкевічаў усё кранае душу. Вось печ-ляжанка, дзе халоднымі зімовымі вечарамі збіраліся дзеці паслухаць байкі дзядзькі Антося. А во дзяжа, у якой маці рашчыняла хлеб, блінцы. Стол каля акна. Усю ноч прасядзелі за ім Якуб Колас і Янка Купала ў першую сваю сустрэчу. Моцнае іх сяброўства на доўгія гады пачыналася ў гэтай хаціне. Адну вечную песню склалі яны. Пра свой народ, пра родную Беларусь, пра любоў і адданасць сваёй мілай Айчыне.

Чароўная паэзія Коласа тут, у Мікалаеўшчыне, гучыць незвычайнай мелодыяй. Такое адчуванне, што паэт тут і сёння, і песцяць яго жаўруковыя спевы, ціхі плёскат нёманскіх хваль.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У кожнага з нас ёсць родны кут. Вучыцеся змалку любіць і шанаваць сваю вёску, горад, сваю зямлю так, як любілі Янка Купала і Якуб Колас. *(Паводле Уладзіміра Ліпскага)*

?! **1.** Аб чым вы даведаліся з гэтага тэксту?
**2.** Дзе родны кут Коласа, пра які ён склаў такія цудоўныя вершы?
**3.** У якіх радках тэксту заключаецца яго асноўная думка?

**Пазнаёмцеся з двума ўрыўкамі з вялікага твора Якуба Коласа — рамана з трох частак «На ростанях».**

## Сваімі рукамі

Вясна ўступіла ў сілу.

— Вось што, дзеці, — сказаў раз вучням настаўнік, — сёння па абедзе прыходзьце з рыдлёўкамі — будзем капаць ямкі, а заўтра цэлаю школаю пойдзем у лес, прынясём маладыя дрэўцы і абсадзім школу.

Дзеці адзін перад другім спяшаліся запэўніць настаўніка, што яны прынясуць рыдлёўкі. З вясёлым гоманам, як пчолкі з вулля, высыпалі яны са школы. Вуліца напоўнілася звонкімі, шчаслівымі галасамі.



Пасля абеду дзеці весела беглі з рыдлёўкамі ў школу і заяўлялі аб гэтым настаўніку, забягаючы да яго на кватэру. Нават маленькі Паўлік, самы меншы ў школе, горда нёс рыдлёўку, згінаючыся ад яе цяжару. Настаўнік прыйшоў у клас і павёў дзяцей на двор. Разам з вучнямі размеркавалі месцы для ямак. Настаўнік вызначыў работу сваім вучням, падзяліўшы іх на групкі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Потым ён сам выкапаў першую ямку, каб паказаць дзецям, якія трэба капаць ямкі.

Два старэйшыя вучні, якія рыхтаваліся да іспытаў, праз колькі часу прыйшлі і сказалі настаўніку, што ўсе ямкі выкапаны.

— Збярыцеся ў школу, я вам скажу колькі слоў і пушчу вас дамоў.

Вясёлы, дружны шум уварваўся ў школу, і звонкія дзіцячыя галасы напоўнілі ўвесь дом. Настаўнік увайшоў, пахваліў дзяцей за работу і сказаў ім:

— Заўтра ўжо кніг не прыносьце, а вазьміце колькі рыдлёвак і збярыцеся тут. Пойдзем у лес, накапаем дрэўцаў і пасадзім іх у ямкі, што вы сёння прыгатавалі. А цяпер ідзіце дамоў.

З вясёлым шумам ішлі заўтра дзеці ў лес са сваім настаўнікам, збіўшыся вакол яго цеснай грамадой.

Дзень быў ясны, цёплы.

Настаўнік спыніўся з вучнямі на сухім месцы ў лесе. Яны гаварылі аб тым, што бачылі перад сабой, і аб значэнні той справы, дзеля якой сюды прыйшлі.

Дзеці рассыпаліся па лесе і напоўнілі яго сваім крыкам і шчэбетам. Настаўнік доўга шукаў маладую грушку. Ён хацеў знайсці прыгожанькую грушку і пасадзіць яе на памяць аб сваёй працы ў школе.



І калі ён знайшоў маладое, моцнае і стройнае дрэўца, дык доўга і асцярожна капаўся каля яго. Акуратненька выкапаў разам з зямлёй. Сам нёс дадому і пасадзіў у куточку на школьным двары, дзе найбольш свяціла сонца. У гэты дзень два разы паліў вадою. Ён агарадзіў грушку высокімі коллямі, каб не патаптала і не паламала яе жывёла.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Кожны вучань старанна садзіў сваё дрэўца. На кожнае дрэва настаўнік назначыў вучняў і налажыў на іх догляд за саджанцамі.

— Ну а цяпер, дзеткі, ідзіце абедаць. Па абедзе збярыцеся і прынясіце свае кнігі.

Прыняўшы кнігі ад вучняў і пусціўшы іх на адпачынак, Лабановіч выйшаў на двор і абышоў пасаджаныя маладыя дрэвы. *(Паводле Якуба Коласа)*

?! **1.** Якую добрую справу зрабілі вучні перад летнімі канікуламі?
**2.** Як ставіўся настаўнік да вучняў? А яны да яго? Па чым гэта можна зразумець?

## *Шчаслівы грыбнік

Вандроўкі на хутар не дужа вабілі Лабановіча. Гэта быў непрыемны абавязак. Уся бяда ў тым, што вінаваты ён сам: хто прасіў яго хадзіць на гэтыя заняткі? Ды ўжо адступаць позна.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Узяўся за гуж, не кажы, што не дуж. Але былі і дадатныя бакі ў ягоных вандроўках: па дарозе добра абмяркоўваўся даклад. Думкі плылі лёгка і гладка. Многа трапных сказаў складвалася ў галаве. Часамі настаўнік нават прыпыняўся, даставаў з кішэні запісную кніжку, азіраўся, каб не было лішніх сведак, і запісваў дасціпныя выразы. Тады здавалася, што варта сесці за стол, і ўсё пацячэ на паперы так жа гладка і вольна, як цяклі яго думкі ў дарозе. На справе ж выходзіла іначай. Запісаныя дасканалыя сказы не маглі аднавіць той поўны і шырокі малюнак, што рысаваўся ў яго ўяўленні. Узятыя паасобку, яны выглядалі бездапаможна, як абшчыпаныя вераб'і.

Мімаволі прыгадваўся той чароўны замак, які ўявіўся аднойчы Лабановічу ў часе вандровак па ваколіцах Верханя. Варта было саступіць на некалькі крокаў з той пазіцыі, адкуль рысаваўся замак, каб ён распаўся, развеяўся, як дым. Траплялiся ў дарозе і іншыя прыемнасці. У канцы чэрвеня прайшлі шчодрыя летнія дажджы, а потым ізноў наладзілася надвор'е. Праходзячы ў цяньку пад бярозавымі прысадамі, насунуўся Лабановіч на ладнага баравіка. Узрадаваўся яму, як сябру свайго дзяцінства. Прыпыніўся і падрэзаў яго карэньчык каля самай зямлі. Стаў разглядацца — паблізу сядзелі яшчэ два баравікі, маладыя, здаровыя. Акуратненька адчысціўшы ад пяску, ён палажыў грыбы ў хустачку і з гэтымі трафеямі пайшоў далей.

Уперадзе каля самай дарогі стаяў лясок, пераважна бярозавы. Зрэдку пракідаліся і хвойкі, траплялiся елкі і нават кусты ядлоўцу. Лабановіч звярнуў з дарогі і пайшоў у лес. Ён з захапленнем заўзятага грыбніка стаў аглядаць найболей зручныя для баравікоў лясныя сховы. Не прайшоў ён і паўсотні крокаў, як раптам спыніўся, бы ўкопаны. Яму рэдка калі траплялася бачыць такое мноства баравікоў на зусім невялічкай лапінцы. Грыбы сядзелі дзе па адным, дзе парамі, а дзе і цэлымі гуртамі. А самае цікавае, што гэта былі не бярозавікі, жоўценькія, як яечкі, а чорнагаловыя. Самыя лепшыя баравікі, якія растуць толькі ў сасонніках.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Палюбаваўшыся баравікамі, Лабановіч не спяшаючыся прыступіў да збору. Ён прысядаў каля кожнага грыба, падразаў ножыкам карэньчык, саскрабаў пясок і рознае смецце, прыліплае да кораня. Грыбы ж былі маладыя, крэпкія, важкія, шапкі зверху чорныя, а спаднізу белыя, бы кужаль. Ну як не цешыцца з іх? Паднятыя і ачышчаныя баравікі шчаслівы грыбнік клаў на чыстае месца ў кучку. Іх набралася каля сотні. На гэтай лапінцы грыбоў болей не было, і на суседніх мясцінах не трапілася ніводнага. Кашá настаўнік не меў. Ён выразаў некалькі бярозавых пруткоў, звязаў іх тонкімі канцамі і нанізаў тры маністы грыбоў. З гэтым здабыткам і пайшоў на хутар. *(Паводле Якуба Коласа)*

**Ку́жаль** — валокны ачэсанага лёну, а таксама ніткі з іх.
**Мані́сты** — упрыгожанне з пацерак, манет, каштоўных камянёў, якое надзяваецца на шыю; *тут* — нізкі грыбоў.

**1.** Якое прыемнае здарэнне адбылося з Лабановічам па дарозе на хутар?
**2.** Знайдзіце ў тэксце прыказку. Якое значэнне яна мае? У сувязі з чым ужыў яе Лабановіч?



**Максім Багдановіч (1891—1917) — славуты беларускі паэт.**

**...Усяго дзесяць гадоў працягвалася творчая дзейнасць таленавітага сына беларускай зямлі. Крыўдна мала суджана было пажыць Багдановічу — ён памёр на дваццаць шостым годзе жыцця, напэўна, яшчэ на подступах да таго, што мы звычайна называем «росквітам творчых сіл». Але творам, якія ён паспеў падарыць народу, выпаў зайздросны лёс: яго неўміручымі радкамі ўсё больш захапляюцца вочы і сэрцы людскія. Імя паэта стала адным з самых дарагіх імёнаў у памяці ўдзячных нашчадкаў.** *(Паводле Ніла Гілевіча)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Слуцкія ткачыхі

Ад родных ніў, ад роднай хаты
ў панскі двор дзеля красы
яны, бяздольныя, узяты
ткаць залатыя паясы.

І цягам доўгія часіны,
дзявочыя забыўшы сны,
свае шырокія тканіны
на лад персідскі ткуць яны.



А за сцяной смяецца поле,
зіяе неба з-за акна, —
і думкі мкнуцца мімаволі
туды, дзе расцвіла вясна;

дзе блішча збожжа ў яснай далі,
сінеюць міла васількі,
халодным срэбрам ззяюць хвалі
між гор ліючайся ракі;

цямнее край зубчаты бору...
І тчэ, забыўшыся, рука,
заміж персідскага ўзору,
цвяток радзімы васілька.

*(Максім Багдановіч)*

?!
**1.** Які настрой гэтага верша — сумны ці вясёлы?
**2.** Аб чым мараць дзяўчаты за цяжкай працай?
**3.** Паслухайце песню, напісаную на словы гэтага верша.
**4.** Вывучыце верш на памяць. Навучыцеся спяваць песню.
**5*.** Раскажыце, што вы ведаеце пра слуцкія паясы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## На чужыне

Вакол мяне кветкі прыгожа красуюць.
Маркотна між іх я хаджу адзінок,
аж бачу — мне сіняй галоўкай ківае
наш родны, забыты ў цяні васілёк.
«Здароў будзь, зямляча!» Чуць бачны ў даліне,
панура, нявесела шэпча ён мне:
«Успамянем, мой дружа,
у багатай чужыне
аб беднай, далёкай сваёй старане».

*(Максім Багдановіч)*

?!
**1.** Аб чым сумуе паэт? Што нагадала яму аб радзіме?
**2.** Якія яшчэ сімвалы Беларусі вы ведаеце?
**3.** Чаму верш мае такую назву?



***Васіль Быкаў (1924—2003) — сусветна вядомы беларускі пісьменнік, народны пісьменнік Беларусі. Большасць яго твораў, пранізлівых, рэалістычных, часта трагічных, прысвечана вайне.**

**Прачытайце аўтарскі ўступ да аповесці «Альпійская балада».**

***

Гэта адбылося ў самым канцы вайны ў аўстрыйскіх Альпах. Туды ўжо ўладарна прыйшла апошняя ваенная вясна, і з ёю магутным патокам шыбавалі войскі двух нашых франтоў.

Аднойчы мы занялі нейкі гарадок і чакалі новай каманды. У кабіне «студэбекера» моцна прыгравала сонца, пасля бяссоннай ночы карцела драмаць, і я вылез на вуліцу. І тут каля адной



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

з дальніх машын на вочы мне трапіла дзяўчына. Шчупленькая, чорнавалосая, у паласатай куртцы і цёмнай спаднічцы. Яна перабірала вачыма твары байцоў у машыне і адмоўна круціла галавой. У машыне пачалося звычайнае ў такім выпадку ажыўленне. Штосьці там наперабой выкрыквалі байцы, але яна, пагасіўшы ўсмешку, пераходзіла да наступнай машыны.

— Таварыш, хто ест Іван?

— Іван? — ускочыў крайні баец. — Я Іван, вунь той Іван, і шафёр наш таксама Іван.

Поўны надзеі твар дзяўчыны паступова сумнеў, калі яна пераводзіла позірк з аднаго Івана на другога і з ціхім сумам казала:

— Но. То — нон Іван.

Штосьці зацікавіла мяне ў гэтых яе пошуках. Я пачакаў, пакуль яна, паўтараючы ўсё тое ж пытанне, абышла ўсю калону. Зразумела, Іванаў у нас было шмат, але ні адзін з іх не здаўся ёй тым, каго яна шукала. Тады мы з камандзірам трэцяй батарэі капітанам Коханам падышлі да дзяўчыны і спыталі, якога менавіта Івана яна шукае.

Дзяўчына спярша заплакала, але хутка спахапілася. Рукавом курткі выцерла цёмныя бліскучыя вочы. І, агледзеўшы нас выпрабавальным позіркам, страшэнна скажаючы рускія і нямецкія словы, густа перасыпаныя італьянскімі, расказала наступнае.

Яе завуць Джулія, яна італьянка з Неапаля. Год назад, летам сорак чацвёртага, калі саюзная авіяцыя бамбіла размешчаны ў Аўстрыі ваенны завод, яна ўцякла ў Альпы. Пасля адзінокага блукання ў гарах сустрэла рускага ваеннапалоннага, які таксама ўцёк з канцлагера, і яны пайшлі разам. Спачатку ён не хацеў браць яе з сабою, бо прабіраўся на Усход, бліжэй да фронту. Яна ж хацела на радзіму, у Італію, адкуль была вывезена і кінута ў нямецкі канцлагер. Некалькі дзён яны праблукалі ў гарах, перайшлі заснежаны горны хрыбет. І аднойчы ў туманную раніцу наткнуліся на паліцэйскую засаду. Яе схапілі і зноў кінулі ў лагер, а што здарылася з Іванам, яна не ведае. Але яна



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

вельмі спадзявалася, што ён быў шчаслівейшы. Што прабраўся на фронт і цяпер разам з Чырвонай Арміяй зноў прыйшоў у Аўстрыю.

Канешне, гэта было наіўна — спадзявацца сустрэць у вялікім патоку войскаў знаёмага. Мы, як маглі, суцешылі дзяўчыну і пабеглі да сваіх машын.

У той жа дзень пад вечар пачаўся зацяжны бой. Я амаль забыўся пра тую мімалётную франтавую сустрэчу. Успомніў пра яе толькі праз васямнаццаць год, калі заняўся літаратурай. І тады я напісаў усё тое, што вы прачыталі ў «Альпійскай баладзе». *(Паводле Васіля Быкава)*

**Шыбава́ць** — *разм.* хутка, жвава, імкліва рухацца, ісці.
**«Студэбе́кер»** — грузавы аўтамабіль амерыканскай вытворчасці.
**Карце́ць** — хацецца, не цярпецца.
**Канцла́гер** — канцэнтрацыйны лагер: месца ізаляцыі зняволеных і ваеннапалонных.

?!

**1.** Ці ўразіла вас гэта апавяданне? Чым?
**2.** Ці глядзелі вы фільм, зняты паводле аповесці Васіля Быкава «Альпійская балада»?
**3.** Папрасіце настаўніка коратка расказаць вам змест аповесці або фільма.



**Іван Шамякін (1921—2004) — народны пісьменнік Беларусі. Яго творчасць займае важнае месца ў сучаснай беларускай літаратуры. Многія яго творы прысвечаны ролі Вялікай Айчыннай вайны ў жыцці чалавека.**

**Прачытайце яго апавяданні, што падаюцца ніжэй.**



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Не крадзі

*З кнігі «Промні маленства»*

Прачнуўся і пачуў узбуджаныя галасы жанчын. Зноў здарылася штосьці незвычайнае? Што? Звесіўся з печы з-за коміна, каб лепш пачуць. Расказвала цётка Наталля. Ажно захліпалася ад хвалявання. Яна шапялявіла, і, калі гаварыла са злосці ці страху, нялёгка было разбіраць, пра што яна кажа.

Не, тут яна гаварыла выразна.

— А мамачка мая, сястрыца, якога страху я набралася! Думала — смерць мая прыйшла. Толькі я адчыніла дзверы ў хату цёткі Хадоскі, а ў печы як бабахне. Не іначай бомба. Галавешкі паляцелі на падлогу, добра, што вёдры з вадой стаялі — заліў дзядзька Кузьма, а то быў бы пажар. А Хадоска ў голас: «Ой, гаршчочкі мае!» А гаршкі ў печы — усе ў чарапкі, ніводнага цэлага...

— А божачка! Божачка! — войкалі бабуля і маці мая. — Што ж гэта такое? Можа, праўда бомба?

Дзядзька Трышка, накручваючы вяроўкі ад лапцей на анучы, засмяяўся і сказаў:

— Я знаю, што гэта такое.

Дзед Міначка — гарачы быў наш дзед — кінуўся да сына з аброццю ў руках.

— Зноў твая работа, кручаны? — У дзеда была такая лаянка — *кручаны, кручаная*. Слова гэтае, мабыць, замяняла словы «шалёны, вар'ят, апантаны, ашуканец, задзіра». Б'юцца хлопцы на вуліцы — дзед кажа: «Во кручаныя». Галосіць на вуліцы пакрыўджаная мужам жанчына — дзед асуджае: «Во кручаная! Людзей пасаромелася б».

Дзядзька Трышка, выхапіўшы ў дзеда аброць, сказаў цвёрда:

— Што ты, бацька? Хіба я зрабіў бы такое? Каб людзей забіла. Я знаю, хто гэта падстроіў. У каго Хадоска дровы крала.

А дровы кралі ў нашага суседа, што жыў праз дзве хаты, — у Мікіты Цяпкі, бязногага. На вайне яму нагу адарвала — і ён хадзіў на драўляшцы. Я шкадаваў Мікіту, але чамусьці баяўся



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

яго драўлянай нагі. Яна моцна грукала па падлозе ці па мёрзлай зямлі — як бы пагражала ўсім за крыўду, што ўчынілі яму людзі.

Мікіта ў нашай хаце скардзіўся, што нехта крадзе ў яго дровы. Жанчыны спачувалі чалавеку: нялёгка яму, бязногаму, пілаваць і секчы тыя дровы! Але, можа, я адзін пачуў, як Трышка параіў суседу:

— А ты правучы злыдня. Ты ж салдат.

Як правучыў — пра гэта са смехам расказвалі пасля здарэння. Пракруціў Мікіта ў палене дзірку і запхнуў туды патрон з порахам без кулі і шроту. Патрон і рвануў.

Суседзі смяяліся. А Хадоска, гаманкая і крыклівая кабета, маўчала. А каму паскардзішся? Пакарана за кражу. Не крадзі!

*(Паводле Івана Шамякіна)*

?! **1.** У які час адбываецца дзеянне ў апавяданні? Па чым вы гэта зразумелі?

**2.** Назавіце імёны ўдзельнікаў здарэння, якое апісваецца ў апавяданні.

**3.** Як была пакарана Хадоска? За што?

**4.** Якое слова ўжываў дзед Міначка ў значэнні «вар'ят, шалёны»?

**5.** Ці вядомы вам значэнні ўсіх іншых слоў у апавяданні? Тлумачэнне незнаёмых слоў знайдзіце ў слоўніку.

## Матчыны рукі

Даўно гэта было. Жылі ў вёсцы дзве сястры — Уліта і Марфа. Марфа пайшла замуж за раку, кіламетраў за дваццаць. І няроўны ў іх лёс быў… Уліта жыла бедна-бедна, але затое дзяцей у яе — поўная хата. А Марфа за багатым чалавекам раскашавала, але Бог не даў ёй ні аднаго дзіцяці… Гаравала яна ад гэтага, а пасля папрасіла ў старэйшай сястры, каб аддала ёй малодшую дзяўчынку. Тая ўжо дзявятая ў хаце была… Згадзілася Уліта, хацелася ёй шчасця для свайго дзіцяці. Узяла Марфа немаўля, каб яно нічога не разумела і не ведала і за маці яе лічыла… Ну, жыве дзіцятка, гаварыць пачало да цёткі «мама»



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

і больш ведаць нічога не ведае. Дзяўчынцы гады тры ўжо было, а можа, і чацвёрты ішоў. І прыйшла аднойчы Уліта на свята ў госці да сястры. Пагасціла два дзянёчкі, пацешылася са сваёй Ганначкі, дадому сабралася. Сястра пайшла яе правесці. Ну, і Ганначку з сабой узялі. Ідуць, размаўляюць. Змарылася малая. Марфа кажа ёй:

— Дай я цябе, дачушка, паднясу.

А яна ў адказ:

— Мамачка, няхай мяне цёця паднясе, у яе ручкі мякчэйшыя.

Пабялела Марфа, злосць апанавала яе: расціла два гады, песціла, і цяпер вось як — рукі ў яе цвёрдыя. А Уліта вось-вось заплача, слова не можа вымавіць.

Марфа злосна пытаецца:

— Дык, можа, ты і пойдзеш да цёці?

— Пайду, мамачка. Пусці мяне…

Не вытрымала Уліта, кінулася да Ганначкі, схапіла на рукі.

— Дачушка ты мая мілая, сонейка ты маё ненаглядлнае! Не крыўдуй, сястра… Не аддам я табе яе больш!

Вось яны якія, матчыны рукі! Мазолістыя, шурпатыя, а ўсё роўна — самыя мяккія. *(Паводле Івана Шамякіна)*

?!

**1.** Вызначце асноўную думку апавядання. У якіх словах яна заключаецца?

**2.** Складзіце план гэтага тэксту.

**3.** Перакажыце тэкст па плане.

**Наступныя творы вяртаюць нас у старажытную гісторыю Беларусі. Яны пра людзей, якія пакінулі свой след на беларускай зямлі. Дзякуючы ім Беларусь стала такой, якая яна сёння.**

## Князёўна з трыма імёнамі

Шмат што забылася на свеце, а сумны лёс князёўны Рагнеды застаўся ў народнай памяці, жыве ў паданнях. Вось адно з іх…



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Даўным-даўно ў полацкага князя Рагвалода нарадзілася дачка, якую назвалі Рагнедай. Калі князёўне споўнілася 14 гадоў, пасваталіся да яе два браты — кіеўскі князь Яраполк і наўгародскі князь Уладзімір. Браты між сабою варагавалі: малады Уладзімір не хацеў падначальвацца старэйшаму — Яраполку. Наспявала вайна. Браты разлічвалі, што князь Рагвалод дапаможа сваім войскам таму з іх, хто стане мужам яго дачкі. Рагнедзе спадабаўся Яраполк, а Уладзіміру яна са згоды бацькоў адмовіла. Сваты паехалі ў розныя бакі: адны з сумнай весткай у Ноўгарад, другія з радаснай — у Кіеў. Было гэта зімой 980 года. Рагнеда чакала лета, калі да яе, па звычаях таго часу, павінен быў прыехаць жаніх. Ды лёс вырашыў інакш...

Уладзімір сабраў вялікае войска і, як толькі сышоў снег, нечакана напаў на Полацк. Месяц цягнулася аблога горада. Палачане мужна абараняліся, але наўгародскае войска ўсё ж перамагло. Захопнікі ўварваліся ў горад, пачалі рабаваць двары, падпальваць хаты. Параненага князя Рагвалода, яго жонку і двух сыноў забілі. А Рагнеду Уладзімір сілай прымусіў стаць яго жонкай.

Пасля гэтага Уладзімір з войскам рушыў на Кіеў. Ён перамог у бітве брата Яраполка, загадаў забіць яго, а сам стаў князем кіеўскім. Там, у Кіеве, святкаваў ён свой шлюб з Рагнедай. Згодна са старадаўнім звычаем жанчына, калі выходзіла замуж, мяняла імя. Рагнеда назвалася Гарыславай у памяць аб тым, што згарэла слава Полацка. Пасялілі Гарыславу ў вёсачцы паблізу



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Кіева, куды часцяком наязджаў князь. Тут у яе нарадзіліся тры сыны і дзве дачкі. Але памяць пра бацьку, маці, братоў не давала спакою.

І Рагнеда вырашыла адпомсціць за родных. Аднае ночы падышла яна да ложка, дзе спаў Уладзімір, і ўдарыла яго нажом. Цэліла ў сэрца, ды прамахнулася. Князь ускочыў, схапіўся за меч і ў лютасці хацеў засекчы Рагнеду. Ды на шум выбег са свайго пакоя старэйшы сын Ізяслаў. Ён засланіў маці і сказаў: «Бацька, раней забі мяне!» Князь астыў, а назаўтра абвясціў: малодшых дзяцей Рагнеда не ўбачыць. Разам са старэйшым сынам паедзе пад Мінск, у невялікую крэпасць, якую ён дорыць Ізяславу. Адсюль і пайшла назва горада — Ізяслаў, Заслаўль, Заслаўе. Тады гэта быў глухі кут пасярод адвечнай пушчы, непраходных балот. Рагнеда і Ізяслаў правялі тут год.

Уладзімір тым часам прыняў новую рэлігію — хрысціянства — і распачаў хрышчэнне па ўсіх гарадах. Пасланае ім войска прыйшло і ў Заслаўе. У Рагнеды адабралі сына, а яе сілай пастрыглі ў манашкі і пад іменем Анастасіі зачынілі ў чорнай келлі. Цэлых дванаццаць гадоў пакутавала былая княгіня ў няволі. Нарэшце Ізяслаў, які ўжо быў князем полацкім, захацеў вызваліць маці. І раптам, амаль у адзін дзень, Рагнеда памерла ў Заслаўі, а Ізяслаў — у Полацку.

Сёння ўсе, хто наведвае Заслаўе, прыходзяць да кургана Рагнеды. Людзі аддаюць пашану памяці полацкай князёўне-пакутніцы, якая пражыла за свой кароткі век тры жыцці пад трыма іменамі. *(Паводле Кастуся Тарасава)*

?!

**1.** Раскажыце, што вы даведаліся пра Рагвалода і Рагнеду.
**2.** Чаму аб іх памятаюць да нашага часу?
**3.** Які горад узнік дзякуючы сыну Рагнеды? Дзе ён знаходзіцца?
**4.** Якія тры жыцці пражыла Рагнеда?
**5.** Раскажыце аб кожным з іх.
**6.** Ці шчаслівы быў яе лёс?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Усяслаў Чарадзей

Усяслаў Полацкі — адзін з самых знакамітых полацкіх князёў. Ён заняў полацкі прастол пасля смерці свайго бацькі, Брачыслава Полацкага. Усяслаў быў унукам Ізяслава, старэйшага брата Яраслава Мудрага. Калі памёр Яраслаў Мудры, да ўлады прыйшлі яго сыны. Аднак выявілася, што на кіеўскі прастол маюць больш правоў нашчадкі Ізяслава.

Але Усяслаў не думаў пра тое, каб перабрацца ў Кіеў. Ён хацеў узвысіць і ўмацаваць Полацк, каб надаць яму большую значнасць сярод галоўных гарадоў таго часу. Князь загадаў пабудаваць у Полацку Сафійскі сабор, бо такія ўжо былі ўзведзены ў Кіеве і ў Ноўгарадзе. Усяслаў набраў дружыну і доўгі час рыхтаваўся да барацьбы з сынамі Яраслава Мудрага. Гэтую барацьбу ён пачаў з нападу на Пскоў. Не здолеўшы ўзяць яго, Усяслаў нечакана пайшоў на Ноўгарад. Ноўгарад не вытрымаў удару, і войскі полацкага князя захапілі яго. Сучаснікі называлі Усяслава чарадзеем. Яны лічылі, што ён мог абарачацца ў ваўка і з’яўляцца то каля сцен Ноўгарада, то каля Кіева.



Сыны Яраслава павялі свае дружыны супраць Усяслава. Войскі сустрэліся на рацэ Нямізе.

Сілы сыноў Яраслава аказаліся мацнейшыя, і Усяслаў адышоў да Дняпра. Тады кіеўскія князі запрасілі яго на перагаворы. «Прыйдзі да нас, не зробім табе ніякага зла», — сказалі яны, пакланіліся і пацалавалі крыж.

Усяслаў паверыў, пераплыў на лодцы Дняпро і прыйшоў у шацёр да сыноў Яраслава. Кіеўскія князі схапілі яго, адвезлі ў Кіеў і пасадзілі ў цямніцу.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Летапісец піша, што Бог пакараў сыноў Яраслава за гэтую здраду — наслаў на іх грозных качэўнікаў-полаўцаў. У бітве з кіеўскай дружынай качэўнікі ўшчэнт разбілі сыноў Яраслава, і давялося ім зачыніцца ў Кіеве.

Жыхары Кіева, зняважаныя паражэннем сваіх князёў, запатрабавалі ад іх зброю. Яны хацелі самі прагнаць качэўнікаў, якія рабавалі наваколлі Кіева. Але князі пабаяліся ўзбройваць народ. Тады натоўп гараджан кінуўся да княжацкага палаца. Князі ўцяклі з Кіева. Кіяўляне вызвалілі Усяслава і, па словах летапісца, праславілі яго сярод княжацкага двара — абралі вялікім князем.

Сем месяцаў Усяслаў Чарадзей княжыў у Кіеве. Ён прагнаў полаўцаў, зрабіў некалькі пераможных паходаў. Упершыню пад уладай полацкага князя апынуліся славянскія землі ад Ноўгарада і Полацка да берагоў Чорнага мора і горада Тмутаракань на яго ўзбярэжжы.

Але Усяслаў добра разумеў, што гэта былі вельмі ненадзейныя і нетрывалыя ўладанні. Старэйшы сын Яраслава, які збег з Кіева, з дапамогаю свайго цесця — польскага караля — рушыў на Кіеў. Тады Усяслаў вярнуўся ў Полацк. Старэйшы сын Яраслава аднавіў сваю ўладу ў Кіеве, аблажыў і ўзяў Полацк. Усяслаў Чарадзей праз нейкі час адбіў сваю сталіцу. Увесь час, пакуль ён княжыў у Полацку, кіеўскія князі спрабавалі перамагчы яго. Але гэта не ўдалося ні сынам Яраслава, ні Уладзіміру Манамаху, які авалодаў кіеўскім прастолам пасля. Усяслаў Чарадзей адстаяў і горад, і незалежнасць Полацкай зямлі — так у той час называлі беларускую зямлю. (*Паводле Уладзіміра Бутрамеева*)

?!

**1.** Чаму Усяслава называлі Чарадзеем?
**2.** Чым ён праславіўся?
**3.** Што значыў у той час звычай цалавання крыжа? Ці стрымалі дадзеную на крыжы клятву кіеўскія князі?
**4.** Перакажыце ўрывак з тэксту, які вам найбольш запомніўся ці найбольш вас уразіў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Крыж-святыня

У кожнага народа ёсць святыні, якімі мудрыя прашчуры даражылі мацней за жыццё. Яны, нібыта нязгасныя паходні, асвятляюць шляхі іх нашчадкам. Для беларусаў такой святыняй з'яўляецца крыж Ефрасінні Полацкай.

Нарадзілася святая апякунка і першаасветніца нашага народа ў сям'і полацкага князя Святаслава-Георгія, малодшага сына Усяслава Чарадзея.

Унучку Чарадзея назвалі Прадславай. Пра далейшы лёс маладой князёўны апавядаецца ў яе «Жыціі» — выдатным помніку старажытнабеларускай літаратуры:

«Так любіла вучэнне яна, што дзівіўся бацька яе з любові такой да навук. І па ўсіх гарадах разышлася слава пра яе мудрасць і добрыя здольнасці да навук. Яна была надта прыгожая абліччам. Хараство ж яе многіх слаўных князёў прыводзіла да бацькі яе: хацеў кожны з іх заручыць яе сыну свайму...»

Аднак Прадслава выбрала для сябе іншую жыццёвую сцяжыну. Яна прыйшла ў манастыр, дзе пастрыглася ў манашкі пад імем Ефрасінні. І ўсё сваё жыццё прысвяціла служэнню Богу і людзям. Перапісвала ўласнаручна кнігі і будавала ў родным краі храмы, вучыла грамаце дзяцей і лячыла хворых.



Менавіта на заказ Ефрасінні мясцовы майстар-залатар Лазар Богша зрабіў надзвычай прыгожы шасціканцовы крыж. Паданне сведчыць: крыж свяціўся ў самай непрагляднай цемры, хворым вяртаў здароўе, знявераным і знясіленым — надзею на лепшае жыццё. Многія хацелі ўбачыць гэты цуд на свае вочы і пакланіцца яму. Таму ў горад над Заходняй Дзвіной зблізку і здалёку прыходзілі вернікі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У даўжыню крыж меў 51 сантыметр. Да драўлянай асновы на пярэднім і адваротным баках былі прымацаваны залатыя пласцінкі, каштоўныя камяні. А яшчэ — намаляваныя на шкельцах-эмалях выявы святых царквы. Акрамя таго, крыж аздаблялі пазалочаныя срэбныя пласцінкі з надпісамі. У першым надпісе гаварылася аб бясцэннасці драўлянага крыжа і калі ён быў зроблены.



А бясцэнным ён лічыўся таму, што ў ім знаходзілася часцінка ад драўлянага крыжа, на якім распялі Ісуса Хрыста.

Наступны надпіс засведчыў, хто зрабіў крыж.

Акрамя гэтых двух надпісаў майстар пакінуў праклёны зладзеям-рабаўнікам, якія адважацца ўкрасці ці сілаю забраць полацкую святыню. Лазар Богша быццам наперад бачыў: шмат разоў крыж па нядобрай волі пакідаў сцены Спасаўскай царквы. Але ён заўсёды вяртаўся ў родны Полацк.

Перад Другой сусветнай вайною крыж знаходзіўся ў Магілёўскім музеі. Але потым, у час ваеннай віхуры, кудысьці знік.

І дагэтуль невядома, дзе знаходзіцца народная святыня. Аднак абавязкова настане дзень, калі крыж Ефрасінні Полацкай вернецца на Беларусь. І зноў ён будзе мацаваць нашу веру ў будучыню, асвятляць нам шлях да людскасці і хараства. *(Паводле Уладзіміра Ягоўдзіка)*

**Пра́шчур** — далёкі продак, родапачынальнік.
**Пахо́дня** — *даўней*: пераносная свяцільня ў выглядзе наматанага на канец палкі прасмоленага пакулля.
**Залата́р** — той, хто рабіў вырабы з золата.
**Ве́рнік** — той, хто верыць у існаванне Бога, рэлігійны чалавек.

?!
**1.** Хто такая Ефрасіння Полацкая?
**2.** Кім яна даводзілася Усяславу Чарадзею?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**3.** Якой яна была ў дзяцінстве? Знайдзіце адказ у тэксце.
**4.** Які жыццёвы шлях абрала Прадслава? Ці ведаеце вы, у якім узросце яна вырашыла пайсці ў манастыр?
**5.** Чым праславілася Ефрасіння Полацкая?
**6.** Што вы даведаліся аб крыжы Ефрасінні Полацкай? Хто яго зрабіў?
**7.** Апішыце гэты крыж.
**8.** Зараз сучасным майстрам выканана копія крыжа Ефрасінні Полацкай. Што вы аб гэтым ведаеце? Дзе яна захоўваецца?



**Іван Іванавіч Насовіч (1788—1877) — беларускі мовазнавец, фалькларыст і этнограф.**

**Шмат гадоў аддаў вывучэнню беларускіх прыказак і прымавак, загадак, песень, склаў слоўнік беларускай мовы.**

## Збіральнік скарбаў

Даўно, яшчэ ў дзевятнаццатым стагоддзі, хадзіў па нашай зямлі вандроўнік. Ад вёскі да вёскі, з хаты ў хату. Старыя людзі расказвалі яму казкі і легенды, спявалі песні, прыгадвалі прыказкі і прымаўкі. А ён уважліва слухаў і запісваў — радок да радка, слова да слова. Хто ж ён быў, гэты збіральнік моўных скарбаў? Іван Іванавіч Насовіч. Нарадзіўся ў вёсцы Гразівец Чавускага раёна. Працаваў настаўнікам, інспектарам школ. А калі выйшаў у адстаўку, заняўся навуковай працай. Сын Насовіча ў сваіх успамінах пісаў: «Бацька мой не шкадаваў ніякіх сродкаў, ездзіў у розныя беларускія мясцовасці, якія цікавілі



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

яго. З маленства жывучы сярод вясковага люду, добра ведаў як гаворку беларусаў, так і мноства іх песень, прыказак, прымавак... Заўсёды насіў пры сабе сшытак. Туды адразу ж заносіў кожнае новае для яго слова, якое траплялася яму ў гутарцы з простым чалавекам...»

Колькі паэзіі, чалавечай мудрасці і дасціпнасці сабрана ў яго зборніках «Беларускія прыказкі і прымаўкі», «Беларускія прыказкі і загадкі», «Беларускія песні»!

Шаснаццаць гадоў працаваў Іван Іванавіч Насовіч над тлумачальным «Слоўнікам беларускай мовы». У гэты слоўнік увайшло больш за 30 тысяч слоў, запісаных аўтарам у розных кутках Беларусі. Для тлумачэння слоў Насовіч часта прыводзіў прыказкі і прымаўкі, раскрываючы такім чынам іх змест.

Больш за два стагоддзі мінула з таго часу, як нарадзіўся наш славуты зямляк. Імя яго жыве ў нашай памяці, у нашых удзячных сэрцах. *(Паводле Міколы Маляўкі)*

**Дасці́пнасць** — кемлівасць, знаходлівасць.

?!
**1.** Чым вядомы Іван Іванавіч Насовіч?
**2.** Якія скарбы ён збіраў? Чаму гэта скарбы?
**3.** Якія працы Насовіча ўпамінаюцца ў тэксце?

***Фальклóр*** — вуснапаэтычная народная творчасць.
***Этнагра́фія*** — навука, якая вывучае матэрыяльную і духоўную культуру народа.

## Пытанні і заданні да раздзела

1. З якімі асобамі з беларускай гісторыі і літаратуры вы пазнаёміліся ў творах гэтага раздзела?
2. Назавіце славутых людзей і раскажыце двума-трыма сказамі, чым яны вядомыя.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**3.** Прачытайце імёны і прозвішчы пісьменнікаў і назвы іх твораў ці зборнікаў твораў. Хто з'яўляецца аўтарам якіх твораў, зборнікаў?

| | |
|---|---|
| Якуб Колас | «Дудка беларуская» |
| Янка Купала | «Альпійская балада» |
| Францішак Багушэвіч | «Промні маленства» |
| Васіль Быкаў | «На ростанях» |
| Іван Шамякін | «Мароз» |

**4.** Пра каго наступныя выказванні?

*Колькі паэзіі, чалавечай мудрасці і дасціпнасці сабрана ў яго зборніках «Беларускія прыказкі і прымаўкі», «Беларускія прыказкі і загадкі», «Беларускія песні»!*

*Так любіла вучэнне яна, што дзівіўся бацька яе з любові такой да навук. І па ўсіх гарадах разышлася слава пра яе мудрасць...*

*Ён прагнаў полаўцаў, зрабіў некалькі пераможных паходаў. Упершыню пад уладай полацкага князя апынуліся славянскія землі ад Ноўгарада і Полацка да берагоў Чорнага мора і горада Тмутаракань па яго ўзбярэжжы.*

**5.** Хто аўтары наступных паэтычных радкоў? *Назавіце іх сапраўдныя імёны і прозвішчы.

*Талька — слаўная рачулка,*
*грунт яе пясчаны,*
*бераг мяккі і не мулкі,*
*дзірваном засланы.*

*Як пухам, сняжком пасыпаю*
*і хвою, і елку, і клён;*
*хто ў госці ка мне забярэцца,*
*тулю тых, галублю іх сон.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ЧАРОЎНАЯ КРАІНА КАЗАК



***Ка́зка*** — займальны па сюжэце фальклорны ці літаратурны твор пра неймаверныя ці фантастычныя прыгоды. **Казкі народныя** паводле свайго зместу дзеляцца на *героіка-фантастычныя, сацыяльна-бытавыя* і *казкі пра жывёл*. Пісьменнікі нярэдка апрацоўваюць народныя казкі або на ўзор народных пішуць свае **літаратурныя казкі.** Паэты часам вершаванай мовай перадаюць вядомыя казачныя сюжэты або ствараюць уласныя **вершаваныя казкі.**






Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Буслы

Здарылася гэта яшчэ ў той час, калі буслы ў наш край рэдка прыляталі. І ногі ў іх тады былі не чырвоныя, як цяпер, а белыя.

Аднаго разу вясной прыляцелі яны ў нашу пушчу. Селі на сухую верхавіну высокай сасны, што расла на ўзлессі.

— Вось тут і зробім сабе гняздо, — сказаў бусел. — Тут рэчка блізка, балота побач, вужоў і жаб многа, будзе нам і нашым дзецям спажывы даволі.

І пачалі буслы насіць на дрэва сухое ламачча, мох, сталі будаваць сабе дамоўку.

А трэба сказаць, што вясна таго году была няўдалая: то сонца прыпячэ, то снег пойдзе, то мароз ударыць.

Прачнуліся аднойчы бусел з буслiхай на досвітку, а вакол усё снегам пакрыта. Паляцелі яны на балота, хацелі спажыву сабе здабыць, але нічога не знайшлі. Усё замерзла, заледзянела. Памарозілі буслы свае босыя ногі і вярнуліся назад.

А тут новая бяда! Вецер разбурыў і раскідаў гняздо.

Селі птушкі на сасне і зажурыліся.

— Што ж мы з табой будзем рабіць? — загаласіла бусліха. — Давядзецца памерці з голаду і холаду…

Падумаў, падумаў бусел і так адказаў буслісе:

— Не плач, сяброўка дарагая, давай паляцім да людзей. Можа, яны нас пусцяць пагрэцца. Бачыш, вунь на ўзлессі хата стаіць. Давай папросімся туды.

А ў той старэнькай хатцы жылі ўдваіх дзед і баба. Ніякае гаспадаркі ў іх не было, адна старая сівая авечка. Баба прала з воўны ніткі, рабіла панчохі добрым людзям. А дзед лавіў рыбу. Так яны і жылі.

Тае раніцы дзед з бабай якраз былі ў хаце. Чуюць:

— Стук, стук, стук! — пастукаўся нехта ў дзверы.

— Пайдзі, дзед, паглядзі, хто гэта там стукае, — сказала баба.

Адчыніў дзед дзверы, глядзіць — ажно буслы стаяць. Змерзлі, дрыжаць. То адну, то другую нагу падымаюць…



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Ой, баба, зірні, якія госці да нас прыйшлі! — гукнуў дзед.

— Заходзьце, заходзьце хутчэй у хату, — сказала баба.

Упусцілі дзед з бабай буслоў у хату, абагрэлі, накармілі чым толькі маглі.

Паглядзела баба на босыя ногі птушак і кажа:

— Дам я вам, буслы, панчохі цёплыя, каб не мерзлі вашы ногі, а то вёсны ў нас халодныя часта бываюць.

І дала птушкам па пары панчох. Ды толькі панчохі тыя чырвоныя былі, з пафарбаванае пражы.

Надзелі буслы панчохі, і так ім зрабілася добра і цёпла, што і мароз не страшны.

Дзед старое кола на страсе сваёй хаты прыладзіў, і буслы зрабілі сабе новае гняздо, больш надзейнае і трывалае.

Пачалі з таго часу буслы каля людзей трымацца, рабіць свае дамоўкі на стрэхах, на дрэвах, бліжэй да людскіх паселішчаў.





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

А тыя чырвоныя панчохі, што дала ім добрая бабка, буслы і цяпер носяць. (*Клаўдзія Каліна*)

?!

**1.** Якая гэта казка, народная ці літаратурная? Чаму вы прыйшлі да такой высновы?

**2.** Як людзі дапамаглі буслам у казцы?

**3.** Успомніце апавяданне з такой жа назвай, што вы чыталі раней. Што здарылася з буслямі ў тым апавяданні?

**4.** Падзяліце казку на часткі.

**5.** Дайце назву кожнай з іх.

**6.** Перакажыце казку па атрыманым плане.

## Усмешка

У даўнія-даўнія часы на беразе сіняга мора стаяў блакітны казачны горад. Жылі ў ім шчаслівыя людзі. Удзень яны працавалі і спявалі песні, бо праца прыносіла ім радасць. А ўвечары з іхніх дамоў лілася музыка.

Сустракаючыся, людзі ўсміхаліся адно аднаму: такое было ў іх прывітанне.

Пра тое, што на свеце ёсць горад, у якім усе людзі шчаслівыя, даведаўся злы чараўнік. Той самы, які ніколі не спяваў, не любіў музыкі і не ўсміхаўся. Ён рабіў толькі чорныя справы: хлусіў, прыдумваў плёткі, лаяўся.

— Я ведаю, чаму тыя людзі шчаслівыя, — сказаў сам сабе чараўнік. — Яны шчаслівыя таму, што ўмеюць усміхацца. Вось палячу я ў той горад, адбяру іхнія ўсмешкі і стану адзін шчаслівы.

Сеў ён на свой дыван-самалёт і паляцеў. Ляцеў ноччу. Бо ўсе злыя чараўнікі лётаюць толькі ноччу, калі добрыя людзі спяць і бачаць добрыя сны.

Унізе паказаліся блакітныя дахі, і злы чараўнік здагадаўся, што гэта і ёсць той самы казачны горад.

Пачало світаць. З-за мора выкаціўся залаты шар сонца. Цёплыя хвалі лашчылі бераг, усыпаны гладкімі каменьчыкамі. З комінаў пацягнуўся лёгкі дымок.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Седзячы за комінам, злы чараўнік чакаў, пакуль хто-небудзь з'явіцца на вуліцы.

Нарэшце ён убачыў першага жыхара казачнага горада. Той ішоў і ўсміхаўся сонцу, якое шчодра грэла зямлю, птушкам, якія весела спявалі на дрэвах, і зялёным лісточкам, што трымцелі ад лёгкага ветрыку.

Чараўнік вылецеў з-за коміна і апынуўся перад чалавекам.

— Аддай усмешку! — крыкнуў ён страшным голасам, ад якога пасыпалася лісце з дрэў і перасталі спяваць птушкі.

Усмешка адразу знікла з твару чалавека — як яе возьмеш?

Тады чараўнік падбег да другога чалавека і гукнуў:

— Аддай усмешку!

Але зноў адабраць не змог. Яна таксама знікла.

Чараўнік паспрабаваў украсці ўсмешку, забраць яе непрыкметна, каб ніхто не бачыў. І з гэтага нічога не выйшла.

— Куплю ўсмешку, — вырашыў чараўнік.

Але ўсе, каму ён гаварыў пра гэта, толькі паціскалі плячамі.

Чараўнік заплакаў ад крыўды. Злыя слёзы градам пакаціліся па яго зморшчаных шчоках.

Адзін добры чалавек пашкадаваў чараўніка. Пасадзіў яго на лаўку ля блакітнага фантана, выцер ягоны твар ад слёз і спытаў:

— Чаго ты плачаш, добры чалавек?

Ніхто ніколі не звяртаўся да чараўніка з такімі словамі, і ён заплакаў яшчэ мацней.

— Не магу больш так жыць, — усхліпваючы, прагаварыў чараўнік. — Ніхто мяне не любіць, няма ў мяне сяброў… Я хачу ўсміхацца, як усе, але не магу здабыць сабе ўсмешку.

— Усмешку не купіш і не ўкрадзеш, — сказаў жыхар казачнага горада. — Яе дораць за добрыя справы. Успомні, ці зрабіў сёння што добрае. У полі працаваў?

— Не, — адказаў чараўнік.

— Дом будаваў?

— Не.

— Хлеб пёк? Адзежу шыў? Можа, дзяцей добраму вучыў?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Не, не, не, — і чараўнік нізка апусціў галаву.

Чалавек уздыхнуў:

— Дрэнныя твае справы. Але ты можаш памагчы сабе сам. Рабі дабро.

І жыхар казачнага горада пайшоў на працу.

А чараўнік сядзеў і ўсхліпваў, бо не ведаў, як яно робіцца, тое дабро.

Маленькая дзяўчынка бегла ў садзік, спатыкнулася аб каменьчык і ўпала.

Чараўнік падхапіўся, падняў дзяўчынку і стаў дзьмуць на яе пабітае каленца, каб не балела.

Дзяўчынка, якая толькі што хацела заплакаць, раптам усміхнулася чараўніку. Так прыветна, што і яго губы таксама расцягнуліся ва ўсмешку. Першы раз у жыцці!

Яму стала так лёгка, так весела. Ён пацалаваў дзяўчынку ў абедзве шчакі, сеў на свой дыван-самалёт і паляцеў рабіць добрыя справы.

Цяпер ён, напэўна, стаў шчаслівым добрым чараўніком і сам дорыць людзям усмешкі. *(Паводле Галіны Васілеўскай)*

?!
**1.** Якая асноўная думка казкі?
**2.** Калі чалавек па-сапраўднаму шчаслівы?
**3.** Разыграйце казку па асобах.

## Журавель і Чапля

Жылі сабе па абодвух канцах балота Журавель і Чапля.

Пасля стала ім надта маркотна жыць, і вось уздумаў Журавель да Чаплі ў сваты ісці. Ціпяху, ліпяху, сем вярстоў па маху, цераз бор ды ў Чаплін двор.

— Як маешся, Чапля?

— Здароў, Журавель.

— Ці не пойдзеш, Чапля, за мяне замуж?

— А твае ногі доўгі, пер’е каротка; дужа ты брыдкі… Ідзі сабе, дзе быў!



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Журавель перабраўся ізноў цераз балота дый прыйшоў у свой двор.

Раздумалася Чапля, што за Жураўля замуж не пайшла. «Дай, — кажа, — пайду да яго і перапрашу».

Ціпяху, ліпяху, сем вярстоў па маху, цераз бор ды ў Жураўлёў двор.

— Здароў, Журавель!

— Як маешся, Чапля?

— Вазьмі мяне замуж за сябе.

— Твая шыя доўгая, і сіняя, і крывая, і сама ты гарбатая; такой мне не патрэбна.

Хаця было і сорамна, аднак Чапля папляласся цераз бор назад у свой двор.

Шкада стала Жураўлю, што не ўзяў Чаплю бедную, ізноў пайшоў ён тою самаю дарогаю. Ціпяху, ліпяху, сем вярстоў па маху…

Так цэлы век свой хадзілі яны адно да аднаго ў сваты, і так на абодвух канцах балота засталіся іх хаты. *(Паводле Цёткі)*

?!

**1.** Што за словы паўтараюцца ў казцы? Навошта?

**2.** Якія яшчэ словы, выразы, характэрныя для казак, вы ведаеце?

**3.** Назавіце адмоўныя чалавечыя рысы характару, што высмейваюцца ў казцы.

**4.** Чаму Журавель і Чапля так і не пажаніліся?

**5.** Разыграйце казку па асобах.

## Як грыбы збіраліся на парад

Надумаўся грыбны цар Баравік зрабіць парад усіх грыбоў. Захацелася яму паглядзець, колькі ў яго царстве грыбнога народу.

Пачалі грыбы рыхтавацца да парада. Кожнаму хацелася быць самым прывабным і прыгожым. А трэба сказаць, што ў лясным царстве жылі розныя грыбы. Самы злосны быў Мухамор. Грыбы-суседзі не любілі яго. Не любілі яго ні лясныя Жучкі, ні Конікі і асабліва Мухі. Яны ніколі не садзіліся на яго



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

чырвоны капялюш. Але Мухамор нічога не заўважаў. Ён горда стаяў у сваім яркім капелюшы і думаў, што ва ўсім лесе няма грыба, прыгажэйшага за яго.

На парад Мухамор падрыхтаваўся першы. З самага ранку, як толькі выблiснула сонца, ён ужо стаяў перад вялікай кропляй расы, што вісела на травінцы. Любаваўся сам сабою.

І вось цар Баравік падаў знак. Грыбы рушылі на парад.

Наперадзе пабеглі, штурхаючы і абганяючы адна адну, Лісічкі ў жоўценькіх аблавухіх капялюшыках.

— Фі! — фыркнуў Мухамор. — Куды яны лезуць? — Ён нават не прызнаваў Лісічак за грыбы.

Потым выбеглі ў рознакаляровых каўпачках Сыраежкі. Важна прайшлі Рыжыкі, пахістваючы шырокімі брылямі.

Без усякага парадку, цэлым натоўпам, прабеглі перад Баравіком Ваўнянкі, Грузды, Маслякі, Махавікі.

Паважна прайшла сям'я Падбярозавікаў у карычневых берэтах.

І раптам Мухамор убачыў чырвоны капялюш, ну, амаль што такі ж, як у яго... Гэта ішоў Падасінавік. Мухамор аж пазелянеў ад злосці.

— Ах ты, нягоднік! Чаму ты надзеў такі капялюш, як у мяне? — крыкнуў Мухамор і сарваў кветку рамонка. Ён абскуб з яе ўсе белыя пялёсткі і абсыпаў імі свой чырвоны капялюш.

Думаючы, што цяпер ён самы прыгожы, Мухамор выпнуў наперад свае грудзі. Расхінуў белую камізэльку і выйшаў на самую сярэдзіну паляны.

Усе грыбы моўчкі глядзелі на Мухамора і чакалі, што скажа Баравік.

Але грыбны цар нават не зірнуў на Мухамора. Усе заўважылі, што ён устрывожана прыглядаецца да лясной сцяжынкі, на якой з'явіліся дзед з унучкай.

Цар Баравік убачыў людзей і падаў знак хавацца. Грыбы адразу ж разбегліся — хто залез пад бярозу, хто зашыўся ў мох, хто накрыўся лісцем.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

На палянцы застаўся адзін Мухамор.

— Ах, які грыб! — узрадавалася дзяўчынка. — Якія ў яго белыя крапінкі на чырвонай шапцы, як на маёй сукенцы! Дзедка, возьмем яго ў кошык? Зірні, які прыгожы!

— Прыгожы, ды ядавіты, — сказаў дзядуля ўнучцы, — яго нельга есці. Мы лепш пашукаем з табой баравікоў, падбярозавікаў, падасінавікаў… *(Паводле Клаўдзіі Каліны)*

**Аблаву́хі** — з абвіслымі вушамі.
**Брыль** — казырок шапкі ці капялюш з палямі.

**1.** Ці ўсё, што здаецца прыгожым, карыснае і добрае на самай справе?
**2.** Якія словы выкарыстоўвае аўтар для характарыстыкі Мухамора?
**3.** Ці можна здагадацца з самага пачатку казкі, што мухамор — дрэнны, шкодны грыб?
**4.** Ці ведаеце вы іншыя грыбы, названыя ў казцы? Намалюйце іх.
**5.** Чаму царом грыбоў з'яўляецца Баравік? Паразважайце.

## Мурашык

…А ў мурашніку адным,
што ў бары стаіць сівым,

вырас неяк абібок.
Ён ад дому — ані крок!

Усяго што мог рабіць —
у цянёчку лынды біць.

Да таго ж хвальком ён быў,
кулаком у грудзі біў:
— Хоць сягоння я магу
ліса цапнуць за нагу
і, як толькі захачу,
хвост на памяць адкручу!



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Ліс пачуў — і тут як тут:
— Хто жадае мне пакут?!

Зледзянела ўся душа
ў задзіры Мураша.
Ды назаўтра на суку
выхваляўся Павуку:
— Калі так — да матузка
прывяжу Маладзіка.
Светла бегаць будзе ў гай —
хоць ігліцу ты збірай!

А Павук стары са сну
ножык точыць аб сасну…

Скалануў малога страх
(не сусед, а проста жах!).
Патырчма на дол зляцеў
і на доле тым самлеў.

Потым — зірк туды, сюды:
мора перад ім вады!
— Цётка Люгашка, —
сказаў, —
на той бераг перапраў!

— Заляцець магла б я ў бор —
не заводзіцца матор.

Пра бяду пачуў Слімак —
не смяяўся зроду так:
— Як хвасты круціць — дык мог,
а цяпер — ні рук, ні ног!..



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Сеў Мурашык пад кустом,
слёзы льюцца ручаём:
— Што рабіць мне? Як мне быць?
Як мне мора пераплыць?

Раптам бачыць: з-за гары
коцяць нешта Камары.

— У арэхавай шкарлупцы
будзеш ты нібыта ў шлюпцы!
Так што, браце, не бядуй,
бяры тычку і кіруй!

Шчыра кажучы, з нязвычкі
дрэнна слухалася тычка.
Ды нарэшце наш герой
пераплыў на бераг свой.

А на беразе на тым
мітусіліся браты:
— Вечна ў нешта ўліпнеш ты!..
Брацца ўжо за розум час!
Не падводзь ты болей нас!
І Мурашык б’е чалом:
— Перастану быць
хвальком!

*(Паводле Яраслава Пархуты)*

?!

**1.** Якая гэта казка: народная ці літаратурная? Як яшчэ яе можна ахарактарызаваць?

**2.** Якія іншыя вершаваныя казкі вы ведаеце?

**3.** Якім апісваецца ў казцы Мурашык? Чым ён выхваляўся?

**4.** Пералічыце падзеі, якія адбываліся ў казцы.

**5.** Навучыцеся выразна чытаць казку па асобах, інтанацыяй перадаючы характар Мураша.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Пытанні і заданні да раздзела

1. З якімі відамі казак вы пазнаёміліся ў гэтым раздзеле?
2. Назавіце казкі і іх аўтараў.
3. Успомніце назвы беларускіх народных казак, якія вы чыталі раней.
4. Якая казка з гэтага раздзела вам найбольш спадабалася? Растлумачце, чаму.
5. Прачытайце прымаўку. Ці выказвае яна асноўную думку ўсяго раздзела? Абгрунтуйце сваё меркаванне.

**Слухаць добрай рады не шкодзіць.**

6. З якіх казак наступныя радкі? Хто аўтары гэтых казак?

*Ціпяху, ліпяху, сем вярстоў па маху, цераз бор ды ў Чаплін двор.*

*Кожнаму хацелася быць самым прывабным і прыгожым. А трэба сказаць, што ў лясным царстве жылі розныя грыбы.*

*Дзяўчынка, якая толькі што хацела заплакаць, раптам усміхнулася чараўніку. Так прыветна, што і яго губы таксама расцягнуліся ва ўсмешку. Першы раз у жыцці!*

*Прачнуліся аднойчы бусел з буслíхай на досвітку, а вакол усё снегам пакрыта. Паляцелі яны на балота, хацелі спажыву сабе здабыць, але нічога не знайшлі. Усё замерзла, заледзянела. Памарозілі буслы свае босыя ногі і вярнуліся назад.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ПРЫХОДЗІЦЬ ЛЕТА ЗВОНКАЕ



## *Летняя ноч

Заззяла бліскавіцамі, усміхалася зарніцамі,
папараццю цвіла.
Усміхалася, смяялася, у возеры купалася
да белага святла.

Плакала суніцамі, плакала чарніцамі,
ценямі сплыла.
А можа, й не сваціліся, сама сабе сасніласяся,
была ці не была?

*(Аляксей Пысін)*

**Бліскаві́ца** — маланка.

?! **1.** Якой паэт паказвае летнюю ноч? Растлумачце, якія вобразы стаяць за словамі верша.
**2.** Што б вы яшчэ дадалі да апісання летняй ночы? Якая яна?
**3.** Навучыцеся чытаць верш выразна або *вывучыце яго на памяць.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Буслы

Пайшоў я ў Варанцы паглядзець на буслоў дзядзькі Вінцука. Вось і двор яго. Перад вокнамі хаты густа разрасліся кветкі. Высяцца светла-жоўтыя вяргіні.

Гняздо бусла знаходзіцца на высокім дрэве са зрэзанай вершалінай. Яно ўпрыгожвае старое разгалістае дрэва, нібы вялізны шырокі вянок.

Пасярод гнязда стаяць тры маладыя буслы. Іх ужо не адрозніць па выглядзе ад дарослых, але гнязда яны яшчэ не пакінулі.

На парозе хаты сустрэў мяне дзядзька.

— Дзень добры! Прыйшлі на маіх суседзяў паглядзець? — гаворыць ён, вітаючыся са мною, як са старым знаёмым. — Калі ласка!

Мы селі на лаўку перад хатай. Над намі звісалі чырвоныя гронкі рабіны.





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Вось якая ў мяне буслянка, — хваліцца дзядзька Вінцук, паглядаючы на гняздо.

Падляцеў стары бусел і павольна апусціўся на край гнязда.

— Бачыце, што прынёс? — ажывіўся дзядзька.

У чырвонай дзюбе бусла я ўгледзеў даволі вялікую змяю. Бусел кінуў яе ў сярэдзіну гнязда і адразу паляцеў прэч.

Маладыя буслы замітусіліся вакол кінутай ім здабычы. Шпарка апусціліся ўніз дзюбы. Адзін з іх апярэдзіў астатніх. Ён першы схапіў змяю, падкінуў яе ўгару, і ў тую ж хвіліну змяя знікла ў шырока раскрытай дзюбе.

— Буслы не кормяць сваіх малых з дзюбы ў дзюбу, як іншыя птушкі, — сказаў дзядзька. — Яны кладуць прынесеную здабычу проста ў гняздо, а бусляняты самі яе падбіраюць.

Тым часам малады бусел адкінуў галаву на спіну і заклекатаў. Далёка па наваколлі разнёсся гэты клёкат. Стукаючы верхняй палавінай дзюбы аб ніжнюю, бусел выказвае ўсе свае пачуцці.

Праз некаторы час зноў падляцеў дарослы бусел і кінуў яшчэ нешта ў гняздо.

— Калі бусляняты малыя, — тлумачыць гаспадар, — адзін з бацькоў ляціць па здабычу, а другі застаецца пільнаваць, каб ніхто малых не пакрыўдзіў. Калі бусляняты ўжо стаяць на нагах, бацькі вылятаюць на пошукі ежы разам. Ім цяпер лягчэй, бо малым ужо не патрэбна ахова. А корму бусляняты патрабуюць з кожным днём усё больш і больш.

Адзін з буслоў, стоячы ў гняздзе, раскрыў шырокія крылы і з сілай пачаў узмахваць імі. Потым зрабіў гэта і другі, а за ім трэці. Паветра напоўнілася шумам.

— Практыкуюцца, — сказаў дзядзька Вінцук. — Неўзабаве пачнуць лятаць. Спачатку каля гнязда, а потым усё далей і далей. *(Паводле Віталя Вольскага)*

?! **1.** У якую пару года адбываецца дзеянне апавядання? Што дапамагло вам зразумець гэта?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**2.** Успомніце, ці сустракаліся вам пры чытанні тэксты з такой жа назвай. Аб чым расказвалася ў іх? Пагартайце кнігу, знайдзіце тэксты з назвай «Буслы». *Сцісла раскажыце змест кожнага з іх.
**3.** Якое з гэтых трох апавяданняў вас найбольш уразіла? Чаму?

## Вёрткія язі

Упершыню гэтым летам дзед Прохар пачаў браць Ягорку з сабою на рэчку. Хлопчыку адразу пашанцавала. Ён злавіў пяць акунькоў, дзве плотачкі і некалькі печкуроў. А назаўтра яму давялося пазнаёміцца з язямі.

Як заўсёды, дзед сеў з вудачкай на сваё любімае месца пад старою вярбою, Ягорка — паблізу, пад лазовым кустом. Доўга рыба не бралася. Хлапчук ужо хацеў перайсці на іншае месца, ды раптам паплавок заторгаўся на вадзе. Ягорка падхапіў вудачку і радасна ўсклікнуў:

— Ёсць адна! Ды якая вялікая!

Ён хуценька зняў з кручка рыбу, пусціў яе ў вядзерца з вадою, начапіў нажыўку і зноў закінуў вудачку. Неўзабаве на беразе затрапяталася другая рыбка. Потым трэцяя. Тут Ягорка не вытрымаў і пабег да дзеда пахваліцца такой незвычайнай удачай.

— Дзядуля, я аж тры плоткі злавіў. Вялі-і-кія! Ідзі глянь.

— Малайчына, унучак, — пахваліў дзед і пайшоў зірнуць.

Падышлі да куста, пад якім рыбачыў Ягорка, бачаць — на беразе рыбка трапечацца.

— Трымай яе, унучак, а то яшчэ ў рэчку ўцячэ.

Ягорка мігам схапіў рыбку і падаў дзеду.

— Язік, — кажа дзед.

— А як ён апынуўся на беразе? — здзівіўся хлопчык.

— Не ведаю, унучак, ты ж тут рыбачыў, табе лепш ведаць. Кідай у вядзерца.

Ягорка падняў вядзерца, каб паказаць дзеду злоўленых плотак. А там — ніводнай рыбкі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Дзядуля, хто забраў маю рыбу? — ледзь не заплакаў хлопчык.



— Э-э, унучак, цяпер усё зразумела, — усміхнуўся дзед. — Ніхто тваёй рыбы не браў. Яна сама ўцякла ад цябе ў рэчку. А злавіў ты, выходзіць, не плотак, а язікаў. А язь — рыба вёрткая і хітрая. Ты ж бачыў, як высока падскоквае язь над вадою, каб злавіць матылька ці страказу. З твайго вядзерца выскачыць — нічога не значыць. Гэта я забыўся сказаць, каб ты палажыў зверху травы. *(Паводле Рыгора Ігнаценкі)*

?! **1.** Ці бачылі вы рыбу, якая апісваецца ў апавяданні? Разгледзьце яе на малюнку.

**2.** Ці ўдалай была рыбалка для Ягоркі? Чаму?

**3.** Якімі вы ўяўляеце Ягорку і дзеда Прохара? Намалюйце іх слоўныя партрэты.

**4*.** Перакажыце тэкст.

## Рыбак

Як толькі выходны дзянёк настае,
ён вуды і снасці збірае свае,
і досвіткам раннім на бераг ідзе,
і ціха спускаецца к цёмнай вадзе.

Стаіўшыся ў дзікім, густым лазняку,
ён вуды свае закідае ў раку.
А там, адліваючы срэбнай луской,
бліскучыя рыбы ідуць чарадой.

Напяўшы тугія свае плаўнікі,
хвастамі ад прагнасці б’юць шчупакі.
Шырокія плоткі з чырвоным пяром
снуюць над празрыстым, прасвечаным дном.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У змроку, у іле ляжаць карасі,
у зеллі багністым жыруюць язі,
у ціне лянівыя ходзяць ліні,
а ў тонях пярэстыя спяць акуні.

Мільёны вялікіх і дробненькіх рыб
наверх усплываюць, ныраюць углыб,
гуляюць на хвалях, жыруюць на дне,
а вось за кручок ні адна не кране.

І раптам, схіліўшыся трошкі набок,
схіснуўся і знік пад вадой паплавок,
вудзільна сагнулася ў спрытнай руцэ,
і хвалі кругамі пайшлі па рацэ.

І вось праз секунду, а можа праз дзве
трапечацца лешч на вільготнай траве.
На шчасце закінуўшы вуду ізноў,
рыбак аглядае свой першы ўлоў.

*(Пятро Глебка)*

?!

**1.** Аб якім захапленні расказваецца ў вершы?
**2.** Ці ведаеце вы тых рыб, якія ўпамінаюцца ў вершы?
**3.** Ці ёсць у вас які-небудзь улюбёны занятак, хобі, якому вы прысвячаеце свой вольны час? Раскажыце аб гэтым.

## Воблачка

Па небе плыла хмара. Пасярэдзіне яна была чорная, бо там сабралася многа вады. З бакоў яе абступалі воблачкі — белыя і лёгкія, як вата.

Хмара плыла па небе, і воблачкі разам з ёю.

Вакол сінела неба. Свяціла сонца, і быў такі прастор! А аднаму воблачку надакучыла плысці ўслед за хмараю. Яму захацелася пабыць на волі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

«Кіну я іх, — падумала воблачка. — Паплыву сваёй дарогай. Вунь якое раздолле вакол. Хоць свету пабачу. А то гэтая хмара ўсё засцілае. За ёю нічога не відаць. Ды і злосная такая. Увесь час грукоча!»

Як надумала воблачка, так і зрабіла. Прыцішылася — ды ўбок, убок. Адплыло крыху ад хмары, агледзелася. Ну і харасгво! Унізе зямля ляжыць, палоскамі-дарожкамі перавітая. На роўных квадраціках стаяць малюсенькія скрыначкі з устаўленымі ў іх шкельцамі. Сябры-воблачкі казалі, што гэта дамы́. У іх жывуць людзі, маленечкія, як мурашачкі, што па дарожках ходзяць.

А вакол — і ўверсе, і з бакоў — такая яснота!

«Ну і хораша! — радавалася воблачка. — І чаму я раней не кінула гэту хмару, чаму раней не вырвалася на волю?»

Лёгкае, шчаслівае, яно пачало ўзнімацца ўгору. Вось ужо цёмная хмара, яго ранейшы прытулак, яго дом, далёка засталася ўнізе.

А воблачка плыло да сонца, да яго прывабных праменяў.

Але вось дзіва — чым вышэй узнімалася воблачка, чым бліжэй было яно да сонца, тым рабілася яму халадней і халадней. Воблачка не магло зразумець, што гэта значыць. Яно не ведала, што чым далей ад зямлі, тым халадней у небе. А холад усё мацнеў і мацнеў. Воблачка ўжо калацілася ад холаду. Глянула на сябе і спужалася. Яго беражкі ператварыліся ў сняжынкі. І плысці ўверх больш не было сілы. Нешта цягнула ўніз, да зямлі.

І чым ніжэй апускалася воблачка, тым цяплей станавілася яму. Але што за праява? Воблачка адчула, што цяпло — яго вораг. Сняжынкі на яго краёчках пачалі раставаць.

Спалохалася воблачка. Кінулася ў адзін бок, у другі, ратуючыся ад сонца. А тут, адкуль ні вазьміся, — вецер. Дзьмухнуў раз, дзьмухнуў другі. Задрыжала воблачка. Зразумела — яшчэ адзін такі налёт, і вецер парве яго на часткі. Сцялося ў камячок. А вецер дзьме. А вецер шалее.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

«Куды ж мне схавацца ад яго? За каго затуліцца? — ледзь не плача воблачка. — Хмара, родная, дзе ты?»

Пачало кідацца воблачка па небе, хмару шукаць, але той нідзе не было.

Вецер гойсаў па небе і тады, калі воблачка плавала не адно, а са сваімі сябрамі. Але воблачкі туліліся адно да аднаго, і вецер не мог даць ім рады.

А цяпер воблачка не магло дужацца з ветрам. Не было ў яго сілы.

«Сябры мае воблачкі, дзе вы? Дзе ты, хмара? О, як бы я хацела быць з вамі!» — стагнала воблачка.

Яно раптам зразумела, што хмара была зусім не злосная і не бурклівая. Проста работа ў яе такая: сеяць дождж.

*(Паводле Лідзіі Арабей)*

?!
**1.** Ці можна назваць гэты тэкст казкай? Чаму?
**2.** Якая асноўная думка тэксту?

## Сонечны дождж

Ён паліўся… Спорны, шчодры.
Церабнуў па промнях коса,
зазваніў са стрэх у вёдры,
на дварэ абмыў калёсы.

Падстаўляюць чашкі кветкі —
хочуць піць пасля спякоты,
а ільнам, бы нам, няўседкі —
ліўнем мыюцца з ахвотай.

Веццем-прыгаршчамі клёны
дажджавыя кроплі ловяць;
як жаніх, стаіць зялёны,
чыста вымыты ядловец.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

А пасля дажджовай працы
прыгажосць зямля прыдбала,
нават сонца прыбірацца
ў вясёлку спешна стала.

*(Янка Сіпакоў)*

?! **1.** Чаму верш мае такую назву? Ці можна было б назваць так верш, калі б у ім гаворка вялася пра асенні дождж?

**2.** Якія эмоцыі выклікае гэты верш?

**3***. Якія параўнанні выкарыстоўвае паэт у вершы?

## Дружба

Паміж трох сасонак — і хто яе тут пасадзіў? — узышла калісь бярозка.

Сёлета дрэвы зусім ладныя сталі — сасонкі Алесю амаль пад бараду дастаюць. А бярозка нават і вышэйшая за Алеся.

«Як гэта так, — думае Алесь, — што бярозка перарасла сасонкі?..» Бо ён жа добра памятае: калі бярозка толькі што з’явілася, сасоначкі ўжо раслі…

— А гэта таму, — сказала Алесю маці, — што сасоначкі дужа хацелі дапамагчы бярозцы. Бачыш, як яны з трох бакоў быццам падтрымліваюць, быццам падымаюць бярозку?

— Дык яны сябруюць?

— Але, але!.. А вось цяпер, калі бярозка ўзнялася трохі вышэй за сваіх сябровак, дык і яна будзе ім памагаць. Будзе прыкрываць сяброўак сваім шырокім лісцем ад залішняга санцапёку. Будзе ліўні сустракаць першая. А вецер грозны дыхне здалёку, дык яна папярэдзіць сяброўак: рыхтуйцеся да небяспекі, моцна трымайцеся каранямі за родную зямлю… А пазней, восенню, скіне лісце на карані і свае і сяброўак сваіх. Каб цёпла было ўсім, каб не біла іх сцюжа зімою.

Дружна растуць сасонкі і бярозка. Пройдзе дождж ці раса буйна́я выпадзе — бухматыя сасонкі доўга зіхацяць мільёнамі кропляў-іскрынак, асвятляючы і саграючы сяброўку-бярозку.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

А яна, шчаслівая красуня, звініць завушніцамі дажджынак ці рос. З кожнай хвілінаю вышэй і вышэй падымае свае лісточкі…

І радуецца, гледзячы на сяброўак, сонца, радуецца зямля, радуецца Алесь. Усім радасна бачыць добрую, шчырую дружбу.

*(Паводле Кастуся Кірэенкі)*

?!

**1.** Ці назіралі вы ў прыродзе выпадкі, падобныя да апісанага ў апавяданні?

**2.** Выкажыце асноўную думку апавядання.

**3.** Ці не так і ў людзей: калі дапамагаюць адно аднаму, то і жыццё лягчэй пражыць?

**4.** Прывядзіце выпадкі з вашага вопыту, калі вы каму-небудзь дапамаглі і вам аддзячылі тым жа.

## Незвычайны грыбнік

Кожны грыбнік мае свае мясціны ў лесе. Меў такую і Толік. Гэта была невялічкая светлая палянка сярод лесу. На ёй рос тоўсты дуплаваты дуб. У дупле вяліся круцігалоўкі, і хлопчык часта назіраў, як птушкі кармілі сваіх дзяцей.

На палянцы кожны год расло шмат баравікоў, падасінавікаў, падбярозавікаў, сыраежак. Аббяжыць Толік раненька сваю мясцінку, глядзіш — повен кошык грыбоў, маладзенькіх, крамяных. Не паспее маці ў печы выпаліць, а сын ужо дома з грыбамі.

Аднойчы прыбег ён на палянку, аж бачыць — адны толькі карэньчыкі валяюцца. Толік здзівіўся: «Хто ж гэта раней за мяне прыходзіў?» І падумаў, што, мабыць, малыя дзеці. Бо школьнікі не стануць вырываць корань з зямлёю, каб не пашкодзіць грыбніцу.

Праз два дні Толік зноў прыбег на знаёмую палянку. Грыбоў яшчэ ніхто не чапаў. І хлопчык пачаў збіраць іх у кошык.

Але вось нешта зашастала ў арэхавым кусце. Толік сцішыўся за тоўстым дрэвам: дай, думае, пагляджу, што за грыбнік ідзе.

І раптам высунулася вялізная галава з разгалістымі рагамі.

«Ло-ось», — шапнуў хлопчык і сцяўся ўвесь.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Звер выйшаў на палянку, сцепануўся, фыркнуў, панюхаў паветра і ўзяўся збіраць грыбы. Вырве тоўстымі губамі з зямлі, адкусіць мяккую шапачку, а корань адкіне.

Толік не стаў пужаць ліся, хоць і шкада было грыбоў. Такога незвычайнага грыбніка хлопчык бачыў упершыню.

*(Рыгор Ігнаценка)*

**Крамя́ны** — свежы, пругкі, ядраны.
**Сцепану́цца** — *разм.* раптам здрыгануцца, уздрыгнуць, скалануцца.

?!

**1.** Каго сустрэў Толік у лесе? Як лось збіраў грыбы?
**2.** Падзяліце тэкст на часткі. Дайце назву кожнай з іх.
**3.** Перакажыце тую частку, у якой расказваецца, як лось збірае грыбы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Жуpавы над Жыцькавам

Чатырнаццатага жніўня, чапляючыся крыллем за нізкія хмары, над самым Жыцькавам ляцелі ў вырай жуpавы.

Колькі дзён перад гэтым, не зважаючы на блізкую восень, грэла і пякло паніжэлае на небе сонца. У пыльнай і высушанай да звону цішыні было чуваць, як шапоча вусатым коласам ячменнае поле. Потым з поўначы падзьмуў густы і халодны восеньскі вецер. Неяк адразу папаўзлі нізкія і цяжкія хмары. Яны пакуль што былі яшчэ без дажджу.

Адразу неяк пахаладала, і жыцькаўскія госці, якія кожнае лета прыязджаюць сюды па свежае паветра, сонца і цішыню, паўсцягвалі на загарэлыя, карычневыя, як жалуды, спіны старыя ватоўкі і світкі.

Смешнаватыя ў гэтай сваёй нязвыклай і дзіўнай вопратцы, яны насцярожана ўглядаліся ў журботны жураўліны клін.

Над Жыцькавам ляцелі ў вырай жуpавы. Яны спакойна, не спяшаючыся, махалі ў воблаках крыллем. Махалі, нібы развітваючыся з усім, што бачылі зверху, і неяк задумліва, нават крыху сумнавата трубілі. Яно і праўда: каму гэта лёгка, хоць і на некаторы час, развітвацца з радзімаю!

За жуpавамі ляцела ладная чародка нейкіх маленькіх птушачак. Тыя паспешліва, нібыта баючыся ўпасці на зямлю, махалі крыльцамі, білі імі па пругкім паветры. Так дзеці, якія асабліва не ўмеюць плаваць, спяшаюцца на глыбокім месцы, каламуцяць са страху рукамі і нагамі ваду. Толькі пырскі ляцяць ва ўсе бакі. Але, нягледзячы на сваю хапатлівасць, якая, здавалася, замінала ім, птушачкі не адставалі ад жуpавоў. Яны і самі, зразумела, слухаючыся свайго інстынкту, знайшлі б тую нялёгкую дарогу ў вырай, але з жуpавамі надзейней. Вось бачыш, як упэўнена і спакойна махаюць яны крыллем…

Жураўліны ключ то крыху звужаўся, то, расшыраючыся, нават заломваўся даўжэйшым канцом. Але птушкі, нібыта яны бачылі сябе з зямлі, адразу ж выпраўлялі, выроўнівалі яго, не



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

перастройваючыся нават. Гэты першы вырай шастаў крыллем над хатамі, кустамі, ячменным полем вельмі прыгожа і настойліва.

Развітальная жураўліная песня, як камячок тугі, перадавалася з дзюбы ў дзюбу. Потым з лёгкім пошумам крылаў, падобным на ціхі бязветраны лістапад, павольна і нячутна ападала на паднятыя ўгору твары.

— Глядзі ты, як паляцелі, — апускалі галовы жыцькаўскія госці. Нібыта, як лёгкі пыл, страсалі з твару, з вачэй, з валасоў і пошум крылаў, і тужлівы спеў жураўлёў.

Мы сядзелі ля хаты на ўтравелым грудку зямлі, які некалі быў брустверам і застаўся яшчэ ад самае вайны. Сядзелі і маўкліва праводзілі вачыма жураўліны клін, які пастулова хаваўся за далёкія бярозы. *(Паводле Янкі Сіпакова)*

**Каламу́ціць** — муціць.
**Хапатлі́васць** — паспешлівасць.
**Бру́ствер** — земляны насып па краі акопа для прыкрыцця байцоў ад варожага агню.

?!
**1.** Якім настроем прасякнута апавяданне?
**2.** Хто такія «жыцькаўскія госці»?
**3.** Ці назіралі вы за адлётам птушак у вырай?
**4.** Якія гэта былі птушкі? Калі яны ляцелі ў вырай?
**5.** Якія птушкі раней за іншых адлятаюць у вырай? А якія — пазней?

## Летнія заняткі

Валя лекавыя зёлкі
збірае для школкі.
У яе ёсць мара,
каб зрабіць гербарый.
А Мікола — глянь са спіны,
як латошыць ён маліны.
Вунь Алёна каля клёна
светлякоў знайшла зялёных.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Брат яе Алежка —
тры сыраежкі.
Ды яшчэ рамонкі
для сястры Алёнкі.
Маня ж часу не губляла —
да паўдня пад ліпкай... спала,
ела шакаладкі!
Вось і ўсе заняткі.

*(Алена Котава)*

?! **1.** Як вы думаеце, дзеці з верша — вялікія ці малыя? Патлумачце сваё меркаванне.
**2.** Якія заняткі ў дзяцей летам?
**3.** Ці можна назваць заняткі Мані працай? А як іх можна назваць?

## Мая гаспадарка

Раніцай бабуля наліла мне шклянку малака — запіць снеданне — і сказала:

— Канчай, унучак, есці ды бярэмся за гаспадарку. Твае дзядзька і цётка напрацаваліся ўжо недзе ў полі, пакуль ты спаў.

— За якую гаспадарку? — не зразумеў я.

— А я табе раскажу.

Ну што ж, за гаспадарку дык за гаспадарку. У нас у горадзе ніякай гаспадаркі няма. А калі ў бабулі яна ёсць — буду дапамагаць. Так мне і мама дома сказала: «Глядзі, Вова, дапамагай бабулі. Яна старэнькая».

Бабуля і кажа:

— Пайдзі, унучак, зірні, куды гэта падзеліся нашы падушачкі.

— Добра, бабуля, зараз!

Я ўсхапіўся з-за стала і хуценька пабег у «новую» хату. Так называлі чысты і заўсёды прыбраны пакой, дзе мы з бабуляй спалі. Там усё было ў парадку: ложкі засланы, а падушкі,



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



узбітыя бабулінымі рукамі, узнімаліся ледзь не да столі. Маленькія падушачкі-думкі таксама ляжалі на месцы...

— Бабуля, яны ляжаць на ложках! — Мне нават дзіўна было з бабулінага загаду: сапраўды, куды ж ім дзецца — гэтым яе падушачкам?

— А дзіцятка ты маё! — пляснула рукамі бабуля і аж затрэслася ўся ад смеху. — А я думаю, чаго гэта ён у тую хату пабег, а ён падушак глядзець...

— Ты ж сама загадала мне, — пакрыўдзіўся я, не разумеючы, што магло так рассмяшыць бабулю.

— Дурненькі, гэта ж я сказала, каб ты пайшоў паглядзеў, дзе нашы гусяняткі ходзяць.

— Гусяняткі?.. А ты ж сказала: «Ідзі паглядзі падушачкі...»

— А з чаго ж падушачкі робяць?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— З чаго? Не з гусянят жа!..

— Ды пэўна ж — не з гусянят… — зноў засмяялася бабуля.

І растлумачыла мне, што падушкі робяць з пер’я і пуху, а пух і пер’е растуць на гусях. А гусі вырастаюць з гусянят. Вось і выходзіць, што гусяняткі — і сапраўды маленькія падушачкі…

Я ўсё зразумеў і другі раз ужо не ашукаўся б.

Пад вечар, як спала гарачыня, я ўзяў пужку — яе мне звіў з канапель дзед Васіль — і пагнаў на выган бабуліных свіней: старую рабую і двух чорных вепручкоў. Стаю сабе ля плота і свішчу пужкай у паветры: ж-жык! ж-жык! Цвіце жоўты, як сонейка, адуванчык — я па ім ж-жык! Паўзе па дарозе чорны бліскучы жук — я і яго ж-жык! Толькі адвярнуўся — аднекуль прыляцеў і кружыцца белы матылёк. Я і на яго замахнуўся — ж-жык! Але матылёк замахаў крыльцамі і паляцеў у жыта.

А я ўсё ж-жык і ж-жык у паветры!

Раптам чую: крычыць з поля цераз дарогу бабуліна суседка, цётка Ігналіха, — яна там буракі палола.

— Вова! Што ты там робіш? Паглядзі, дзе тваё сала ходзіць!

Глянуў я навокал: ляжыць мая торбачка з хлебам і салам, як і ляжала.

— Нідзе яно не ходзіць, — крычу ў адказ. — Ляжыць каля мяне.

— Ляжыць каля цябе?! А ты паглядзі добра, што твае свінні робяць!

Я азірнуўся яшчэ раз. Сапраўды, свіней на выгане не было. Куды ж яны маглі падзецца? І раптам убачыў іх. Яны рылі лычамі бульбу за плотам. Я кінуўся выганяць свіней, а цётка Ігналіха стаяла са жменяй зелля ў руках і адчытвала мяне:

— Бач ты яго! Знайшоў сабе занятак з пугай. Глядзеў бы лепей свіней, калі прыгнаў пасвіць.

— А вы ж казалі — сала… — запярэчыў я і тут жа здагадаўся: дык сала — гэта ж тыя самыя свінні! Усё роўна як і падушачкі… Усё тут наадварот завецца, усё не так, як у нас дома, у горадзе…



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

А то аднойчы мы з дзедам Васілём вазілі ў калгасе снапы. Дзед пасадзіў мяне на воз, сам ідзе збоку, канём кіруе. А насустрач нам старшыня калгаса.

— Што гэта ты, — кажа, — Вова, на хлебе едзеш?

А я адказваю:

— Я не на хлебе, я на снапах сяджу.

Ён засмяяўся і гаворыць дзеду:

— Вось, адразу відаць, горад! Вучы яго, дзед, як хлеб расце, вучы!

Усё вучы ды вучы — быццам я і сам не вучуся і нічога не разумею. Паказала мне бабуля, як прапалоць граду, дзе расла морква. Дык я так чыста выпалаў, што ніводнай зялінкі не засталося... І вучыць не трэба было.

Або скажа мне бабуля: «Ідзі, Вова, стрэнь наша малачко. Яно ўжо недзе за рэчкай — ідзе дадому». Значыць, трэба ўзяць лусту хлеба ці жменю бурачнага лісту і ісці сустракаць нашу карову Белку. Яна так у бабулі прывучана: стрэнь чым-небудзь, а то міне двор і пойдзе па ўсёй вёсцы... Калі ж Белка не прыходзіць дадому, бабуля злуецца і крычыць: «Ото ж удалося малачко!»

Але мяне ўжо тут не ашукаеш! Малако — значыць карова! А карова — значыць малако!

Я сваю гаспадарку ўжо добра ведаю! *(Паводле Алены Васілевіч)*

?! **1.** Чаго не разумеў спачатку гарадскі хлопчык? Ці не здаралася такіх выпадкаў з вамі?

**2.** Якія словы ў тэксце ўжываюцца ў пераносным значэнні?

**3.** Прачытайце апавяданне па асобах.

## Сцяжынка

Штодзень уранку летам,
ледзь-ледзь пачне світаць,
бяжыць сцяжынка з дому
па лесе пагуляць.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Яна заўсёды знае,
дзе ягады растуць,
дзе перайсці праз кладку,
балотца абагнуць.

А толькі звечарэе
і стане цёмна зноў,
у лесе не заблудзіць
і прыбяжыць дамоў.

*(Генадзь Кляўко)*

?! **1.** Ці заўважылі вы, што паэт апісвае сцяжынку, быццам яна жывая?
**2.** У прамым ці пераносным значэнні ўжыты словы, якімі расказваецца, што робіць сцяжынка?
**3.** Вывучыце верш на памяць.

## Жывы барометр



На лета Міша паехаў гасцяваць у вёску да цёткі, якая працавала настаўніцай. Хутка хлопчык прывык, пасябраваў з такімі ж, як сам, вучнямі. Цэлымі днямі прападаў з імі то на рэчцы, то ў лесе.

— Цётка Паліна, мы сёння зноў пойдзем у лес, — сказаў Міша за снеданнем.

— Тады вазьмі з сабою плашч.

— Навошта?

— Можа быць дождж.

Міша засмяяўся:

— Адкуль вы ведаеце?

— А вунь зірні, што паказваюць наготкі.

Перад акном на градцы расло шмат кветак.

— На небе ні хмурынкі, а яны ўжо чакаюць дажджу, — сказала цётка. — Бачыш, хоць і цёпла, а наготкі не раскрылі пялёсткаў. Тыя раніцы аж зіхацелі, а сёння спяць.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Я ні разу не бачыў, калі яны распускаюцца.

— Трэба, Мішачка, прыглядацца да таго, што вакол цябе. Прырода — найцікавейшая кніга. Запомні: перад дажджом белая лілея таксама аберагае свае суквецці ад дажджавых кропель, хоць і расце сама ў вадзе. А ці бачыў ты калі, як «плача» клён?

— Не.

— Прыгледзься, гэта цікава. У тым месцы, дзе чаранкі лістоў прыраслі да дрэва, на дождж выступаюць слёзы. Чаму? Перад дажджом у паветры з'явілася шмат вільгаці, а клён сваю не можа выпарыць праз лісце. Вось і капае лішняя вада. Ты, мусіць, не ведаеш, што і акацыя перад дажджом выдзяляе шмат нектару? Гэта лёгка заўважыць. Калі над кветкамі акацыі многа ўсялякіх мошак, тады чакай дажджу.

Міша чуў гэта ўпершыню і не знаў, верыць ці не, а цётка казала далей:

— І дым, бачыш, з комінаў не слупам ідзе ўгору, а рассейваецца. Таксама прыкмета на дождж. А ластаўкі высока ці нізка лятаюць? — спытала цётка.

— Над самай зямлёю, — паказаў хлапчук.

— А ўчора дзе ляталі?

— Высока ў небе.

— Значыць, мошкі ціснуцца да зямлі перад дажджом, і ластаўкі зніжаюцца, каб лавіць іх.

Міша аж пляснуў рукамі:

— Ой, як цікава! Без барометра можна ведаць, якое надвор'е будзе. Адкуль вы, цётачка, даведаліся пра гэта?

— Што з кніжак, а болей са сваіх уласных назіранняў... Яшчэ, заўваж, кветкі могуць не толькі прадказваць надвор'е, але і паказваць гадзіны сутак. Бо кожная з іх распускаецца ў пэўны час. Толькі трэба ўмець прыгледзецца. Паназірай сам, упэўнішся. *(Паводле Алеся Пальчэўскага)*

?!

**1.** Пералічыце народныя прыметы, пра якія расказваецца ў апавяданні.
**2.** Назавіце іншыя вядомыя вам прыметы надвор'я.
**3.** Карыстайцеся імі ў час летняга адпачынку.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Пытанні і заданні да раздзела

**1.** Якім тэмам прысвечаны творы ў раздзеле?

**2.** Якія з твораў гэтага раздзела вам найбольш спадабаўся? Чаму?

**3.** Перакажыце змест твора, які вам запомніўся болей за іншыя.

**4.** Раскажыце, чым вы любіце займацца летам. Можа, гэта рыбалка? Ці збіранне грыбоў, ягад?

**5.** Назавіце творы з гэтага раздзела, з якіх узяты наступныя радкі. Хто іх аўтары?

*Неўзабаве на беразе затрапяталася другая рыбка. Потым трэцяя. Тут Ягорка не вытрымаў і пабег да дзеда пахваліцца такой незвычайнай удачай.*

*Але вось нешта зашастала ў арэхавым кусце. Толік сцішыўся за тоўстым дрэвам: дай, думае, пагляджу, што за грыбнік ідзе.*

*Ты, мусіць, не ведаеш, што і акацыя перад дажджом выдзяляе шмат нектару? Гэта лёгка заўважыць. Калі над кветкамі акацыі многа ўсялякіх мошак, тады чакай дажджу.*

**6.** Прачытайце народныя выказванні. Гэта прыказкі ці народныя прыметы? Патлумачце іх значэнне.

**Што пасееш, тое і пажнеш.**

**Што летам народзіцца, тое зімой спатрэбіцца.**



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ТЛУМАЧАЛЬНЫ СЛОЎНІК

**Абібóк** — гультай, лежабок, лайдак.

**Аблавýхі** — з абвіслымі вушамі.

**Абхóдзіны, абхóд** — пэўны ўчастак лесу, які даглядаецца, абходзіцца адным лесніком.

**Акóрка** — працэс ачысткі бервяна ад кары.

**Бастóн** — від ваўнянай тканіны.

**Без патóлі** — без супынку, не стамляючыся.

**Бліскаві́ца** — маланка.

**Брýствер** — земляны насып па краі акопа для прыкрыцця байцоў ад варожага агню.

**Брыль** — казырок шапкі ці капялюш з палямі.

**Вéжа** — высокае і вузкае архітэктурнае збудаванне.

**Вéрнік** — той, хто верыць у існаванне Бога, рэлігійны чалавек.

**Гамáшы** — мужчынскія чаравікі, туфлі.

**Глей** — адклады на дне вадаёмаў, у склад якіх уваходзяць найдрабнейшыя часцінкі мінеральных і арганічных рэчываў.

**Гмах** — вялікі і высокі будынак.

**Гóйсаць** — мітусліва хадзіць, бегаць, раз’язджаць у розных напрамках (звычайна з пэўнай мэтай).

**Груд** — невялікая горка, узгорак.

**Гугóлле** — пустазелле.

**Далікáтны** — складаны па выкананні.

**Дасці́пнасць** — кемлівасць, знаходлівасць.

**Дзірвáн** — верхні слой глебы, густа зарослы травой; пласт, выразаны з гэтага слоя.

**Жалязня́к** — рыдлёўка, лапата.

**Залатáр** — той, хто рабіў вырабы з золата.

**Запавéтны** — які асабліва цэніцца, старанна аберагаецца.

**Застрэ́мліваць** — увагнаць стрэмку — вострую, тонкую трэску, востры асколак шкла, металу, які залез пад скуру.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Зо́лак** — пачатак світання.

**І́рад** — мучыцель, кат.

**Кабе́та** — замужняя жанчына.

**Каверко́т** — від тканіны.

**Каламу́ціць** — муціць.

**Канцла́гер** — канцэнтрацыйны лагер: месца ізаляцыі зняволеных і ваеннапалонных.

**Ка́рак** — задняя (у жывёл — верхняя) частка шыі, якая пераходзіць у спіну.

**Ка́рны** — які мае сваёй мэтай караць каго-небудзь, прызначаны для пакарання.

**Карце́ць** — хацецца, не цярпецца.

**Кары́сныя вы́капні** — розныя руды, вугаль, нафта, солі, якія здабываюцца з зямлі.

**Крамя́ны** — свежы, пругкі, ядраны.

**Крэ́мень** — надта цвёрды камень, з якога раней высякалі агонь.

**Крэ́сіва** — кавалак сталі для высякання агню з крэменю.

**Ку́жаль** — валокны ачэсанага лёну, а таксама ніткі з іх.

**Ла́ва** — 1) расплаўленая маса, якая вывяргаецца вулканам на паверхню зямлі; 2) вялікі абшар, аднастайны масіў чаго-небудзь.

**Мані́сты** — упрыгожанне з пацерак, манет, каштоўных камянёў, якое надзяваецца на шыю.

**Меланхо́лія** — сумны настрой, маркота.

**Му́лкі** — цвёрды, нязручны, які націрае скуру, робіць балюча.

**Нагаві́цы** — штаны.

**Нара́да** — пасяджэнне для сумеснага абмеркавання чаго-небудзь.

**Нацянькі́** — напрасткі, самай кароткай дарогай.

**Не дбаць** — не звяртаць увагі.

**Няўця́м** — незразумела; не прыйшло ў галаву.

**Падо́рваць** — узворваць дадаткова.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Пажóўклы** — які зрабіўся жоўтым, набыў жоўтае адценне, звычайна ад часу, пры звяданні.

**Папáр** — поле, пакінутае на адно лета незасеяным, каб палепшыць глебу пад пасеў азімых.

**Пахóдня** — *даўней*: пераносная свяцільня ў выглядзе наматанага на канец палкі прасмоленага пакулля.

**Пляц** — прызначаная для забудовы тэрыторыя ў горадзе ці вёсцы.

**Прáшчур** — далёкі продак, родапачынальнік.

**Рамéснае вучы́лішча** — навучальная ўстанова, якая рыхтавала кадры кваліфікаваных рабочых (у 1940—1958 гадах).

**Рамéснік** — чалавек, які займаецца, валодае прафесійным рамяством.

**Свідраві́на** — глыбокая і вузкая адтуліна ў глебе ці ў горнай пародзе, зробленая буравым інструментам.

**Сівавaрóнка** — пералётная птушка з яркім зеленавата-блакітным апярэннем; сіваграк.

**Скéміць** — здагадацца.

**Скі́бка, скі́ба** — луста хлеба.

**Скляпéнне** — дугападобнае перакрыццё, якое злучае сцены, апоры пэўнага памяшкання; падвальнае памяшканне.

**Смылéць** — 1) балець, пячы; 2) мучыць, непакоіць.

**Стаáк (стаáн)** — вертыкальны брус, слуп і падобнае ў якім-небудзь збудаванні, прыстасаванні, што служыць для апоры або злучэння чаго-небудзь.

**«Студэбéкер»** — грузавы аўтамабіль амерыканскай вытворчасці.

**Супóльны** — сумесны, агульны.

**Суравáя** — грубая, нябеленая (пра тканіну).

**Сцепану́цца** — *разм.* раптам здрыгануцца, уздрыгнуць, скалануцца.

**Сці́рта** — вялікі стог сена, саломы, снапоў збожжа, прызначаны для захавання пад адкрытым небам.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Тлум** — шум, гоман, сумятня; шумлівы натоўп людзей.

**Увачаві́дкі** — хутка, на вачах.

**Уця́міць** — зразумець, усвядоміць.

**Філо́лаг** — спецыяліст у галіне філалогіі — сукупнасці навук, якія вывучаюць літаратуру і мову.

**Хапатлі́васць** — паспешлівасць.

**Цу́рка** — кароткі кавалак дрэва.

**Чапяла́** — спецыяльна загнутая на канцы лапатачка з ручкай для захоплівання гарачай скаварады.

**Шматвёрстка** — геаграфічная карта пэўнага маштабу.

**Штанда́ра** — укапаная ў зямлю вялікая дубовая калода, на якую кладуцца ніжнія бярвёны драўлянага збудавання.

**Шыбава́ць** — *разм.* хутка, жвава, імкліва рухацца, ісці.

# СЛОЎНІК ЛІТАРАТУРАЗНАЎЧЫХ ТЭРМІНАЎ

**Апавяда́нне** — невялікі твор, у якім расказваецца зазвычай пра нейкі адзін значны выпадак (сітуацыю, падзею) з жыцця чалавека. У апавяданні адна сюжэтная лінія, абмежаваная колькасць дзеючых асоб, апісанні адсутнічаюць ці яны вельмі сціслыя.

**А́ўтар** — пісьменнік, стваральнік арыгінальнага твора: верша, паэмы, апавядання і г. д. У шырокім сэнсе аўтар — стваральнік пэўных духоўных каштоўнасцей у галіне мастацтва, навукі, тэхнікі.

**Верш** — невялікі па аб'ёме, завершаны па думцы і форме твор, напісаны вершаванай мовай. У вершы знаходзяць адлюстраванне з'явы і падзеі рознага характару (драматычныя, трагічныя, камічныя і г. д.), выяўляюцца адносіны аўтара да гэтых падзей.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Гімн** — урачыстая песня ў гонар якога-небудзь героя, выбітнай падзеі або дзяржавы. Для гімна характэрны ўзвышанасць і эмацыянальнасць стылю, урачыстасць лексікі, наяўнасць шматлікіх паўтораў і г. д.

**Дзіця́чая літарату́ра** — сукупнасць літаратурных твораў розных відаў і жанраў, разлічаных на ўспрыманне дзецьмі малодшага, сярэдняга і старэйшага ўзросту.

**Загало́вак** — назва твора ці яго часткі.

**Ідэ́я** — асноўная думка, увасобленая ў літаратурным творы.

**Інтана́цыя** — выдзяленне, падкрэсліванне голасам пэўных думак, пачуццяў, увасобленых у літаратурным творы. Інтанацыя складаецца з мелодыкі (павышэнне і паніжэнне тону маўлення), тэмпу (хуткасць) і часткова тэмбру (галасавая афарбоўка) маўлення.

**Ка́зка** — займальны па сюжэце фальклорны ці літаратурны твор пра неймаверныя ці фантастычныя прыгоды. **Казкі народныя** паводле свайго зместу дзеляцца на *героіка-фантастычныя, сацыяльна-бытавыя* і *казкі пра жывёл*. Пісьменнікі нярэдка апрацоўваюць народныя казкі або на ўзор народных пішуць свае **літаратурныя казкі**. Паэты часам вершаванай мовай перадаюць вядомыя казачныя сюжэты або ствараюць свае **вершаваныя казкі**.

**Леге́нда, пада́нне** — невялікае фальклорнае або літаратурнае апавяданне, у аснове якога ляжыць аповед пра нейкую незвычайную падзею або гераічны ўчынак выдатнага чалавека. У аснове падання — рэальныя падзеі ці ўчынкі, легенда — пра выдуманыя фантастычныя падзеі або ўчынкі.

**Літарату́ра** — адзін з відаў мастацтва: слоўна-вобразная мастацкая творчасць.

**Міф** — сказанне ці паданне пра асобыя адухоўленыя аб’екты і з’явы прыроды (дрэва, кветку, возера і г. д.), а таксама пра багоў, герояў, фантастычных істот (русалак, лесавікоў і г. д.).

**Параўна́нне** — супастаўленне аднаго прадмета, з’явы, паняцця з падобнымі іншымі.

**Паэ́зія** — адзін з асноўных тыпаў мастацтва слова; эмацыянальна-вобразная вершаваная творчасць.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Паэ́т** — стваральнік паэзіі, пісьменнік, які піша вершы.

**Пе́сня** — вершаваны твор, пераважна лірычнага характару, меладычны па сваім інтанацыйным малюнку і прызначаны для спявання. Вылучаюць два віды песні — народную і аўтарскую (прафесійную).

**Пісьме́ннік** — аўтар мастацкіх твораў, прафесійны літаратар.

**Про́за** — адзін з двух асноўных тыпаў (побач з паэзіяй) слоўна-мастацкай творчасці, заснаваны на празаічнай мове, што ў адрозненне ад вершаванай не мае закончанай сістэмы рытмічных паўтораў.

**Пры́казкі і пры́маўкі** — трапныя ўстойлівыя народныя выслоўі павучальнага характару, што ўвасабляюць мудрасць і шматвяковы вопыт людзей у той ці іншай галіне гаспадарчай або духоўнай дзейнасці.

**Псеўдані́м** — несапраўднае, выдуманае прозвішча, якім аўтар падпісвае літаратурны твор.

**Твор літарату́рны** — завершаны па форме празаічны ці вершаваны тэкст, які адпавядае існуючым у пэўным часе і асяроддзі законам мастацкасці.

**Тэ́ма** — кола адлюстраваных у творы жыццёвых з’яў разам з узнятымі пры гэтым праблемамі.

**Фалькло́р** — вуснапаэтычная народная творчасць.

**Эпі́тэт** — паэтычнае азначэнне, якое дае вобразную характарыстыку прадмета, з’явы.

**Этнагра́фія** — навука, якая вывучае матэрыяльную і духоўную культуру народа.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. *Багдановіч, М.* Поўны збор твораў: у 3 т. / М. Багдановіч. — Мінск: Навука і тэхніка, 1992. — Т. 1: Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. — 752 с.
2. *Баханькоў, А. Я.* Тлумачальны слоўнік беларускай мовы / А. Я. Баханькоў, І. М. Гайдукевіч, П. П. Шуба. — Мінск: Нар. асвета, 1990. — 396 с.
3. Беларуская літаратура: пазакласнае чытанне / уклад. Л. І. Строк. — Мінск: ЮниПрессМаркет, 2013. — 384 с.
4. Вяснянка: вершы, апавяданні, казкі беларус. пісьменнікаў. — Мінск: Юнацтва, 1983. — 655 с.
5. Гульня-конкурс па беларускай мове і літаратуры «Буслік — 2011»: заданні, адказы, пазнавальныя артыкулы для вучняў 5—11-х класаў / уклад. Т. М. Лапіцкая. — Мінск: Беларус. асац. «Конкурс», 2011. — 96 с.: іл.
6. Зборнік дыктантаў: вучэб. дапам. для студэнтаў фак. педагогікі і методыкі пач. навучання, педагогікі і псіхалогіі (дашк.), дэфекталогіі пед. ін-таў / Я. М. Адамовіч [і інш.]. — Мінск: Выш. шк., 1988. — 271 с.
7. Зборнік экзаменацыйных матэрыялаў за курс базавай спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы для дзяцей з цяжкімі парушэннямі мовы (з беларус. мовай навучання) / аўт.-склад. Т. А. Капцюг [і інш.]. — Мінск: НМЦэнтр, 1999. — 120 с.: іл.
8. *Змушко, А. М.* Беларуская мова і чытанне: вучэб. дапам. для 9-га кл. 1-га аддз-ня дапам. шк. з рус. мовай навучання / А. М. Змушко. — Мінск: Нар. асвета, 2006. — 207 с.: іл.
9. Зярнятка: вершы, апавяданні, казкі, загадкі, прыпеўкі, калыханкі, гульні, прымаўкі, прыказкі, хуткагаворкі / уклад. З. І. Кустава, В. А. Салаўёва; маст. Л. У. Пашчасцева. — Мінск: Маст. літ., 2014. — 190 с.
10. *Колас, Я.* На ростанях / Я. Колас. — Мінск: Маст. літ., 1986. — 448 с.: іл.




Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

11. *Купала, Я.* Вершы / Я. Купала; уклад. А. А. Сляпцова. — Мінск: Маст. літ., 1988. — 270 с.: іл.
12. Літаратурнае чытанне: падруч. для 4-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з рус. мовай навучання / уклад. А. Н. Клышка. — 2-е выд, выпр. і дап. — Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2012.
13. *Рагойша, В. П.* Літаратуразнаўчы слоўнік: тэрміны і паняцці: для школьнікаў і абітурыентаў / В. П. Рагойша. — Мінск: Нар. асвета, 2009. — 303 с.
14. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы: больш за 65 000 слоў / пад рэд. М. Р. Судніка, М. Н. Крыўко; афарм. А. М. Хількевіча. — 2-е выд. — Мінск: БелЭн, 1999. — 784 с.
15. *Ягоўдзік, У. І.* Сем цудаў Беларусі: для мал. і сярэд. шк. узросту / У. І. Ягоўдзік; маст. П. Татарнікаў. — Мінск: Кавалер Паблішэрс, 1999. — 32 с.: іл.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ЗМЕСТ

**МАЯ РОДНАЯ БЕЛАРУСЬ** ........ 3
Ля карты Радзімы *(Паводле Казіміра Камейшы)* ........ 3
Слаўная рачулка *(Паводле Якуба Коласа)* ........ 5
Зямля з блакітнымі вачамі *(Эдзі Агняцвет)* ........ 7
«Чорнае золата» Беларусі *(Паводле Эрнста Ляўкова)* ........ 8
Як запалка нарадзілася *(Паводле Тамары Цулукідзэ)* ........ 10
«Белая Русь ты мая!..» *(Паводле Уладзіміра Скарынкіна)* ........ 12
**Пытанні і заданні да раздзела** ........ 13
**ХТО ПРАЦУЕ, ТОЙ РАДЗІМУ МАЦУЕ** ........ 15
Усё для ўсіх *(Юліян Тувім)* ........ 15
Васька Жукаў *(Паводле Янкі Маўра)* ........ 16
Першы заработак *(Уладзімір Дубоўка)* ........ 19
Настаўнік *(Паводле Якуба Ермаловіча)* ........ 24
Размова аб прафесіях *(Паводле Анатоля Астрэйкі)* ........ 25
**Пытанні і заданні да раздзела** ........ 28
**СЛУХАЙ РОДНУЮ ПРЫРОДУ** ........ 29
Канец лета *(Паводле Пятра Глебкі)* ........ 29
«Вось і лета сышло...» *(Паводле Петруся Броўкі)* ........ 31
Апошняя восень *(Паводле Сяргея Шаўцова)* ........ 32
Ліпка *(Паводле Алеся Пальчэўскага)* ........ 34
Уладар пушчы *(Паводле Язэпа Зазекі)* ........ 36
Лістапад *(Паводле Станіслава Шушкевіча)* ........ 39
Снежань *(Віктар Сабалеўскі)* ........ 40
Першы снег *(Юлій Ванаг)* ........ 41
Зіма *(Паводле Рыгора Барадуліна)* ........ 42
Ручай і ялінка *(Вера Вярба)* ........ 43
Галоўны дворнік *(Эдзі Агняцвет)* ........ 44
**Пытанні і заданні да раздзела** ........ 45
**ПОДЗВІГ НАРОДА БЕССМЯРОТНЫ** ........ 47
А хіба ёсць, што забываюць? *(Пятрусь Броўка)* ........ 47
Стары млын *(Паводле Аляксея Кулакоўскага)* ........ 48



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Голас вечнага хлопчыка *(Пятрусь Макаль)* ................ 52
Буслы *(Аляксей Дудараў)* ................................ 53
Мяшок белага наліву *(Паводле Івана Навуменкі)* ....... 55
Плошча Перамогі *(Анатоль Астрэйка)* .................. 57
**Пытанні і заданні да раздзела** ........................ 58
**СЛАЎСЯ ДОБРЫМІ СПРАВАМІ** .............................. 59
Хлеб *(Паводле Барыса Сачанкі)* ........................ 59
Елачкі *(Кастусь Кірэенка)* ............................ 61
Ты хоць дрэва пасадзіў?.. *(Пятрусь Броўка)* ........... 62
Ягады *(Паводле Нічыпара Парукава)* ..................... 63
Мама *(Міхась Даніленка)* ............................... 65
Упарты Стась *(Алесь Бачыла)* ........................... 66
**Пытанні і заданні да раздзела** ........................ 67
**СЛАВУТЫЯ ІМЁНЫ ЗЯМЛІ БЕЛАРУСКАЙ** ....................... 68
Беларусь *(Пятрусь Броўка)* ............................. 68
Тры яркія зоркі *(Паводле Васіля Віткі)* ................ 69
На доўгія вякі *(Паводле Міхася Лынькова)* .............. 70
«На шырокім, на далёкім...» *(Янка Купала)* ............. 71
Мароз *(Паводле Янкі Купалы)* ........................... 72
У грыбах *(Паводле Сцяпана Александровіча)* ............. 73
Мой родны кут... *(Паводле Уладзіміра Ліпскага)* ........ 75
Сваімі рукамі *(Паводле Якуба Коласа)* .................. 76
*Шчаслівы грыбнік *(Паводле Якуба Коласа)* .............. 78
Слуцкія ткачыхі *(Максім Багдановіч)* ................... 81
На чужыне *(Максім Багдановіч)* ......................... 82
Уступ да аповесці «Альпійская балада» *(Паводле Васіля Быкава)* ................................... 82
Не крадзі *(Паводле Івана Шамякіна)* .................... 85
Матчыны рукі *(Паводле Івана Шамякіна)* ................. 86
Князёўна з трыма імёнамі *(Паводле Кастуся Тарасава)* ... 87
Усяслаў Чарадзей *(Паводле Уладзіміра Бутрамеева)* ...... 90
Крыж-святыня *(Паводле Уладзіміра Ягоўдзіка)* ........... 92
Збіральнік скарбаў *(Паводле Міколы Маляўкі)* ........... 94
**Пытанні і заданні да раздзела** ........................ 95



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**ЧАРОЎНАЯ КРАІНА КАЗАК** ........................................ 97
Буслы *(Клаўдзія Каліна)* ........................................ 98
Усмешка *(Паводле Галіны Васілеўскай)* .......................... 100
Журавель і Чапля *(Паводле Цёткі)* ................................ 102
Як грыбы збіраліся на парад *(Паводле Клаўдзіі Каліны)* 103
Мурашык *(Паводле Яраслава Пархуты)* ............................ 105
**Пытанні і заданні да раздзела** ........................................ 108
**ПРЫХОДЗІЦЬ ЛЕТА ЗВОНКАЕ** ........................................ 109
*Летняя ноч *(Аляксей Пысін)* ........................................ 109
Буслы *(Паводле Віталя Вольскага)* ................................ 110
Вёрткія язі *(Паводле Рыгора Ігнаценкі)* ............................ 112
Рыбак *(Пятро Глебка)* ........................................ 113
Воблачка *(Паводле Лідзіі Арабей)* ................................ 114
Сонечны дождж *(Янка Сіпакоў)* ................................ 116
Дружба *(Паводле Кастуся Кірэенкі)* ................................ 117
Незвычайны грыбнік *(Рыгор Ігнаценка)* ............................ 118
Журавы над Жыцькавам *(Паводле Янкі Сіпакова)* ..... 120
Летнія заняткі *(Алена Котава)* ................................ 121
Мая гаспадарка *(Паводле Алены Васілевіч)* ........................ 122
Сцяжынка *(Генадзь Кляўко)* ........................................ 125
Жывы барометр *(Паводле Алеся Пальчэўскага)* ......... 126
**Пытанні і заданні да раздзела** ........................................ 128
**ТЛУМАЧАЛЬНЫ СЛОЎНІК** ........................................ 129
**СЛОЎНІК ЛІТАРАТУРАЗНАЎЧЫХ ТЭРМІНАЎ** ............ 132
**СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ** ................................ 135



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

(Назва і нумар школы)

| Навучальны год | Імя і прозвішча навучэнца | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака навучэнцу за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |


Вучэбнае выданне

**Змушко** Антаніна Міхайлаўна

**ЛІТАРАТУРНАЕ ЧЫТАННЕ**

**Вучэбны дапаможнік для 9 класа першага аддзялення дапаможнай школы з рускай мовай навучання**

Рэдактары *Н. Б. Кучмель, І. В. Летуновіч*
Дызайн вокладкі *Л. І. Мелава*
Мастак *Л. А. Мурашка*
Тэхнічнае рэдагаванне і камп’ютарная вёрстка *А. У. Смалюк*
Карэктары *В. Р. Ермаковіч, В. М. Іваноў*

Падпісана да друку 11.07.2018. Фармат 70×90 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная № 1. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 10,24+0,29 форз. Ул.-выд. арк. 7,20+0,25 форз.
Тыраж 1367 экз. Заказ 156.

Выдавец і паліграфічнае выкананне: рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/159 ад 27.01.2014, № 2/63 ад 19.03.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Шчодрым дамашнім богам
ляжыць на стале маім бохан —
па зярнятку з вякоў назапашаны,
у дзяжы ліхалеццяў заквашаны,
замяшаны на мудрасці, поце
і апалены духам
на подзе
жыцця!
Як ніколі я сёння жадзён яму,
гэтаму хлебу надзённаму!
Лусту кладу на настольніцы,
крою дзецям:
ешце па поўніцы!
Калі выпадзе з рук – абдзьмухніце,
не кідайцеся ім, не тапчыце!
Наядайцеся змалку ўволю,
каб ён вечна вам пах
родным полем,
баравінай, зялёнай лагчынай
і рукамі матулі,
Айчынай!

*(Мікола Арочка)*